Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 35 (4530) 18 верасня 2009 г.

У нумары:

Помнае падарожжа ў Беларусь

Уражанні замежных пісьменнікаў — гасцей Свята беларускага пісьменства.

Стар. 3

Айчынная букварыстыка — паняцце рэальнае

Па буквары Анатоля Клышкі дзеці вучацца ўжо 40 гадоў.

Стар. 4

Шляхі і сцежкі

Агляд жнівеньскіх нумароў часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Нёман» і «Бярозка».

Стар. 6

Цымбалаў срэбныя гукі…

Асацыяцыя беларускіх цымбалістаў годна прадстаўляе Беларусь паўсюль.

Стар. 11

Іван Франко — па-беларуску

Водгук Дмытро Паўлычкі на кнігу ўкраінскага класіка ў перакладзе Вячаслава Рагойшы.

Стар. 13

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 7760 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 10060 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі:
1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

17 верасня ў Мінску ўрачыста адкрыліся гастролі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Першы спектакль віцебскіх артыстаў — "Васа" паводле п'есы М. Горкага ў пастаноўцы Рыда Таліпава, з непаўторнай Святланай Акружной у галоўнай ролі — быў паказаны ўчора на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага.

Каласавіны па-віцебску

Вядомы і паважаны ў міжнародным тэатральным свеце рэжысёр Рыд Таліпаў, не так даўно прызначаны мастацкім кіраўніком коласаўцаў, перакананы: "Што б там ні казалі пра сябе рэжысёры, аснова тэатра — драматургія. З'явіўся Чэхаў — з'явіўся МХАТ. З'явіўся Астроўскі — з'явіўся ў Маскве Малы тэатр". Сапраўды так, і аналагічных прыкладаў у гісторыі сусветнай культуры шмат: Шэкспір, Мальер, Брэхт... Таму, разважаючы пра перспектывы тэатра імя Якуба Коласа, яго новы кіраўнік падкрэслівае: "Я хачу культываваць у тэатры перадусім добрую драматургію. Добрая драматургія — тая, аўтар якой ведае, пра што ён піша і дзеля чаго ён піша. На жаль, мы ведаем п'есы, напісаныя на беларускай мове, якія не маюць дачынення да менталітэту беларускага народа, да беларускага характару, ды і да жыцця наогул... Я ставіў спектаклі ў розных краінах, на многіх мовах. Маючы справу з чужой для сябе гаворкай, спачатку вельмі хваляваўся за вынік працы, ды ўрэшце зразумеў: рэжысёр можа ставіць п'есу і на незнаёмай мове, важна ведаць, пра што ты ставіш і з якой мэтай. Тады і глядач успрыме спектакль. І я, дарэчы, быў сведкам вялікага поспеху, з якім беларускамоўны тэатр выступаў у Нью-Йорку, Лондане, Парыжы.... Так што асновай будучага коласаўскага тэатра, паўтару, мне бачыцца добрая драматургія, у якой ёсць жыццё жывога разумнага чалавека, у якога ёсць пачуцці, які — у пошуку".

Распавядаючы пра рэпертуарныя планы, Рыд Сяргеевіч называе праверaныя часам і сцэнай творы: "Кабала святош" М. Булгакава — паставіць п'есу запрошаны з Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Валерый Анісенка; папулярная "Простая гісторыя" М. Ладо — будучая пастаноўка віцебскага рэжысёра Юрыя Лізянгевіча; "На кожнага мудраца хапае прастаты" А. Астроўскага — п'еса, над увасабленнем якой працуе сам кіраўнік трупы; ажывуць на віцебскай сцэне і класічныя беларускія вадэвілі пад назваю "Мікітаў лапаць"...

Спецыфікатворчага жыцця Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа ў тым, што ён — адзіны такі калектыў на ўвесь вялікі горад. А гэта абавязвае выконваць функцыі і ТЮГа, і маладзёжнага тэатра, звяртацца да сусветнай драматургіі, працаваць у розных сцэнічных стылях і заставацца лабараторыяй унікальнага, нацыянальна адметнага рэпертуару.

"А яшчэ ў нас абавязкова павінна з'явіцца і свая п'еса пра Якуба Коласа: такая выбітная асоба, такі яскравы лёс! — сцвярджае Рыд Таліпаў і прачыняе сакрэт: — У тэатральным партфелі, праўда, ужо ёсць адна п'еса пра класіка беларускай літаратуры. Але мы з цікавасцю сочым, як захоплена працуе над творам пра Якуба Коласа наш яркі, таленавіты малады драматург Дзіяна Балыка". Загадчык літаратурнай часткі тэатра Святлана Дашкевіч дадае: "Абавязкова наведаемся ў Літаратурны музей Якуба Коласа, яго дырэктар Зінаіда Камароўская падабрала спецыяльна для будучай п'есы надзвычай цікавыя і малавядомыя матэрыялы. У нас выдатныя творчыя сувязі, і, дарэчы, брат Зінаіды Камароўскай Валянцін Салаўёў — знакаміты коласаўскі акцёр!".

Доўгі час візітоўкай гэтага калектыву быў спектакль "Сымон-музыка". Сцэнічнае ўвасабленне набывалі таксама іншыя творы народнага песняра. "Але ў нас абавязкова павінна з'явіцца і свая п'еса пра Якуба Коласа: такая выбітная асоба, такі яскравы лёс!" — сцвярджае мастацкі кіраўнік тэатра Рыд Таліпаў.

Тэатральныя Каласавіны працягнуцца ў Мінску да 26 верасня і пазнаёмяць публіку з пяццю спектаклямі (чатыры з іх — нядаўнія прэм'еры) паводле твораў беларускіх аўтараў. Гэта музычная камедыя "Ветрагоны" паводле нэпаўскай п'есы класіка беларускага тэатра Уладзіслава Галубка; споведзь "Крыж Еўфрасінні" паводле Ірыны Маслянiцынай; вандроўка ў прастору невядомага "Прывітанне, Альберт!", прыдуманая Юрыем Сохарам з нагоды юбілею вялікага Эйнштэйна; сола для дзіцячага голасу "Апошнія сведкі" — інсцэніроўка пранізлівай прозы Святланы Алексіевіч, прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкага ярма; эраты (ліры)чная камедыя "Псіха-аналітык для псіха-аналітыка" Дзіяны Балыкі. Гэтыя творы, як і класіка нашых суседзяў — расіян ды ўкраінцаў — "Васа" Максіма Горкага, "За двума зайцамі" Міхайлы Старыцкага, як і музычная казка Сяргея Казлова "Нельга нам без сябра", даюць мажлівасць сапраўдным тэатралам убачыць даволі шырокі спектр сённяшняй беларускай рэжысуры: у гастрольнай афішы прадстаўлены спектаклі, пастаўленыя Віталем Баркоўскім, Міхасём Краснабаевым, Юрыем Куліком, Уладзімірам Савіцкім, Рыдам Таліпавым. І, канечне ж, гэта рэдкасная магчымасць атрымаць задавальненне ад ігры самабытных артыстаў Святланы Акружной, Тадэвуша Кокштыса, Таццяны Ліхачовай, Валянціны Петрачковай, Раісы Грыбовіч, Яўгена Бераснева, Настассі Куржалавай, Генадзя Гайдука, Юрася Цвіркі, Галіны Букацінай, Наталлі Саламахі, Святланы Жукоўскай... Да таго ж, нашы госці плануюць наладзіць шэраг творчых сустрэч са сваімі даўнімі прыхільнікамі, са шчырымі сябрамі коласаўскага тэатра, якіх нямала ў Мінску.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымку: коласаўцы Міхась Краснабаеў, Яўген Бераснеў, дырэктар калектыву заслужаны артыст Беларусі Рыгор Шацько, Раіса Грыбовіч, мастацкі кіраўнік тэатра, лаўрэат міжнародных тэатральных фестываляў Рыд Таліпаў — на плошчы імя Якуба Коласа.

Фота Кастуся Дробава

Пункцірам

● У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў рамках Дзён еўрапейскай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь адбыўся "круглы стол" "Беларусь самабытная. Традыцыі. Мова. Рамёствы". Ён сабраў разам прадстаўнікоў Міністэрства культуры нашай краіны, Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, Нацыянальнай акадэміі навук, Беларускага фонду культуры і іншых арганізацый, якія займаюцца пытаннямі гісторыка-культурнай спадчыны краіны. У акцыі прынялі ўдзел 49 краін, якія далучыліся да Еўрапейскай культурнай канвенцыі. Яе мэта — спрыянне ўзаемапаразуменню паміж народамі Еўропы, жаданню людзей вывучаць мовы, гісторыю і культуру еўрапейскіх краін.

● Дні культуры Кітайскай Народнай Рэспублікі распачаліся ў Мінску. Пачатак ім паклала выстава сучаснага кітайскага жывапісу ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі. Запланавана яшчэ выступленне Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Кітая ў Беларусі Лу Гуйчэна з дакладам у Інстытуце філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук. У Доме дружбы адкрыецца фотавыстава, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння КНР. У Белдзяржфілармоніі адбудзецца выступленне Сімфанічнага аркестра кітайскага радыё і кіно. А ў мінскай гімназіі №23 пройдзе вечар кітайскай паэзіі.

● З 17 па 27 верасня ў Мінску праходзіць Манхэтэнскі фестываль кароткаметражнага кіно. Прагляды адбудуцца ў аўтакінатэатры "ЗАТ "Гандлёвы свет — "Кальцо". Увазе наведвальнікаў будзе прадстаўлена дзесяць фільмаў. Гэта карціны "Мяжа" рэжысёра Джуліаса Она, "Дзіця кахання" Даніэля Віртберга, "Мазамбік" Алсідэса Суарэса, "Жаданне" Ісабэля Дэ Акампо і іншыя. Манхэтэнскі фестываль кароткаметражнага кіно аб'ядноўвае гледачоў на пяці кантынентах для прагляду конкурснай праграмы і выбару лепшага фільма. Асаблівасць фестывалю ў тым, што гран-пры вызначае толькі глядач.

● Выйшаў аўдыёдыск "Азбука для маленькіх". Чытанне вершаў, прысвечаных кожнай літары алфавіта, на дыску чаргуецца са спевамі. Спяваюць дзіцячыя вакальныя ансамблі "Цімпан" і "Званочкі". Паэзія В. Віткі, В. Шніпа, А. Бадака, С. Сокалава-Воюша, У. Мазго, У. Мацвеенкі, Н. Гілевіча, А. Вольскага гучыць галасамі В. Ерахаўца, Ю. Жыгамонта, І. Пятрова, М. Жуковіча. На выпадак, калі ў вас няма магчымасці паслухаць дыск разам з малым, прадугледжана друкаваная чытанка. У ёй змешчаны тыя самыя вершы, што гучаць на дыску.

● Адну з вуліц Гдыні (Польшча) назвалі ў гонар беларускага пісьменніка Янкі Брыля. У верасні 1939 года ён у шэрагах польскай арміі бараніў горад ад нападу войскаў нацысцкай Германіі. З падобнай ініцыятывай яшчэ чатыры гады таму выступіла культурна-асветніцкае таварыства "Хатка" з Гданьска. Калі раней жыхары Гдыні ведалі Янку Брыля за яго літаратурныя творы, то цяпер пра яго даведаліся і як пра абаронцу горада.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Саюз пісьменнікаў Беларусі наведаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір МАКЕЙ.

Агледзеўшы Мемарыяльную залу пісьменнікаў Беларусі, дзе прадстаўлены фотаздымкі ўсіх беларускіх літаратараў-удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і актавую залу, дзе размешчана новаствораная галерэя асветнікаў, народных пісьменнікаў і паэтаў Беларусі, ён пазнаёміўся з умовамі работы цэнтральнага апарата СПБ і яго гарадскога аддзялення. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь правёў працяглую гутарку з сакратарыятам і членамі прэзідыума творчага саюза. Былі абмеркаваны шматлікія пытанні жыццядзейнасці СПБ, развіцця літаратурнага працэсу ў краіне, аплаты пісьменніцкай працы і выплаты аўтарскага ганарару, выдання кніг і іх распаўсюджвання, падпіскі на перыядычныя літаратурна-мастацкія выданні, пашырэння запатрабаванасці грамадствам беларускай мовы і пісьменніцкага слова. Пісьменнікі шырока і шчыра падзяліліся сваімі меркаваннямі па ўсіх узнятых пытаннях і праблемах.

Уладзімір Макей праявіў вялікую цікавасць да развіцця дзіцячай літаратуры і літаратурнай крытыкі, работы пісьменнікаў у самых розных аўдыторыях краіны, клопатаў пра юныя таленты. Яго праінфармавалі аб дзейнасці абласных аддзяленняў СПБ і ўмовах іх працы.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта краіны выказаў шэраг цікавых парад і прапаноў. І падкрэсліў, што такія сустрэчы неабходна зрабіць рэгулярнымі, абмяркоўваючы на іх важныя пытанні, паэтапна затым вырашаючы іх агульнымі намаганнямі.

Адзначыўшы высокую грамадзянскую значнасць пісьменніцкай справы, ён заклікаў узвышаць аўтарытэт пісьменніка ў грамадстве, актыўна працаваць з чытачамі і асабліва з дзецьмі і моладдзю.

Павел КУЗЬМІЧ

Садружнасць

Ад малюнкаў Габустана — вытокі

У Баку завяршыла сваю работу І-я Міжнародная кніжная выстаўка

Калі за плячыма — істотны адрэзак прадстаўлення айчыннай кнігі чытачам, гледачам, калегам з іншых краін свету, то, сам таго не заўважаючы, да чыіхсьці першых крокаў ставішся з некаторым пацвельваннем: маўляў, вы ж яшчэ толькі на самым пачатку... Ды, пільна ўглядаючыся ў стэнды азербайджанскіх і іншых выдаўцоў, пацвельванне, ды некаторыя сумненні адносна выдаткаў першых крокаў сыходзілі на нішто. Кажучы простай мовай: "Выстаўка атрымалася!.."

Дарэчы, так заўсёды добры плён і падсумоўвае міністр культуры і турызму Азербайджанскай Рэспублікі спадар Керымаў: "У нас атрымалася!.." І, відаць, кожны з удзельнікаў беларускай дэлегацыі падсумуе ўражанні пасля наведвання бакінскай выставы самымі добрымі ўражаннямі. А дэлегацыю прадстаўлялі спецыялісты дасведчаныя: дырэктар выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі Таццяна Бялова, кансультант упраўлення выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю Міністэрства інфармацыі краіны Валерый Рагалевіч, дырэктар выдавецтва "Народная асвета" Ларыса Мінько, кіраўнік аднаго з буйнейшых паліграфічных прадпрыемстваў Беларусі — "Чырвоная зорка" Ігар Маланяк, намеснік генеральнага дырэктара Беларускага Дома друку Андрэй Шэвель.

...Па-першае, самым шырокім быў удзел азербайджанскіх выдавецтваў. І прыватны, і дзяржаўны сектар аднолькава настойліва імкнуліся прадставіць увесь спектр сваёй дзейнасці. Розныя па насычанасці стэнды паказвалі і ўзровень азербайджанскай паліграфіі. У большасці выпадкаў — дастаткова сур'ёзны і варты ўвагі. Па-другое, прадстаўнічай атрымалася прысутнасць замежнікаў — Расійская Федэрацыя, Латвія, Эстонія, Польшча, Таджыкістан, Кыргызстан, Узбекістан, Славакія, Пакістан, Іран, Польшча, Злучаныя Штаты Амерыкі, Турцыя, Беларусь... І што істотна, нягледзечы на адлегласць, якую давялося адольваць выдаўцам з нялёгкім грузам, стэнды сведчылі, што госці рыхтаваліся да сустрэчы з азербайджанскімі чытачамі і выдаўцамі.

І яшчэ адна сімпатычная акалічнасць: арганізатары выставы істотную ўвагу надалі стасункам непасрэдна з чытачамі, а значыць — і з пакупнікамі кнігі. Рабочай мовай выставы была ў асноўным азербайджанская. А галоўнымі ўдзельнікамі большасці дзействаў на выставе — азербайджанскія пісьменнікі.

— Мы рыхтаваліся да гэтай падзеі, — расказвае старшыня Саюза пісьменнікаў, народны пісьменнік Азербайджана Анар Расул аглы Рзаеў, якога болей ведаюць як празаіка, драматурга, сцэнарыста пад псеўданімам Анар. — І не толькі таму, што выстава першая. І раней былі спробы выйсці на шырокую прастору знаёмства з кнігай. Ладзіліся рознага роду болей вузкія ярмаркі. Міжнародная праводзіцца ўпершыню. Відавочна, даўно наспеў час прадстаўляць нацыянальныя здабыткі ў параўнанні з тым, што зроблена ў свеце. І гэта , як мне падаецца, найбольш цікава і для гасцей, і для гаспадароў. Да таго ж, не ўсе пісьменнікі маюць магчымасць аглядаць кніжныя багацці іншых краін. Таму, пэўна, на выставе ці не першымі гасцямі былі самі літаратары. Шкада, што з іншых краін прыехала зусім мала літаратараў... Дзякуй беларусам, што не абмінулі ўвагай наша запрашэнне. Мы і цяпер чытаем Васіля Быкава. А калі мне трапляюць на вочы кнігі Святланы Алексіевіч, то я ізноўку нагадваю сваім маладым калегам, што замест агульшчыны і псеўдафіласофскіх вышукаў пра смерць і эрас займіцеся літаратурай дакументальнай. Ці мала мы перажылі трагедый за мінулы час?! Запішыце іх сведкаў, удзельнікаў — і будуць кнігі ўзроўню "Блакаднай кнігі" Адамовіча і Граніна, узроўню знакамітага фаліянта беларускага болю "Я — з вогненнай вёскі...", створанага таксама па ініцыятыве Адамовіча...

Уразіла на выставе відавочная цяга азербайджанскіх выдаўцоў і паліграфістаў да арыенціру на вышыні паліграфічнага майстэрства. І гэта выяўляецца не толькі ў найболей практычным, функцыянальным прадстаўленні кнігі праз кідкую і якасную вокладку, добрыя малюнкі. Але яшчэ — і праз жаданне здзівіць чытача, пакупніка, імкненне зрабіць кнігу дарагім сувенірам, надаць выданню ўсемагчымыя аздобы. Як прыклад — падручнікі, дапаможнікі выдавецка-паліграфічнай фірмы "Тэнзіл". Буйнейшае прадпрыемства краіны ў гэтай галіне стала сапраўдным лідэрам, носьбітам навацый сусветнага характару і па шэрагу тэхналагічных навінак у афармленні кнігі ўжо апярэджвае беларускіх паліграфістаў. Хаця ж зусім нядаўна азербайджанцы ехалі па вопыт у Беларусь.

— Мы добра знаёмы з беларусамі, вашым вопытам, узроўнем вашых прадпрыемстваў, — падзяліўся са мною сваімі развагамі дырэктар выдавецкага дома "Letterpress" Джабір Асадаў. — І шмат чаму навучыліся менавіта ў вас. За гэта беларускім паліграфістам і выдаўцам вялікі дзякуй. У апошнія гады, дзякуючы дынамічнаму развіццю азербайджанскай эканомікі, наша паліграфія, нашы выдавецтвы актыўна развіваюцца. Мы аб'ядноўваем намаганні дапаліграфічнага і паліграфічнага цыклаў у межах аднаго прадпрыемства. Акрамя зразумелых эканамічных выгод, гэта яшчэ спрыяе і развіццю хуткасці ў выкананні паліграфічных замоў, што па сённяшнім часе, пагадзіцеся, рэч істотная.

Прыкметна вылучаліся ўдзелам у 1-й міжнароднай Бакінскай выставе бібліятэкары розных краін. Дарэчы, забягаючы наперад, падкрэслю, што па завяршэнні выставы кнігі са стэндаў замежныя экспаненты перадалі Нацыянальнай бібліятэцы Азербайджанскай Рэспублікі. Бібліятэкары з Турцыі, Татарстана, Кыргызстана, Эстоніі, Славакіі, Латвіі не толькі прапагандавалі свой вопыт, але і ўніклива імкнуліся спасцігнуць характар работы галоўнай кніжнай скарбніцы Баку і Азербайджана. А павучыцца ж сапраўды ёсць чаму. У нацыянальнай бібліятэцы — багатая калекцыя збораў усходняй літаратуры, усходніх рукапісаў. Яно і зразумела. Азербайджанцы смела зазіраюць у самую глыбокую мінуўшчыну, беручы адлік чалавека-мысляра ад петрогліфаў, пакінутых на каменнях Габустана. Так, недалёка ад Баку знаходзіцца унікальны музей, створаны прашчурамі цюркаў, азербайджанцаў. На скалах — малюнкі, якія з'яўляюцца ці не першай трансляцыяй чалавечага "Я" навакольнаму свету. Тут адлюстравана гісторыя чалавецтва на працягу амаль 15 тысяч гадоў — ад часоў канца верхняга палеаліта да старажытнага сярэднявечча. Да сённяшніх дзён выяўлена больш за 4000 петрогліфаў, як называюць наскальныя малюнкі, выразаныя ў тэхніцы разьбярства па камяні. Выявы жывёл, калектыўных танцаў, пэўных сімвалаў, лодак, чалавечых слядоў... Усё гэта — і пачатак таго, што пасля , праз стагоддзі, нават праз тысячагоддзі было акрэслена і вымаўлена пісьмом. Ёсць і каменні-бубны, якія яшчэ называюць "гавал даш", якія выяўляюць асаблівы тэмбр, варта толькі пагрукаць па іх паверхні. Чаму так падрабязна спыняюся на ўражаннях ад сустрэчы з Габустанам (мясціна гэтая знаходзіцца за якую гадзіну язды ад Баку, і не наведаць яе было б проста сорамна перад самім сабою)?.. Уся справа ў тым, што рухавіком культуры кнігавыдання, як мне падаецца, у нашых азербайджанскіх сяброў з'яўляецца асабліва пашанотнае стаўленне да гістарычных каранёў, далёкай, стагоддзямі і тысячагоддзямі напрацаванай спадчыны. А як жа іначай супрацьстаяць наступу агрэсіі і знішчальнаму, разбуральнаму для слова наступу новых тэхналогій?.. Вось і адмысловай кнігай-падарункам на Бакінскай выставе была схаваная ў камчыган кніга пра аднаго з легендарных музыкантаў Азербайджана. Знайшлося ў сэрцы таго струннага інструмента месца і сучаснаму дыску, і друкаванаму слову... Знайшлося месца гісторыі, сучаснасці і спадзяванням на доўгую будучыню азербайджанскай кнігі.

Кастусь ЛАДУЦЬКА
Баку—Мінск

На здымку: члены беларускай дэлегацыі — Т. Бялова, В. Рагалевіч, Л. Мінько — сярод гаспадароў выстаўкі.

Водгалас

Да Свята беларускага пісьменства ўсё больш далучаецца нашых сяброў з іншых краін. Так, за "круглым сталом" у Смаргоні "Мастацкая літаратура як сродак зносін народаў", як ужо паведамлялася ў "ЛіМе", сабраліся пісьменнікі з Польшчы, Казахстана, Таджыкістана, Сербіі, Чарнагорыі, Літвы, Расіі. Мы пацікавіліся іх уражаннямі ад наведвання Беларусі менавіта падчас Дня беларускага пісьменства.

Помнае падарожжа ў Беларусь

Любоў ШАШКОВА, паэтэса, публіцыст. Старшыня савета па рускай літаратуры Саюза пісьменнікаў Казахстана, загадчык аддзела культуры і крытыкі часопіса "Простор", аглядальнік газеты "Казахстанская правда":

—Тое, што 16 год такое свята існуе на Беларусі — гэта грандыёзна! Не сакрэт, што кожная краіна пасля набыцця незалежнасці па-іншаму стала адносіцца да сваёй культуры, мовы. Не будзем замоўчваць падабенства пазіцый з мовай у Казахстане і Беларусі: амаль 50 працэнтаў нашага насельніцтва — не тытульнай нацыі. Але ў Казахстане адна мова дзяржаўная — казахская. Руская выступае як сродак міжнацыянальных зносін.

Такі дзень — Дзень пісьменства — неабходны для народа нават таму, што шмат людзей далучана да размовы пра мову. Ды і проста чуць са сцэны высокамастацкія творы — гэта цудоўна! Столькі было прадстаўлена на свяце выдавецтваў! Казахстан намнога большы тэрытарыяльна, у нас 16 мільёнаў жыхароў — але выдавецтваў менш, чым у вас. У вас захоўваецца высокая якасць паліграфіі. У нас паліграфічны спад прыйшоўся на 90-я гады мінулага стагоддзя. Вы — захавалі сваю вытворчасць. Духоўная, праваслаўная кніга шырока прадстаўлена, а праваслаўны аспект вельмі важны ў нашай славянскай пісьменнасці. Добра, што свята праходзіць не ў сталіцы, а, гаворачы па-казахску, качуе, ідзе па розных гарадах. Акрамя пісьменства, згадваецца гісторыя, шукаюцца вытокі культуры і духоўнасці. Я член Беларускага культурнага цэнтра ў Казахстане. Уразілася: колькі вы робіце перакладаў, анталогій, шмат праектаў з Таджыкістанам, з Расіяй. Гэта вялікая праца!

— Але і ў вас цяпер рыхтуецца кніга, завязаная з Беларуссю...

— Так, Беларускі культурны цэнтр выйграў тэндэр у Міністэрстве культуры і друку на выданне кнігі да 65-годдзя Перамогі з умоўнай назвай "Казахі на абароне Беларусі". Кніга будзе выдавацца ў Алматы і раскажа пра казахаў, якія ўдзельнічалі ў абароне Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Матэрыял збіраецца, хочацца дадаць нешта новае, каб кніга была цікавая і моладзі.

Збігнеў ФРОНЧЭК, пісьменнік з Любліна, рэдактар часопіса "Люблін":

— У Польшчы няма такіх вялікіх імпрэз пад патранатам дзяржавы, як у Беларусі. Ёсць святы літаратараў у рэгіёнах. І кожны рэгіён жыве сваім літаратурным жыццём. У Любліне — знакамітыя традыцыі працы з моладдзю. У нас шмат вучэльняў. У іх апошнім часам вельмі добра развіваецца славістыка. І я шукаю партнёраў для развіцця літаратурнага працэсу. Сустракаўся і ў Мінску з пісьменнікамі. Ведаем беларускую літаратуру, вельмі падабаецца Ф. Багушэвіч, яго "Дудка беларуская". На свяце мы прысутнічалі на адкрыцці помніка Багушэвічу, наведалі яго сядзібу і сядзібу М. Кл. Агінскага. Ды пабывалі на канцэрце, у якім браў удзел прапрапраўнук М. Кл. Агінскага І. Залузскі. Дагэтуль знаходжуся пад уражаннем ад гэтага канцэрта.

Валерый МІХАЙЛАЎ, паэт, празаік, публіцыст з Казахстана, галоўны рэдактар літаратурна-мастацкага часопіса "Простор":

— Гэта сапраўднае свята літаратуры. І столькі прызоў і грамат уручана творцам — за працу ў розных жанрах. Адчувальна, што ў Беларусі клапоцяцца пра людзей мастацтва і літаратуры. Дзякуй Богу, што дзяржава пачынае разумець, што без культуры няма народа, што без літаратуры не існуе гісторыі. Чалавек увогуле жыве словам! Мы не істоты для выканання нейкіх вытворчых планаў — мы людзі! І самі ствараем сваю культуру.

На жаль, у нашай краіне падобнага свята няма. І добра, што можна прыехаць да сяброў і пабачыць, што ў іх адбываецца...

Што да "круглага стала", то я не адсочваў магчымасць нейкага практычнага прымянення ідэй, што там прагучалі. Лічу, самае галоўнае — гэта магчымасць такіх сустрэч, гаворак за "круглым сталом". У савецкія часы мы часцей сустракаліся, цяпер такой магчымасці амаль не засталося, кнігі найчасцей не выходзяць за межы гарадоў, дзе выдаюцца, асабліва выдадзеныя прыватным шляхам. А кніжны гандаль распаўсюджвае ў асноўным чціва — тое, што хутка прадаецца і прыносіць прыбытак. Але гэта не літаратура! І калі адбываецца дыялог культур і літаратур, то дзяржавы больш увагі звяртаюць на гэтыя складнікі нашага жыцця.

Наш часопіс друкуе творы пісьменнікаў іншых краін: Расіі, Украіны, Беларусі. Адзін з нумароў амаль напалову быў прысвечаны вашай краіне. Надрукавалі вершы М. Пазнякова, А. Бадака, творы С. Трахімёнка — усяго прадставілі каля дваццаці пісьменнікаў Беларусі. І гэтую справу мы прадоўжым. Дарэчы, прадстаўлялі і іншыя краіны, да прыкладу, Рэспубліку Комі, Малдову. Для нас самае важнае — паказаць, што адбываецца ў рускай літаратуры ўсяго свету.

Мы ўдзячныя, што часопіс "Нёман" надрукаваў вялікую падборку твораў нашых пісьменнікаў — гэта ўжо пачатак практычнага супрацоўніцтва. Думаю, такія падборкі мы можам рабіць сумесна. Наш часопіс "Простор" мае наклад 1,5 тысячы асобнікаў. Але мы выходзім у Інтэрнет, і гэта дае магчымасць чытачам усяго свету (яшчэ 6—7 тысяч чалавек) чытаць нашае выданне — амаль на ўсіх мацерыках. Да нашага гонару, тым, хто едзе ў далёкае замежжа, першае, што замаўляюць прывезці — гэта наш часопіс "Простор".

— За кошт чаго ж выжывае часопіс? Ёсць такая думка, што Інтэрнет перашкаджае павелічэнню тыражу...

— Часопіс падтрымліваецца дзяржавай. Ён належыць Саюзу пісьменнікаў Казахстана, ёсць яшчэ два часопісы на казахскай мове і газета. Раз на год Міністэрства культуры і друку праводзіць тэндэр на літаратурныя выданні. Наш часопіс удзельнічае ў гэтым і зазвычай выйграе. Так мы атрымліваем сродкі на друкаванне — грошы невялікія, зарплаты ў нас таксама невялікія, але часопіс выходзіць рэгулярна — раз на месяц, 200 старонак фармату "Нового мира". А газета штотыднёвая, яе тыраж — тысяч пятнаццаць. Большасць насельніцтва ўсё ж казахі, газета выдаецца на казахскай мове. Наша літаратура шматнацыянальная — казахская, руская, карэйская, была нават нямецкая.

Што да Інтэрнету, то ў нас шмат людзей, асабліва новае пакаленне, любяць чытаць з экрана. Адно аднаму Інтэрнет і папяровая версія не перашкаджаюць. Мы стараемся, каб часопіс даваў найбольш поўнае ўяўленне пра тое, што адбываецца ў рускай літаратуры. Друкуем шмат перакладаў...

— У "ЛіМе" таксама друкаваліся вашы вершы ў перакладзе на беларускую мову...

— Перадайце Наталлі Капе маю ўдзячнасць, прачытаў верш "Па забытым Богам прасёлку" — вельмі харошы пераклад. Досыць складаны верш, нягледзячы на ўяўную прастату. Дашлю ёй свае кнігі.

Невена Вітошавіч ЧЭКЛІЧ, сербская паэтэса. У Выдавецтве Беларускага Экзархата рыхтуецца да выдання яе кніга для дзяцей "Маленькі анёл — хрысціянскі буквар" (пераклад І.Чароты):

— Лічу, што гэта вельмі добра, што ў Беларусі арганізуецца "круглы стол" літаратараў і такое свята, як Дзень беларускага пісьменства. Асабліва важна — далучаць маладых людзей да кнігі, прыгожага слова, і сэнс свята — якраз у гэтым і заключаецца. Удзел непасрэдна ў "круглым стале" для мяне важны таму, што мы абмяняліся думкамі па важнейшых пытаннях. Для мяне гэта яшчэ і ўмацаванне ў свядомасці неабходнасці такіх стасункаў у галіне літаратуры.

— Што, па-вашаму, на сённяшні дзень павінна быць галоўным у творчасці літаратараў?

— Лічу самым галоўным — духоўнае самаўдасканаленне творцы, творчы рост і фарміраванне душы, асобы, якая значыць больш, чым непасрэдна твор. Літаратар павінен пастаянна вучыцца: ён адначасова і настаўнік, і сам вучань. Галоўная роля пісьменніка — служыць любові, быць святаром у храме любові — у шырокім, хрысціянскім сэнсе гэтага слова.

Прафесар Іван ЧАРОТА, пісьменнік, старшыня таварыства "Беларусь — Сербія", адзін з актыўных удзельнікаў "круглага стала":

— Заўважце: гэта не перакладчыцкі, а міжнародны "круглы стол" пісьменнікаў. Мы яго ад пачатку так задумвалі. І ідэя яго дакладная: пасля развалу Савецкага Саюза кантакты, што былі паміж літаратарамі, спыніліся. Раней мы мелі магчымасць выехаць у іншыя краіны, кніжкі не ляжалі на паліцах, выдаваліся пераклады. Трэба нейкім чынам стан пазнейшага развалу павярнуць. Дзякуй уладзе, непасрэдна нашаму Міністэрству інфармацыі, што ідэю такога "стала" прынялі і пачалі яе здзяйсняць. У працэсе здзяйснення былі свае пралікі і недахопы, першае — у тым, што паспрабавалі зрабіць форум перакладчыцкім.

А напрамак размовы я сфармуляваў бы так: ці адчуваем мы, літаратары, рэальна той стан трывогі свету? Як мы на яго адказваем, рэагуем? І адпаведна — што ўяўляюць сабою гэтыя выклікі часу: палітычныя, ідэалагічныя, агульнакультурныя. Глабалізацыя як выклік, з якім трэба неяк спраўляцца, — вось тэма! Што яна значыць для літаратуры?

Канечне, адно глядзець на глабалізацыю з Вашынгтона, другое — з Варшавы, трэцяе — з Вільні. Зусім іншае — з Мінска, Астаны альбо Ташкента. Але як мы ўсе, а не паасобку, успрымаем гэта, як бачым? Літаратура — сродак сувязі і адпаведна — рэакцыя на тое, што адбываецца. Нацыі абавязаны кантактаваць. І літаратура выступае як сродак гэтых кантактаў. Кантакт, лічу, атрымаўся.

Гутарыла Ірына ТУЛУПАВА

Фота Кастуся Дробава

З-пад пяра

У рамках святкавання Дня горада ў Нацыянальным мастацкім музеі краіны адбылося адкрыццё новай пастаяннай экспазіцыі "Мастакі Беларусі XIX — першай паловы XX стагоддзя", якая знаёміць з творчасцю майстроў выяўленчага мастацтва, якія нарадзіліся ў Беларусі. Прафесійную адукацыю яны атрымлівалі ў асноўным у Пецярбургу і Маскве, іх творчасць развівалася пераважна ў галіне рускага мастацтва XIX — пачатку XX стагоддзя. Жыццё і дзейнасць некаторых з іх звязаны з Літвой і Польшчай, таму іх спадчына з'яўляецца агульнай для культур Беларусі, Расіі, Літвы і Польшчы.

У першай зале экспазіцыі прадстаўлены творы мастакоў XIX стагоддзя — Іосіфа Аляшкевіча, Івана Хруцкага, Андрэя Хруцкага, Сяргея Заранкі, Апалінарыя Гараўскага, Іпаліта Гараўскага, Фелікса Хадаровіча, Фёдара Ясноўскага. Другая і трэцяя залы прысвечаны творчасці знакамітых мастакоў-пейзажыстаў пачатку XX стагоддзя — Станіслава Жукоўскага, Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Фердынанда Рушчыца.

В. К.

У галерэі "Лабірынт" Нацыянальнай бібліятэкі краіны адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі-прэзентацыі "Лепшыя кнігі Беларусі-2009" — па выніках Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі-2009»".

У экспазіцыі выстаўкі-прэзентацыі прадстаўленыя лаўрэаты конкурсу: выданні, якія атрымалі ганаровыя дыпломы пераможцаў і памятныя знакі-сімвалы "Залаты фаліянт", а таксама кнігі-дыпламанты I, II і III ступені. Каля 100 выданняў размеркаваныя па наступных раздзелах: "Тэматычныя намінацыі", "Спецыяльныя намінацыі", "Персанальныя намінацыі". Усе кнігі пазначаны спецыяльнымі інфармацыйнымі этыкеткамі, на якіх змешчаны звесткі пра выдавецтвы.

В. К.

На цэнтральнай плошчы Карэліч адбылося выступленне міжнароднага маладзёжнага духавога аркестра "Версалінка-2009". Усіх прыемна ўразіў канцэрт калектыву, у склад якога ўваходзяць маладыя музыкі з Беларусі, Польшчы, Эстоніі. Дарэчы, у іх ліку ёсць восем выхаванцаў дзіцячых школ мастацтваў Карэліччыны, а наш зямляк Іосіф Улан з'яўляецца дырыжорам "Версалінкі".

Прадстаўленне пачалося маршам "Беласток" і адмысловым танцам дзяўчат-мажарэтак. Над райцэнтрам узнёсла гучалі мелодыі, створаныя кампазітарамі названых краін у розны час.

Алесь ЖАЛКОЎСКІ

У санаторыі "Чонкі" адбылася сустрэча адпачываючых, аматараў мастацкай літаратуры, з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Б. Кавалерчыкам. На ёй прысутнічалі і жыхары суседняй Расіі.

Пісьменнік выказаў свае погляды на стан сучаснай літаратуры, творчы працэс, азнаёміў прысутных з гумарыстычнымі мініяцюрамі і афарызмамі са сваёй кнігі "Гульня думак", адказаў на іх пытанні.

Выступленне Б. Кавалерчыка неаднаразова перапынялася вясёлым смехам, а смех жа лечыць людзей. Ды хіба не маглі выклікаць усмешку словы, што "прыгажосць — грозная зброя жанчын, але якую яны выкарыстоўваюць толькі ў мірных мэтах", ці тое, што "з залатой жонкай можна дажыць і да брыльянтавага вяселля"...

Нельга не пагадзіцца з пісьменнікам, што калі прыгажосць выратоўвае свет, дык гумар робіць яго дабрэйшым.

Людміла ЛАГУН

Айчынная букварыстыка — паняцце рэальнае

Некалькі гадоў таму адзін беларускі кінарэжысёр падчас працы над фільмам пра Тадэвуша Касцюшку выправіўся ў Швейцарыю. І прывёз адтуль цікавы факт з біяграфіі нашага земляка. Пасля смерці кіраўніка паўстання 1794 года новы ўласнік яго каня быў здзіўлены, калі прыехаў у горад: конь спыняўся каля кожнага жабрака. Гаспадар не ведаў, што Касцюшка, выязджаючы ў горад, заўсёды браў з сабою мяшэчак грошай і адорваў кожнага няшчаснага. Рэжысёр думаў, што прывёз на радзіму героя невядомы тут факт. Ды не. Пра гэта яшчэ сем гадоў таму ў сваім польскім буквары напісаў Анатоль Клышка.

Наша размова — са складальнікам буквара, па якім вучацца беларускія дзеці ўжо сорак гадоў.

*— Анатоль Канстанцінавіч, рыхтуючыся да нашай размовы, я праглядзеў некаторыя новыя выданні па методыцы навучання грамаце. І маю ўвагу прыцягнула выдадзеная сёлета адным маскоўскім выдавецтвам кніга Валерыя Марусяка "Учим ребёнка читать. Как? Когда? Зачем?" Там разглядаюцца азбукі Льва Талстога, кубікі М.А. Зайцава... А таксама ваш буквар. І асобна аўтар разбірае вашу методыку нароўні з методыкамі М. А. Зайцава і Глена Домана. Аўтар кнігі між іншым адзначае, што "буквар Анатоля Канстанцінавіча Клышкі ў метадычным плане дзіўны і унікальны. Магу сцвярджаць гэта з поўнай адказнасцю, паколькі нічога падобнага я не знайшоў у больш чым трохтысячнай калекцыі Юрыса Цыбулса (рыжскага калекцыянера — **С. М.**). Ёсць буквары, якія пераўзыходзяць буквар Клышкі ў афармленчых адносінах, але ніводзін не параўнаецца з яго метадычнай прапрацоўкай". І сёння ваша праца застаецца высока ацэненай нават за межамі Беларусі.*

— Так, і гэта вельмі прыемна. Майму беларускаму буквару пяты ўжо дзесятак пайшоў, каля дзесятка гадоў рускаму і польскаму букварам. Але я ўсё ў метадычным пошуку, каб даць магчымасць навучацца грамаце дзецям самага малодшага ўзросту. А пачалося з таго, што я навучыў цэласна, не паскладова чытаць сваю праўнучку ў тры з паловай гады.

— А ці не зарана гэта?

— Прывяду вам цытату расійскіх педагогаў Л. Кабзаровай і Т. Кузьміной. "Паводле ацэнак псіхолагаў на паспяховасць уплываюць больш як 200 фактараў, але існуе фактар нумар адзін — авалоданне навыкамі чытання. Нельга быць шчаслівым, не ўмеючы чытаць". І чаму б дзіцяці яшчэ задоўга да школы не пачаць вучыцца чытаць? Бо амаль для кожнай маці яе дзіця — талент. Асабліва, калі яму два гады.

— І што тут параілі б бацькам?

— Развіццё дзіцяці можна прыспешыць, гэтаксама як і затрымаць. Хачу, каб бацькі ўсвядомілі: упушчаныя магчымасці малога ўзросту (асабліва да сямі гадоў) могуць назаўсёды застацца нерэалізаванымі. Няпраўда, што адно дзіця здольнае ад нараджэння, а другое — не. І чаму б двух-, трох- ці чатырохгадовай малечы не паказаць, скажам, літару, надрукаваўшы яе на паперы вялікім шрыфтам. Абвесці дзіцячым пальчыкам гэтую літару (псіхалогія сцвярджае: рука вучыць вока глядзець). І не вучыце адразу алфавітным назвам літар, а найперш гукам, якія яны абазначаюць. Не *бэ, вэ, гэ*, а *б, в, г*... Так будзе дзіцяці лягчэйшым пераход да чытання. І памятайце: увага дзіцяці яшчэ малая, не ўстойлівая. У два гады — дзве хвіліны, у тры — тры, у чатыры — чатыры. Праз гадзіну-другую вы зноў зможаце вярнуцца да вывучэння. І так некалькі разоў на дзень. Вашае дзіця лёгка, неўпрыкметку (год — гэта ж 365 дзён) вывучыць усе літары. А гэта трэць працы для таго, каб яно пачало чытаць.

— Вы ўжо адзначылі, што вашаму беларускаму буквару пайшоў пяты дзесятак гадоў. А як вы непасрэдна ўзяліся за працу над яго складаннем у 1960-х?

— Я бацька траіх дзяцей. І, як заўсёды, падрастаюць дзеці, міжволі робішся настаўнікам, вучыш сваіх дзяцей чытаць, лічыць. А я да паступлення ў БДУ вучыўся ў Навагрудскім педвучылішчы, дзе грунтоўна выкладалася методыка навучання грамаце. Так што тэарэтычна быў падрыхтаваны. А тагачасны "Буквар" Надзеі Сіўко засмучаў мяне сваёй беднаю моваю, штучнымі тэкстамі.

Я тады працаваў у вельмі дружнай, шчаслівай палымянскай сям'і. Максім Танк, наш галоўны рэдактар, аднойчы вярнуўся з Генеральнай Асамблеі ААН і пры размове згадаў, што дзяржаўным народам прызнаецца народ, які мае свой герб, гімн, сцяг, буквар, энцыклапедыю... Мяне ўразіла, што такое высокае значэнне прыдаецца першаму школьнаму падручніку. А тут якраз у 1969 годзе Міністэрства асветы БССР абвясціла конкурс на новы буквар. І я аддана ўзяўся за працу.

— Вось так проста ўзялі і склалі буквар?

— Вядома ж, не. Перад пачаткам працы праглядзеў больш як 250 буквароў рознага часу на рускай, украінскай, польскай, нямецкай мовах, якія былі ў Дзяржаўнай бібліятэцы. Былі, канечне, чыста букварныя цяжкасці. Скажам, пройдзена некалькі літар, паспрабуй прыдумаць пэўны тэкст ды яшчэ з выхаваўчым ухілам. І каб словы былі не даўжэйшыя, чым двухскладовыя, і з адкрытымі складамі. Памятаю: у мяне чатыры зычныя літары (м, н, ш, х) і дзве галосныя (а, ы) і я б'юся над тэкстам. І вось нешта выходзіць: "Мама, мама! Наша Маша на шашы. На шашы машыны... Ах. Ах!" Я ўсцешаны, і ўяўляецца малюнак да гэтага — хлопчык, устрывожаны за сваю сястрычку, бяжыць да мамы.

Буквар — першае свядомае далучэнне дзіцяці да роднай мовы. І мне хацелася, каб яно палюбіла родную мову. Каб буквар быў займальнай кніжкай для чытання, каб у ім былі вартасныя тэксты, якія маглі б вытрымаць шматразовае чытанне іх на ўроках.

— А іншыя буквары не адпавядалі гэтым мэтам?

— Усе тагачасныя буквары ў адрозненне ад дзіцячых часопісаў былі зашпілены ў аднастайны адукацыйны шынель. А мне хацелася, каб у гэтым першым падручніку знайшлося месца гумару, жарту, казцы, загадцы, лічылцы, прыказцы, прымаўцы, народнай прыкмеце, рэбусу. Каб там былі гульні з гукамі, літарамі, словамі, тэкстамі. Каб дзіця адчула, як словы часам пераасэнсоўваюцца, як ад адных нараджаюцца другія. "Даўней людзі пісалі гусіным пяром. Ад яго і назва — пяро, хоць цяпер яно сталёвае. Нашы прадзеды пісалі яшчэ і алавянаю палачкай. Здагадайцеся, адкуль пайшла назва алоўка?"

— Я і цяпер памятаю гэты тэкст. З таго часу і ведаю, чаму аловак называецца алоўкам.

— Прыемна чуць. Дзеля гэтага і пісалася.

Дык мне хацелася, каб дзіця, услухоўваючыся ў родныя словы, хоць раз задумалася над аднакаранёвасцю слоў. *"Вунь у мох зашыліся махавікі. А там пень абляпілі апенькі"*. Або каб вучань проста адчуў алітэрацыю — паўтор зычных гукаў. *"Нарач. Вечар. Хутка ноч. Шапоча чарот. То крыкне сыч, то заплача сава"* — гэта на літару ч. Я імкнуўся, каб тут былі тэксты самыя розныя — лірычныя, апавядальныя, апісальныя, навукова-папулярныя. Пра нашу Беларусь, пра Мінск, пра Янку Купалу, пра Якуба Коласа, пра прыроду. І хай будзе шмат вершаваных радкоў, бо вершаванае слова, западаючы ў памяць, можа больш чым што вучыць мове, спрыяць яе засваенню.

Мне хацелася, каб дзіця, услухоўваючыся ў родныя словы, хоць раз задумалася над аднакаранёвасцю слоў. "Вунь у мох зашыліся махавікі. А там пень абляпілі апенькі". Або каб вучань проста адчуў алітэрацыю — паўтор зычных гукаў. *"Нарач. Вечар. Хутка ноч. Шапоча чарот. То крыкне сыч, то заплача сава"* — гэта на літару ч. Я імкнуўся, каб тут былі тэксты самыя розныя — лірычныя, апавядальныя, апісальныя, навукова-папулярныя. Пра нашу Беларусь, пра Мінск, пра Янку Купалу, пра Якуба Коласа, пра прыроду. І хай будзе шмат вершаваных радкоў, бо вершаванае слова, западаючы ў памяць, можа больш чым што вучыць мове, спрыяць яе засваенню.

— Дык мне хацелася, каб у гэтым першым падручніку знайшлося месца гумару, жарту, казцы, загадцы, лічылцы, прыказцы, прымаўцы, народнай прыкмеце, рэбусу. Каб там былі гульні з гукамі, літарамі, словамі, тэкстамі. Каб дзіця адчула, як словы часам пераасэнсоўваюцца, як ад адных нараджаюцца другія. "Даўней людзі пісалі гусіным пяром. Ад яго і назва — пяро, хоць цяпер яно сталёвае. Нашы прадзеды пісалі яшчэ і алавянаю палачкай. Здагадайцеся, адкуль пайшла назва алоўка?"

— Я і цяпер памятаю гэты тэкст. З таго часу і ведаю, чаму аловак называецца алоўкам.

— Прыемна чуць. Дзеля гэтага і пісалася.

Дык мне хацелася, каб дзіця, услухоўваючыся ў родныя словы, хоць раз задумалася над аднакаранёвасцю слоў. *"Вунь у мох зашыліся махавікі. А там пень абляпілі апенькі"*. Або каб вучань проста адчуў алітэрацыю — паўтор зычных гукаў. *"Нарач. Вечар. Хутка ноч. Шапоча чарот. То крыкне сыч, то заплача сава"* — гэта на літару ч. Я імкнуўся, каб тут былі тэксты самыя розныя — лірычныя, апавядальныя, апісальныя, навукова-папулярныя. Пра нашу Беларусь, пра Мінск, пра Янку Купалу, пра Якуба Коласа, пра прыроду. І хай будзе шмат вершаваных радкоў, бо вершаванае слова, западаючы ў памяць, можа больш чым што вучыць мове, спрыяць яе засваенню.

— А каму першаму далі прачытаць гатовы буквар?

— Першым маім "першакласнікам", які прачытаў увесь мой рукапісны буквар, быў Сяргей Дзяргай, выдатны паэт, добры знаўца роднай мовы. Я ўлічыў усе яго парады і заўвагі. І ледзь паспеў укласціся ў тэрмін і адправіць рукапіс на конкурс. А ў выніку мой рукапісны буквар перамог.

— Але ж да вашага буквара існавала даўняя традыцыя букварыстыкі ў нашай краіне.

— Безумоўна. Францыска Скарыну можна лічыць букварыстам таксама, бо ў прадмове да Псалтыра пісаў: "калі хочаш умець грамату, якая добра чытаць і гаварыць вучыць, — чытай Псалтыр". У пачатку раздзелаў пры вялікіх каляровых літарах першадрукар змяшчаў прадметы, назвы якіх пачыналіся з таго ж гука, што гэтая літара абазначае.

А векапомная дата 24 ліпеня 1618 года, калі ў Іўі ў друкарні святадухаўскага брацтва выйшаў "Буквар языка словенска". І слова буквар, падтрыманае пасля нашым славутым выдаўцом Спірыдонам Собалем, пайшло ў шырокі свет — у Расію, Украіну, Балгарыю і іншыя славянскія краіны. Слова "лемантар", калі каму невядома, паходзіць ад лацінскага "элементарыус" (пачатковы), якое ў сваю чаргу паходзіць ад назваў літар LMN, з якіх даўней пачыналі вучыць чытаць.

А калі ўзгадаць, што з 1590 па 1653 у Беларусі было выдадзена 16 пачатковых падручнікаў — больш за палову ўсіх выданняў на ўсходне-славянскіх землях — то як не ганарыцца нашай вялікай мінуўшчынай.

Як не ўспомніць тут Сімяона Полацкага, вялікага грамадскага і царкоўнага дзеяча, асветніка і педагога, які ў Маскве вучыў царскіх дзяцей. Яго "Буквар" 1679 года, можна смела сказаць, быў зроблены і для Пятра I, якому тады было сем гадоў.

А пасля страта краінай незалежнасці, заняпад. Яркай з'явай стаўся "Беларускі лемантар" Цёткі, выдадзены ў Пецярбургу ў 1906 годзе.

— Дарэчы, хто ўсё ж, на вашу думку, аўтар гэтага лемантара? Цяпер звычайна яго аўтарам называюць Каруся Каганца.

— Мне думаецца, што ўсё-такі Цётка. Звернемся да тых, хто ведаў тагачаснае віленскае асяроддзе. Якуб Колас у адным з лістоў якраз называе аўтаркай Цётку. Такога меркавання прытрымлівалася і Паўліна Мядзёлка, нават адзначала, чыя методыка была пакладзена ў яго аснову — Кандрата Прушынскага. Так што яе дасведчанасці можна цалкам давяраць.

— Кандрат Прушынскі таксама адзначыўся сваім букваром, калі не памыляюся.

— Так. Яго буквар вытрымаў 49 выданняў. А ў 1875 годзе на конкурсе ў Лондане быў прызнаны найлепшым сярод 500 буквароў свету. Між іншым, у 1911 годзе працай над складаннем каляровага беларускага буквара займаўся Максім Багдановіч. Але лёс гэтага рукапіса невядомы.

— Анатоль Канстанцінавіч, а над чым вы цяпер працуеце?

— Заканчваю пераклад з грэчаскай мовы поўнага Евангелля. Падрыхтаваў зборнік загадак "1000 арэшкаў" — "Дзе гэта водзіцца? / Нарадзіўся ад маці, / якая ад яго народзіцца" (лёд і вада). А таксама зборнік "100 языкаломак" — "Далі Даню дома дыню". Мне не падабаюцца словы "скарагаворка", "хуткамоўка". Калі ёсць галаваломка, чаму не быць языкаломцы.

Гутарыў
Сяргей МАКАРЭВІЧ

Фота Кастуся Дробава

З надзеяй на перамогу

У гэтым годзе каардынатарам (па Мінску) фестывалю "Бардаўская восень-2009", які штогод праходзіць у польскім горадзе Бельску, будзе лідэр гурта "Босае сонца" Алесь Зайцаў. Фестываль, які сёлета будзе праводзіцца 16-ы раз, уяўляе сабою адметную культурную з'яву ў жыцці Беласточчыны. У ім удзельнічаюць не толькі беларускія барды, але і асобныя гурты, калектывы акустычных напрамкаў.

На пытанне карэспандэнта "ЛіМа" ці з'яўляецца фестываль "Бардаўская восень" выключна беларускамоўным, каардынатар праекта Алесь Зайцаў адказаў станоўча.

— Скажыце, Алесь, якім чынам чытачы, што даведаюцца пра фестываль, змогуць на яго трапіць?

— 27 верасня ў Мінску (в. Каліноўскага, 32, кавярня "Лісіная нара") пройдзе адборачны тур. Многія гады адборачны тур ладзіўся ў закрытым фармаце: прыязджалі з польскага боку прадстаўнікі журы і адбывалася праслухоўванне. У гэтым годзе намерваемся зрабіць адборачны тур у фармаце канцэрта, які змогуць наведаць усе жадаючыя.

— Магчыма, слухачы змогуць і прагаласаваць за любімых бардаў?

— На жаль, не. Мы прыйшлі да меркавання, што усё ж такі будзе больш правільным, калі адбіраць будуць толькі прафесіяналы. А то здараюцца сітуацыі, калі перамагае той, хто прывядзе больш сяброў.

— Дык якім чынам трапіць на адборачны тур?

— Што тычыцца канкурсантаў, якія зацікавіліся — зразумела, будуць асобныя абвесткі. І цяпер у Інтэрнеце можна знайсці паведамленні на пэўных сайтах. Будзе змешчана старонка на сайце "Тузін гітоў", дзе можна спампаваць анкету-заяўку для ўдзелу ў адборачным туры фестывалю. Пакуль што жадаючыя могуць пісаць на мой е-мэйл: wosien@tut.by і задаваць любыя пытанні.

— Ці ёсць у беларусаў шанц перамагчы? Хто быў у мінулыя гады пераможцам?

— У мінулым годзе быў юбілейны, пятнаццаты, фестываль, і конкурснай праграмы не праводзілася. А ў пазамінулым годзе перамагла Дар'я Кадамская з Мінска, некалькі гадоў таму пераможцам была Таццяна Беланогая.

— Сярэдні ўзрост удзельнікаў?

— Ёсць адзінае ўзроставае абмежаванне: удзельнікі павінны быць паўналетнімі, таму што гэта звязана з выездам за мяжу, а абмежаванняў у бок сталасці — няма.

— Хто будзе спансіраваць паездку нашых музыкаў у Польшчу?

— Арганізатары фестывалю цалкам забяспечваюць праезд, візавую падтрымку, пражыванне, харчаванне і ўсё, што неабходна канкурсантам, і забяспечваюць на даволі высокім узроўні. Для пераможцаў прадугледжаны каштоўныя прызы і ўзнагароды, то бок, канкурсанты ў гэтым выпадку не губляюць нічога — акрамя свайго часу і намаганняў. А набываюць вясёлы настрой, сувязі, знаёмствы.

Гутарыў
Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Кужаль, гарлачы і ваўкавыскія чаравічкі

Год працы: многа ці мала? Гэта як глядзець. Іван Маржала прызначаны на пасаду начальніка аддзела культуры Ваўкавыскага райвыканкама летась у лютым, але ў самой установе працуе 18 гадоў.

— Іван Фадзеевіч, у кожным раёне ёсць аб'ект культуры, якім ганарацца, паказваюць гасцям. Мяне вы прывялі ў Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П. І. Баграціёна, і самі слухалі расповед дырэктара музея Алы Суеты з цікавасцю, як упершыню.

— Сапраўды, у нашым горадзе ёсць дастаткова вядомыя прадпрыемствы — мясакамбінат, малаказавод, што выпускаюць высакаякасную прадукцыю, і часам гасцей вядуць туды, каб паказаць вытворчасць. Але "візітоўка" нашага горада — музей імя Пятра Баграціёна.

Музей гэты унікальны па значнасці сабраных у ім экспанатаў. Ёсць экспанаты, якімі мы ганарымся, напрыклад, першы музычны інструмент — свістулька, настолькі ранняга перыяду, што аналагічнай няма ні ў адным музеі краіны. Прасілі экспанат для музея музычных інструментаў, што ў Мінску, але як аддаць тое, што належыць жыхарам нашага раёна!..

У фонды музея, які быў адкрыты 1 студзеня 1940 года, увайшла прыватная калекцыя Георгія Пеха. Некаторыя экспанаты, напрыклад, фігуркі гусараў, уланаў, зробленыя ім з пластыліну, добра захаваліся да гэтага часу. Уражвае і карціна Г. Пеха "Ваўкавыская бітва 3—4 лістапада 1812". У мінулым годзе музей наведала каля 11 тысяч гасцей і жыхароў раёна, праведзена 221 экскурсія.

— Культура ў раёне — паняцце шматграннае, але вы, напэўна ж, выдзяляеце прыярытэты. На што акцэнтуеце ўвагу?

— Безумоўна, добрая работа любой установы можа быць толькі ў тым выпадку, калі вызначаны прыярытэтныя накірункі. У нас яны скіраваны на арганізацыю дзейнасці па выхаванні патрыятызму, заснаванага на глыбокім вывучэнні гісторыі свайго краю, традыцый народнай культуры; правядзенне выстаў, канцэртаў, тэматычных масавых мерапрыемстваў. Працуюць у раёне шмат гурткоў, аматарскіх аб'яднанняў, клубаў па інтарэсах, студый, творчых майстэрняў. Увогуле ў клубных установах раёна дзейнічае 270 фарміраванняў, якія аб'ядноўваюць каля 3000 чалавек. Радуе, што палова ўдзельнікаў — дзеці, наша будучыня.

— Як вучань любіць добрую адзнаку, так і вы, напэўна, ганарыцеся сваімі дасягненнямі, а чым канкрэтна?

— Самае жаданае дасягненне ў рабоце кожнага клубнага фарміравання — гэта атрыманне калектывам звання "народны". Яно прысвоена 15 калектывам раёна. Тэатр драмы і камедыі "Славуціч" носіць званне "заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь", "узорнымі" з'яўляюцца 8 калектываў.

Вынікі работы кожнай клубнай установы традыцыйна ацэньваюцца на аглядах і конкурсах. Пра нашы творчыя калектывы ведаюць не толькі ў Ваўкавыскім раёне. Ансамблі песні і танца — узорны "Ютшанка" і народны "Вяселле" — прадстаўлялі раён і краіну, фестывалі "Артыстычныя сустрэчы-2008", VIII Міжнародным фестывалі фальклору ў гарадах Польшчы. Актыўнымі ўдзельнікамі выстаў на святах раёна і вобласці былі калектывы раённага і гарадскога цэнтраў і Дома рамёстваў. Майстар-метадыст Ірына Пекар узнагароджана дыпломам за актыўны ўдзел у свяце-конкурсе вышыўкі "Чароўная нітка" на XVII Міжнародным фестывалі мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Дыпломамі і каштоўнымі падарункамі адзначаны на Усебеларускім фестывалі гумару "Аўцюкі-2008" удзельнікі ансамбля "Медуніца" Валянціна Агільба, Ліля Рашчэўская і Галіна Чарапок. А ўзорны ансамбль эстраднага танца "Ваўкавыскія непаседы" пад кіраўніцтвам Аляксандра Мельнікава заваяваў кубак рэспублікі на міжнародным фестывалі танца, які праходзіў пад назвай "Фестывальны рух краін СНГ і Балтыі" і другое месца ў першым Усебеларускім фестывалі па дзіцячым танцавальным шоу "Мега-данс" у Мінску. Здабыткі маем, бо людзі разумеюць, што акрамя тэлевізара і прысядзібнага ўчастка існуе магчымасць сустрэцца з землякамі на рэпетыцыі, дый проста папляскаць ад душы лепшым выступоўцам на канцэртах.

Пра нашы творчыя калектывы ведаюць не толькі ў Ваўкавыскім раёне. Ансамблі песні і танца — узорны "Ютшанка" і народны "Вяселле" — прадстаўлялі раён і краіну на фестывалі "Артыстычныя сустрэчы-2008", VIII Міжнародным фестывалі фальклору ў гарадах Польшчы. Актыўнымі ўдзельнікамі выстаў на святах раёна і вобласці былі калектывы раённага і гарадскога цэнтраў і Дома рамёстваў.

— Іван Фадзеевіч, сёння ж асяродак культуры на сяле — бібліятэка. З якіх крыніц і як фарміруюцца іхнія кніжныя фонды?

— Дакладна ведаю, што супрацоўнікамі бібліятэк раёна абслугоўваецца звыш 30 тысяч чытачоў. Агульны ж бібліятэчны фонд на канец мінулага года склаў 421 340 экземпляраў. Камплектуемся праз "Гроднакнігу", а таксама праз мясцовыя магазіны "Кнігарня" і "Школьнік". Дарэчы, у бібліятэках нямала кніг рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва". Задавальняе асартымент, іх мастацкае афармленне і тое, што з новымі творамі сучасных беларускіх пісьменнікаў знаёмімся ў першую чаргу праз публікацыі ў літаратурна-мастацкіх выданнях — часопісах "Нёман", "Полымя", "Маладосць", газеце "Літаратура і мастацтва". Дарэчы, гэтыя выданні выпісваюць практычна ўсе бібліятэкі. З задавальненнем чытаем і рэкамендуем чытачам беларускую літаратуру. Між іншым, справаводства ва ўстановах культуры раёна вядзецца на беларускай мове.

Шмат увагі надаём рабоце з дзецьмі. Думаю, невыпадкова, што 6 навучэнцаў школ мастацтваў раёна занесены ў Рэспубліканскі банк звестак *адоранай* моладзі і матэрыяльна заахвочаны Саветам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

— Я ў захапленні ад убачанага ў раённым цэнтры рамёстваў, што знаходзіцца ў Росі: задымлёныя гарлачы, кужаль, старадаўнія чаравічкі, касцюмы з так званымі "хвастамі", кросны. Напэўна, не так проста захаваць методыку работы па вырабе ўсяго гэтага?

— Цэнтры рамёстваў — раённы і гарадскі — наш гонар, бо шмат людзей цягнуцца да даўніны, хочуць на кроснах выткаць палавік, зляпіць гарлач, зрабіць з саломкі абярэг... Мы сябруем з нашымі старажыламі. Яны праводзяць майстар-класы для зацікаўленых і прымаюць удзел у раённых і абласных выставах. Мая мара — пры гарадскім цэнтры зрабіць добрую пасеку, пабудаваць сапраўдную кузню, пасадзіць сад, каб нашы дзеці маглі і валодаць кавальскай справай, і прышчэпку на дрэве зрабіць, і сабраць духмяны мёд.

— А вашы дзеці, Іван Фадзеевіч, таксама наведваюць гурткі?

— Двое сыноў Андрэй і Аляксей, 16 і 18 гадоў, іграюць на музычных інструментах, удзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці. Я імі ганаруся, але прафесійную сцяжыну хай выбіраюць самі. Жонка Святлана таксама працуе ў сферы культуры. Я вельмі люблю сям'ю, сваю работу і людзей, дзеля якіх працуюць усе ўстановы культуры раёна.

Гутарыла Валянціна СМАНЦАР

На здымку: І. Маржала

Фота аўтара

Падобнае прыцягваецца да падобнага. Паэтам і празаікам як асобам неардынарным, быццам паветра, неабходны людзі падобныя да іх сваёй прагай да літаратуры. Зыходзячы з гэтых патрэб, становіцца будзённай неабходнасцю стварэнне літаратурных суполак, студый, аб'яднанняў.

Наддзвінне

Адно са старэйшых літаратурных аб'яднанняў — "Наддзвінне", сваімі творчымі намаганнямі выдае і літаратурны альманах з такой жа назвай — своеасаблівую візітоўку калектыву літаратараў Полаччыны, аб'яднаных адной справай — мастацтвам ствараць у вершах і прозе творы, вартыя штодзённай увагі зацікаўленага чытача. І літаб'яднанне, і альманах маюць сваю багатую гісторыю. Першы літаратурны альманах "Наддзвінне" выйшаў у 1926-м годзе, з гэтага ж года бярэ пачатак і літаратурнае аб'яднанне. Праз літаратурную школу літаб'яднання "Наддзвінне" прайшлі многія паэты і празаікі, сярод якіх Пятрусь Броўка і Тарас Хадкевіч, Эдуард Самуйлёнак і Міхась Барэйша, Алесь Савіцкі і Іван Стадольнік, з маладзейшых — Навум Гальпяровіч, Надзея Салодкая, Лера Сом. Цяпер літаратурным аб'яднаннем кіруе паэт Мікалай БАЛДОЎСКІ.

На маё пытанне, як часта збіраюцца літаратары на свае "майстар-класы" і "літаратурныя студыі", дзе ўвогуле знаходзіцца асноўная штаб-кватэра літаб'яднання, Мікалай Якаўлевіч адказаў:

— Наша месца збораў — цэнтр рамёстваў. Збіраемся кожную сераду а пятай гадзіне, без усякіх папярэдніх абвестак. Гэта своеасаблівая школа падрыхтоўкі для літаратараў-пачаткоўцаў. Прыходзяць маладыя людзі, чытаюць вершы. Ім заўсёды аказваецца неабходная дапамога, ад рэдактуры да карэктуры. Вельмі шмат выдаём кніг, нядаўна выйшлі творы Віктара Яўменя і Галіны Загурскай.

— Дзе друкуеце свае кнігі вершаў ды прозы?

— Або ў Віцебскай друкарні, або цяпер у выдаўца Уладзіміра Судніка. Друкуемся ў перыядычных выданнях: выходзіць літаратурная старонка ў "Полоцком вестнике".

— Колькі актыўных членаў налічвае ваша літаб'яднанне?

— На сённяшні дзень гэта трыццаць два чалавекі. Да нас ходзяць літаратары Полацка, Наваполацка і Полацкага раёна.

— А вядомыя літаратары, хаця б вашы землякі, наведваюцца ў госці?

— Нядаўна гасцяваў Навум Гальпяровіч, сказаў, што "Наддзвінне" адыграла вялікую ролю ў яго творчым станаўленні. А яшчэ вельмі часта выступаем па школах, бібліятэках.

— Якіх паэтаў ці празаікаў, што прымаюць найбольш актыўны ўдзел у справах літаб'яднання, хацелі б адзначыць?

— У нас ёсць так званая ўдарная група, якая паўсюль выступае. У гэты баявы атрад уваходзяць: Уладзімір Куц, Зінаіда Лявонцьева, Ларыса Цітова, Галіна Загурская, Пятро Буганаў, Змітрок Куніцкі, Ларыса Міхновіч. Ну і я, таму што кірую аб'яднаннем. Мы не толькі чытаем вершы, часта праводзім літаратурна-музычныя кампазіцыі, спяваем свае песні.

— Цікава, які сярэдні ўзрост сяброў літаб'яднання?

— У нас прадстаўлены людзі рознага веку. Напрыклад, хутка будзем адзначаць 80-годдзе самага старэйшага члена — Змітрака Куніцкага, а самай маладой — Наталлі Маскалёвай — усяго дваццаць. Можна сказаць, у літаб'яднанні пануе сапраўднае раўнапраўе: палова жанчын і палова мужчын.

І ў тым, што менавіта так і ёсць, я пераканаўся, чытаючы чарговы (пяты), але зусім не шараговы літаратурны альманах "Наддзвінне", які выйшаў у гэтым годзе. Альманах складаюць творы дваццаці двух наддзвінскіх аўтараў, дванаццаці мужчын і дзесяці жанчын (амаль напалову), біяграфічныя звесткі разам з фотаздымкамі падаюцца ў канцы зборніка. Ужо знаёмым нам Мікалаем Балдоўскім напісана грунтоўная прадмова да выдання "Ад ладу душы, да ладу верша", у якой рэдактар і ўкладальнік знайшоў (ці не кожнаму!) з прадстаўленых аўтараў патрэбнае слова. Тэматычны і творчы дыяпазон альманаха даволі шырокі, тут і проза, і паэзія, і філасофская лірыка, і вершы грамадзянскага гучання, гумар і дзіцячыя творы, публіцыстычныя нататкі — радуе тое, што большасць аўтараў усё ж такі аддала перавагу роднаму слову. "Наша "Наддзвінне", — адзначае ў прадмове ўкладальнік, — школа для такіх аўтараў, прафесійны рост якіх, несумненна, бачны чытачам... Побач з літаратарамі-пачаткоўцамі, паэтамі і празаікамі, прадуктыўна працуюць сябры рэспубліканскіх саюзаў пісьменнікаў: Надзея Салодкая, Валерый Старынскі, Уладзімір Куц, Ірына Цярэшчанка ды іншыя. Для іх літаратурная творчасць — не толькі рамяство, але і лёс: у радках іх твораў заўсёды пульсуе само жыццё, прачутае і выпакутаванае. Тут, у "Наддзвінні", яны "становяцца на крыло" для свабоднага палёту ў таямнічым свеце літаратурнага космасу".

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Сам упрыгожу свой двор

15 год таму супрацоўнікі Клецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі выступілі ініцыятарамі правядзення свята вуліц горада. Пачалі з самых старажытных вуліц, якія помняць войны і пажары, разруху і станаўленне. Перш-наперш ішлі знаёміцца з іх жыхарамі. Падчас знаёмства людзі расказваюць пра падзеі, якія адбываліся тут на іх памяці, пра тое, што чулі ад сваіх бацькоў і дзядоў.

Звычайна свята пачынаецца гістарычным экскурсам у мінулае, які прафесійна праводзяць супрацоўнікі Клецкага музея гісторыі.

Жыхары кожнай вуліцы розныя па сваіх поглядах на жыццё, узростах, прафесіях. І пра кожнага з іх гучаць на свяце добрыя словы, ўручаюцца падарункі ад арганізацый і прадпрыемстваў горада, на якіх працавалі ці працуюць удзельнікі ўрачыстасці. Ушаноўваюцца ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, самы старэйшы жыхар вуліцы, самы маленькі, якому належыць будучыня, першыя пасяленцы вуліцы. Падчас падрыхтоўкі мерапрыемства выяўляюцца і мясцовыя таленты: хто спявае, хто іграе на музычных інструментах, а хто прыгожа дэкламуе вершы.

Напярэдадні свята аб'яўляецца конкурс "Свой двор упрыгожу сама". Па выніках конкурсу гаспадарам лепшых сядзіб уручаюцца каштоўныя падарункі. Ярка і цікава праходзіць таксама конкурс "Лепшая кветкавая кампазіцыя". Прыгожа афармленыя букеты і экзатычныя пакаёвыя кветкі вабяць вока і радуюць душу ўдзельнікаў і гасцей свята. Традыцыйна праводзіцца конкурс "Кулінарных спраў майстры".

Падобныя мерапрыемствы робяць добрую рэкламу дзейнасці бібліятэкараў — многія жыхары вуліц становяцца актыўнымі чытачамі і сапраўднымі сябрамі бібліятэкі.

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Шляхі і сцежкі

«Полымя»

Жнівеньскі нумар "Полымя" адкрываецца публікацыяй новага рамана Уладзіміра Гніламёдава "Валошкі на мяжы". Чытачы сустрэнуцца з ужо знаёмымі па творах "Уліс з Прускі" і "Расія" героямі — Лявонам Кужалем і іншымі прускаўцамі. На гэты раз дзеянне адбываецца ў 1930 годзе. Палітыка санацыі, нацыянальна-вызваленчы рух, рэпрэсіі польскага ўрада на Заходняй Беларусі — усе гэтыя падзеі паўстаюць фонам прыватнага жыцця жыхароў заходнепалескай вёскі.

Малая проза прадстаўленая ў нумары двума апавяданнямі А. Ждана. Першае з іх — "Кашалёк" — адгукаецца на надзённую праблему: падчас крызісу ўсе гавораць пра грошы і толькі пра грошы. А ў апавяданні гавораць самі грошы. Прычым розныя — расійскія, украінскія, польскія, амерыканскія і, вядома, беларускія. Казка паступова ператвараецца ў дэтэктыў з бандыцкімі разборкамі ў кшталце сучасных серыялаў... Другое апавяданне — цалкам іншага характару: разведзеная маладзіца мае лепшага сябра — хворага сабаку, але праз яго ў жанчыны праблемы на інтымным "фронце". Усе кандыдаты збягаюць пасля знаёмства з няўрымслівым сабакам. Урэшце, прыходзіць Сабачы бог у выглядзе мужчыны, які ацаляе хворага, але і сам нечакана знікае. Лірычнае апавяданне з займальным сюжэтам і псіхалагічнай "раскадроўкай".

Новая п'еса Г. Марчука — сатырычная меладрама "Майская прыгажуня" — вылучаецца нестандартным падыходам да паказу перыпетый жыцця савецкіх людзей падчас сталінскай дыктатуры. Супрацоўнікі спецслужбаў, ідэалагічна вытрыманыя святы і эстрадныя песні, хітравата-насцярожаныя чалавечыя паводзіны абыгрываюцца драматургам з камічнага пункта гледжання, у адрозненне ад пераважна трагічнага ўзнаўлення падзей таго часу ў найноўшай беларускай літаратуры.

Паэтычны аддзел "Полымя" распачынаецца падборкай вершаў А. Салтука. Аўтар падымае традыцыйную для сябе тэму "сена на асфальце" — настальгіі гараджаніна па вёсцы, роднай прыродзе, сялянскай працы. Вылучаецца з гэтага шэрага верш з грамадзянскім пафасам "Самоцяцца Купала, Броўка, Танк..", дзе паэт сярод іншага канстатуе: "Быў больш паэт нядаўна, чым паэт. / Сягоння ён не значыць анічога... Проста час бяздушнасці настаў, / Калі ніхто нікога ўжо не чуе".

Р. Малахоўскі ў сваёй нізцы вершаў, дэкларуючы, што "паэт на волю выпускае звера", падманвае чытачоў і дорыць сваім прыхільнікам чарговую порцыю "любоўнага" гладкапісу. Разам з тым, у творах Р. Малахоўскага праяўляецца настойлівае, але пакуль беспаспяховае, жаданне вылузнуцца са старой стылістыкі.

У лірыцы Я. Гарадніцкага, нягледзячы на пэўныя метрычныя і рытмічныя памылкі, можна знайсці адзнакі сапраўднага майстэрства і глыбокага пачуцця. Так, у вершы "З рук фарбы выпусціў Мікола Селяшчук", смерць мастака зрошчваецца з вобразам Крумкача Э. По. Найбольш удалыя творы падборкі — верлібры філасофскага кшталту. Тут жа друкуюцца вершы А. Мальчэўскай рэлігійнай тэматыкі і пункцірытрохрадкоўі Я. Гучка.

Упершыню публікуюцца прыватныя лісты пецярбургскага студэнта, паэта і патрыёта Беларусі Адама Гурыновіча да маці (пераклад з польскай мовы, уступ і каментарыі М. Запартыкі). В. Локун усебакова аналізуе прозу У. Дамашэвіча 1990-2000-х гадоў, выяўляе ў ёй і станоўчае, і заганы. У калектыўным артыкуле Т. Кабржыцкай, Ус. Рагойшы і Э. Дзюкавай "Дзе ж наша месца на старажытнай карце Еўропы?" разглядаюцца найноўшыя ўкраінскія даследаванні па гісторыі старажытнай славянскай культуры. У прыватнасці, уводзяцца малавядомыя факты з жыцця і дзейнасці легендарнага ісландскага місіянера Торвальда Кодрасана-Вандроўніка, які, згодна з паданнем, пахаваны ў Полацку. В. Гардзей прапаноўвае ўспаміны-эсэ пра Сцяпана Гаўрусёва і Міколу Федзюковіча. Я. Конеў і В. Алейнікава рэцэнзуюць кнігі К. Хадасевіч-Лісавой і Т. Красновай-Гусачэнкі.

З. Прыгодзіч дзеліцца ўражаннямі ад паездкі ў Японію, мімаходзь разважаючы і пра своеасаблівую гісторыю гэтай усходняй краіны. Нарыс В. Несцяровіча "Вёска пад Салаўінай гарой" знаёміць з гісторыяй і сучасным жыццём вёскі Гайна, што на Лагойшчыне.

«Маладосць»

Нячаста можна сустрэць паэзію, дзе пануе гармонія. Гэта ўласціва творчасці М. Латышкевіч, чые публікацыі я адсочваю каля двух гадоў. У яе вершах, якія адкрываюць жнівеньскую "Маладосць", няма самалюбавання, няма пагоні за модай — сцёбам і феерычнасцю. Таму класічнасць лірыкі маладой паэткі не пераходзіць у панылы гладкапіс, якога хапала і хапае. Калі М. Латышкевіч будзе шчыраваць над формай і перарасце сваю мілую наіўнасць, то, бясспрэчна, з яе атрымаецца сапраўдны творца. З гэтым трэба спяшацца, бо апошнія публікацыі — слабейшыя за папярэднія.

Згаданую феерычнасць можна лёгка ставіць за асноўную рысу "аблічча" наступнага маладога паэта — Алеся Танкевіча. Мітуслівыя фантазмы, доўгія радкі і поўны мех асацыяцый у кшталце Хадановіча, Прылуцкага і Жадана сёння не выклікаюць у чытача роўна ніякіх эмоцый, акрамя здзіўлення чарговым груваcткім тропам: "накладвае на пазногці як млеюць кругі на плоце / як крыжык упіўся ў хату як ноч разышлася гвалтам", "клёкаюць зоры носам ля чужых грудзей"...

Пэўная змысленасць, "зробленасць" характэрная і для вершаў А. Мальчэўскай. Тут, праўда, карціна яснейшая і больш прывабная. Да таго ж, у адрозненне ад рэлігійнай палымянскай, маладосцеўская падборка развівае тэмы суадносін з рэчаіснасцю, так бы мовіць, бытавой і "празаічнай". Паэтцы зноў жа адчувальна бракуе самарэдагавання, каб верш "загучаў". Думаецца, А. Мальчэўская зразумее, што выкрасліўшы пару радкоў, можна часам выйграць вельмі многа, можна злавіць невымоўнае...

Апавяданне М. Карпечанкі "Бутэлька" вытрымана ў рэчышчы традыцыі беларускай "вясковай" прозы: памірае старая бабуля, а сярод яе рэчаў застаецца адна нязвыклая, што правакуе рэтраспекцыю. Нечакана гэтаю рэччу выступае бутэлька даваеннай гарэлкі. Сяброўка памерлай Васілісы прыгадвае выпадак, калі яны ўдваіх выправіліся сустракаць эшалон з салдатамі, думаючы напаткаць там сваіх навабранцаў-мужоў. Муж Васілісы не вярнуўся з фронту, а бутэлька, якая чакала ягонага прыходу, прастаяла ў старой усё жыццё, а пасля яе смерці сталася сімвалам чалавечай надзеі... Я не пераказваю сюжэт цалкам, бо аўтар сапраўды піша "густа"; яго лаканічны, "незасмечаны" стыль — імпануе.

Зусім іншая карціна — у аповесці І. Клімянкова "Званая вячэра", якая, па вялікім рахунку, хутчэй "цягне" на апавяданне. Двое старых сяброў, адзін з якіх памірае ад алкаголю, а другі, выбіўшыся ў начальнікі, не дапамагае яму стаць на ногі. Згрызоты сумлення галоўнага героя надта падкрэсліваюцца, псіхалагізм урываецца ў нарацыю, як Піліп з канапель, і гэтым пагаршае якасць прыстойнага твора.

А вось згрызоты персанажа апавядання А. Федарэнкі "Уночы" змушаюць прыгадаць няклясеўскую прозу. Бізнесмен, пакутуючы ад чалавекаенавісніцтва, з'язджае ў глухую вёску, дзе, можна сказаць, гвалціць глуханямую дзяўчыну. Пасля гэтага ён вяртаецца дадому ў настроі. Рэфлексіі і ўчынкі бізнесмена выклікаюць сумнеў. Увогуле, героі памянёнага празаіка часцяком ідуць, куды ногі вядуць, і гэта не загана, а спосаб мыслення... Лепшае ў Федарэнкі, як заўсёды, на месцы — мова, "кінакадры" апісанняў, партрэтаў і дробных дэталяў, дакладныя рэплікі ў дыялогах.

Эсэ А. Талаева "Горад, каменем якога я стану" даволі цікавае, нягледзячы на каструбаваты сінтаксіс. У ім аўтар рэканструіруе мінскую "міфалогію" і тапаніміку 1970 — 80-х. У нумары таксама прадстаўлены новыя вершы М. Дуксы і апавяданне-ўспамін М. Пазнякова "Старшы лейтэнант".

У публіцыстычнай частцы "Маладосці" друкуюцца разгорнуты нарыс А. Марціновіча пра начальніка аддзела культуры Любанскага райвыканкама В. Каткаўца, працяг хронікі У. Ягоўдзіка "Быў знак на небе, або Прырода Беларусі за 1000 гадоў..." і краязнаўчага даведніка "Літаратурныя мясціны Беларусі", гутарка Р. Баравіковай з Н. Голубевай. А. Вішнеўскі знаёміць чытачоў з пакручастым жыццёвым шляхам вядомага беларуса, вучонага-фізіка XIX ст. Зыгмунта Урублеўскага. Гісторыю трох вядомых жнівеньскіх свят разглядае ў артыкуле "Святы Спас, спасі нас!" І. Клімковіч. Завяршаюць нумар "Этнаграфічныя замалёўкі" У. Лобача; гэтыя лірычныя нататкі выгадна адрозніваюцца ад ягоных апавяданняў і нечым нагадваюць "Нарыс Паўночнае Беларусі" Я. Баршчэўскага.

«Нёман»

Поглядам у мінулае характэрны новы нумар часопіса "Нёман". Так, працягваецца публікацыя гістарычнага рамана А. Ждана "Князь Мсціслаўскі", які, у адрозненне ад яго яркіх апавяданняў у часопісе "Полымя", здзіўляе сваёй стылістычнай груваcткасцю. Ёсць і рэдактарскія недагляды. Напрыклад, на пачатку двойчы абвяшчаецца, што галоўны герой "проработал" (!) колькі гадоў намеснікам князя ў пэўным горадзе. Не зусім апраўданым паўстае і паглыбленне ў тонкасці інтымнага жыцця Вялікага князя Аляксандра і яго маскоўскай жонкі... Зрэшты, каб не выносіць дачасных прысудаў, пачакаем наступнага нумара "Нёмана", дзе будзе надрукаванае заканчэнне рамана.

Твор А. Дударава "Брэсцкая крэпасць" нарэшце пабачыў свет цалкам — надрукавана яго завяршэнне. І аўтара варта толькі павіншаваць. Кінасцэнарый сапраўды бярэ ў палон (а гэта — ці не найважнейшае?) сваім дынамізмам і рэалістычнасцю. Чытаецца адным подыхам. Ёсць тут і ноткі сентыментальныя, непраўдападобнасць, згушчаныя фарбы, залішняя пафаснасць і ультрагераічнасць, але ўсё гэта, далібог, не псуе ўражання: твор сапраўды таленавіты і свежы. Пра Брэсцкую крэпасць пісалі даволі, ды заўсёды пераважаў адзін з пачаткаў — ці ўра-патрыятычны, ці трагічны. У творы А. Дударава назіраецца сінтэз гэтых пачаткаў, ды яшчэ і з дамешкам добрага гумару, жартаў, жывых чалавечых адносін, нестандартнага паўтарэння старых ісцін — карацей, усяго таго, што рэдка сёння сустрэнеш у нашай літаратуры (і кінематографе).

Проза малых жанраў прадстаўленая гатычна-рэалістычнымі апавяданнямі А. Казлова ў выдатным перакладзе І. Шаўляковай і лірычнымі мініцюрамі Н. Пархімовіч (лепшая з якіх — "Мы — гарадскія!.." — кажучы словамі класіка, "вартая цэлай паэмы").

Паэтычныя старонкі "Нёмана" запоўнілі вершы Л. Галубовіча (у перакладзе І. Катлярова) і М. Шамякінай; "лёгкасць быцця" апошняй прыкметна кантрастуе з "сумнымі і прыгожымі" творамі першага. У рубрыцы "Упершыню ў "Нёмане" — лірыка А. Каляды, Л. Ляўшун і А. Клакоцкага.

У жнівеньскім нумары таксама адбылося адкрыццё рубрыкі "Сябрына", дзе ў далейшым мяркуецца прэзентаваць літаратуру краін СНД. Гэтым разам "Сябрына" прадстаўляе славеснасць Казахстана: друкуюцца паэтычныя і дыдактычныя творы казахскага класіка Абая, урывак з рамана М. Ауэзава, а таксама паэтычныя падборкі сучасных аўтараў — Н. Арзаліна, Ж. Дарыбаева, І. Аразбаева, Б. Іскакава, М. Макатаева (на яго творчасць трэба звярнуць увагу ў першую чаргу) і В. Міхайлава. Завяршае рубрыку змястоўная гутарка з неардынарнай асобай — паволжскім немцам, жыхаром Казахстана Геральдам Бергерам.

Надзвычайна цікаваю абяцае стаць яшчэ адна новая рубрыка "Нёмана" — "Літаратурнае залюстрэчча", пакліканая абмеркаваць "стан сучаснай літаратуры і перспектывы яе далейшага развіцця". Артыкул А. Андрэева "Залаты шнурок, альбо Пачатак новай літаратурнай эпохі" сапраўды захапляе дасціпнымі класіфікацыямі і верагоднымі "шляхамі далейшага развіцця", хоць і паўтарае ў асноўным старыя яго публікацыі, прысвечаныя "персонацэнтрычнасці" літаратуры.

«Бярозка»

У абноўленым варыянце пабачыла свет і старая-добрая "Бярозка", якая цяпер выходзіць раз на два месяцы. У нумары чытачам прапануюцца ўрыўкі з двух раманаў — "Дванаццаць подзвігаў Геракла" П. Васючэнкі і "Клуб Ротэраў" сучаснага англійскага празаіка Дж. Коў (пераклад В. Судлянковай). Публіцысты "Бярозкі" аналізуюць феномен роўп-джамперства (не ведаеце, што гэта, — пачытайце), асобу Аляксандра Рыбака (чыя вядомая ўсмешка ўпрыгожвае вокладку), а да таго ж спрабуюць пранікнуць у духоўны свет мастакоў П. Татарнікава і С. Шабохіна. У казачным стылі апавядаюць пра старажытных гістарычных асоб А. Марціновіч і А. Бензярук. Маладым чытачам прапануюцца новыя рубрыкі і конкурсы. Наогул, нумар вельмі разнапланавы, ён спадабаецца і дзецям, і падлеткам. Знойдзе сёе-тое цікавае для сябе і дарослы чытач.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

У першым томе энцыклапедыі «Мистецтво України»

На ўсёй постсавецкай прасторы ў досыць складанай сітуацыі аказаліся энцыклапедычныя выдавецтвы. Маючы за плячыма багаты вопыт, аб'ектыўна прэтэндуючы на званне і ролю навукова-даследчых інстытутаў, яны вымушаны канкураваць на кніжным рынку ўпоравень з камерцыйнымі выдавецтвамі. І як вынік — змяншэнне колькасці энцыклапедычных даведнікаў, скарачэнне ўвогуле абсягаў асаблівай, разлічанай на глыбокі досвед энцыклапедычнай дзейнасці. А некаторыя выдавецтвы і зусім спынілі сваю работу. Ва Украіне ўсё ж працуе калектыў Усеўкраінскага дзяржаўнага спецыялізаванага выдавецтва "Украінская энцыклапедыя імя П. П. Бажана". Безумоўна, час з усімі сацыяльнымі і эканамічнымі выдаткамі накладвае на яго дзейнасць сваю пячатку.

У Кіеве пабачылі свет энцыклапедыя "Украінская мова", шасцітомная "Юрыдычная Мова" (выданне адзначана Дзяржаўнай прэміяй Украіны ў галіне навукі і тэхнікі), Украінская Літаратурная Энцыклапедыя ў 5 тамах (пабачылі свет 1, 2 і 3 тамы) і інш. З незавершаных выданняў — і энцыклапедыя "Мастацтва Украіны" (з мяркуемых пяці пабачыў свет толькі першы том). У грунтоўным фаліянце (Кіеў, 1995 год) змешчана каля 2 тысяч артыкулаў і 1 тысяча ілюстрацый. У даведачным выданні — сістэматызаваныя звесткі пра шматгранны мастацкі працэс ва Украіне, інфармацыя пра ўкраінскіх творцаў, якія ў розны час жылі і працавалі ва Украіне і за яе межамі, пра дзеячаў мастацкай культуры іншых народаў, чые жыццё і дзейнасць былі звязаны з радзімай Тараса Шаўчэнкі і Івана Франко.

Выданне 1995 года, на вялікі жаль, не разглядалася і не рэцэнзавалася ў беларускім друку. Мажліва, беларускія мастацтвазнаўцы чакалі завяршэння выключнага па сваёй значнасці праекта, што, безумоўна, лагічна. Але выкананне зацягнулася. Не ўнікаючы ў прычыны, звернемся да "беларускіх старонак" першага тома. Мажліва, гэты зварот, размова на гэтую тэму дапамогуць развіць у Беларусі мастацтвазнаўчы інтарэс, краязнаўчую зацікаўленасць да пэўных агульных для беларускай і ўкраінскай культур тэм.

Асобна вылучана персаналія, прысвечаная беларускай спявачцы Ларысе Пампееўне Александроўскай (1904—1980). Увага ўкраінскіх энцыклапедыстаў выклікана найперш той акалічнасцю, што ў 1951 годзе Ларыса Пампееўна ажыццявіла ў Беларускім тэатры оперы і балета пастаноўку оперы С. Гулака-Арцёмаўскага "Запарожац за Дунаем". І выканала ў гэтай пастаноўцы ролі Аксаны і Адаркі. У Львоўскай вобласці ў 1935 годзе нарадзіўся Зіновій Восіпавіч Бабій — украінскі і беларускі спявак. Да 1963 года ён працаваў ва Украіне. Расказваючы пра ролі і партыі Зіновія Бабія ў Беларускім тэатры оперы і балета, "Мистецтво України" завяршае біяграфію артыста наступным радком: "У канцэртным рэпертуары — творы ўкраінскіх кампазітараў".

Асобны энцыклапедычны артыкул — пра ўкраінскага і расійскага жывапісца, графіка Міхаіла Сяргеевіча Башылава (1821—1870), які закончыў Харкаўскі універсітэт. Ва ўкраінскім выданні адзначана, што нарадзіўся мастак у Магілёўскай губерні. Так, памылкі ў гэтым няма ніякай. Але яшчэ ў 1984 годзе "Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі" ўдакладняла: нарадзіўся ў Жлобінскім раёне. І даты нараджэння падаюцца розныя. Украінскія энцыклапедысты сцвярджаюць: 18 кастрычніка 1821 года. А Генадзь Васільевіч Кісялёў у "ЭліМБел": 22.12.1820 альбо 3.1.1821 года, калі па новым стылі. Прызнаюся, большы давер выклікае беларуская крыніца жыццяпісу Башылава. Г. Кісялёў — і аўтар артыкула пра Башылава "Ілюстратар мастацкай класікі" ў часопісе "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі" ў першым нумары за 1971 год, Дарэчы, "ЭліМБел" падае і большую бібліяграфію да артыкула пра земляка, згадваючы публікацыі ў часопісах "Искусство" ("Башылаў — першы ілюстратар твораў Т. Р. Шаўчэнкі) і "Художник" (Першы ілюстратар "Вайны і міра"). Затое ўкраінцы падказваюць, дзе захоўваюцца творы Башылава.

Адкрыццём для Беларусі з'яўляецца згадка ва ўкраінскай энцыклапедыі акцёра і спевака Сямёна Георгіевіча Брытава (нарадзіўся ў Магілёўскай губерні ў 1869 годзе, год смерці невядомы). У 1893—1894 — акцёр трупы П. Саксаганскага, М. Садоўскага. У 1898—1899 працаваў у тэатральным калектыве А. Суслава. Удзельнік харавых канцэртаў, арганізаваных М. Лісенкам. У Рэчыцы нарадзіўся ўкраінскі і расійскі драматург Юрый Аляксандравіч Буракоўскі (1914—1973). І ён аказаўся па-за ўвагай "ЭліМБела". Аўтар п'ес "Зялёная ракета", "Ноч перад цудам" і інш. Самы вядомы з твораў — "Прага застаецца маёю". Спектакль па гэтым творы пад назвай "Юліус Фучык" быў пастаўлены на сцэнах Кіева, Адэсы, Прагі, Берліна і іншых гарадоў. Работа драматурга і акцёраў Адэскага тэатра Савецкай Арміі ў 1952 годзе была адзначана Сталінскай прэміяй.

Адзінаццаць энцыклапедычных радкоў прысвечана ўраджэнцу Магілёва ўкраінскаму вучонаму ў галіне будаўніцтва і архітэктуры Юрыю Аляксандравічу Ветраву (1916—1983). Член-карэспандэнт Акадэміі навук УССР, ён доўгі час працаваў рэктарам Кіеўскага інжынерна-будаўнічага інстытута.

Падрабязна расказвае ўкраінская энцыклапедыя пра дырыжора, народнага артыста СССР Яраслава Антонавіча Вашчанку. Ён працаваў у Львове, Адэсе, Варонежы. З 1972 — у Мінску. Асоба і ў беларускім музычным мастацтве вядомая. А вось пра скульптара Макара Кандратавіча Вронскага, які нарадзіўся ў Барысаве ў 1910 годзе, раней чуць не даводзілася. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі УССР, ён шмат сіл і намаганняў, творчых памкненняў аддаў раскрыццю вобраза Тараса Шаўчэнкі. Нават з'яўляецца аўтарам помніка вялікаму Кабзару ў Канадзе. І ў Казахстане — таксама.

Падрабязна расказвае ўкраінская энцыклапедыя пра дырыжора, народнага артыста СССР Яраслава Антонавіча Вашчанку. Ён працаваў у Львове, Адэсе, Варонежы. З 1972 — у Мінску. Асоба і ў беларускім музычным мастацтве вядомая. А вось пра скульптара Макара Кандратавіча Вронскага, які нарадзіўся ў Барысаве ў 1910 годзе, раней чуць не даводзілася. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі УССР, ён шмат сіл і намаганняў, творчых памкненняў аддаў раскрыццю вобраза Тараса Шаўчэнкі. Нават з'яўляецца аўтарам помніка вялікаму Кабзару ў Канадзе. І ў Казахстане — таксама.

У першым томе "Мистецтво України" пададзены артыкулы ў межах літар А—В ("Ааронський" — "Вяльцева"). Шкада, што некаторыя тэмы і персанажы аказаліся па-за ўвагай украінскіх энцыклапедыстаў. У Днепрапятроўску ў 1929 годзе нарадзілася беларуская спявачка Марыя Уладзіміраўна Адамейка. Творчы шлях пачала ў 1952 годзе як салістка Дзяржаўнага народнага хору БССР. Вядомасць займела і як выканаўца беларускіх народных песень і прыпевак. У Чарнаўках нарадзілася заслужаная артыстка БССР Святлана Арцёмаўна Акружная. У Коласаўскім тэатры ў Віцебску выканала дзесяткі адметных роляў. Беларускі кінааператар Уладзімір Акулін закончыў тэхнікум кінематаграфіі ў Адэсе (1928), некаторы час працаваў у Кіеве. Спявачка народная артыстка БССР Ларыса Філалогаўна Аляксеева нарадзілася ў Луцку (1907). Радзіма скрыпача, музычнага педагога Аляксандра Навумавіча Амітона (1911—1969) — горад Жданаў (у 1989 было вернута старадаўняе імя Марыупаль). У 1931—1957 гады Аляксандр Навумавіч выкладаў у Беларускай кансерваторыі. Заслужаны артыст УССР і заслужаны дзеяч мастацтваў БССР балетмайстар Аляксандр Рыгоравіч Апанасенка нарадзіўся ў 1911 годзе ў Кіеве. Свой след у беларускім мастацтве пакінула і заслужаная артыстка БССР танцоўшчыца Марыя Акімаўна Апанасенка (нарадзілася ў Кіеве ў 1926 годзе). Родам з Адэсы — беларускі рэжысёр, заслужаны артыст Казахскай ССР Канстанцін Ананьевіч Арбенін (нарадзіўся ў 1895 годзе). У 1954—1957 гады працаваў рэжысёрам Мінскага народнага тэатра Палаца культуры трактарнага завода. Народны артыст БССР Арсен Дзянісавіч Арсенка (1903—1945) нарадзіўся ў Харкаўскай вобласці. У 1928—1936 гадах працаваў у оперных тэатрах Украіны. Львоў — радзіма тэатральнага мастака Канстанты Атасельскага (каля 1739—1809), які стварыў дэкарацыі для пастаноўкі аперэты "Агатка, ці Прыезд пана" ў Нясвіжы. Працаваў і ў прыдворным тэатры Сапегаў у Дзярэчыне. На Чарнігаўшчыне нарадзіўся рускі і беларускі жывапісец Мікалай Аляксеевіч Атрыганьеў (1823—1892). Вядомасць маюць і такія яго работы, як "Вечар у Мінскай губерні", "Краявід у Магілёўскай губерні".

Ва ўкраінскай мастацкай энцыклапедыі павінна было б знайсціся месца біяграфіям кніжніка Кіеўскай Русі Аўрамія Смаленскага ("ЭліМБел" прысвяціла яму асобны артыкул), спявачкі Нінэль Захараўны Багуслаўскай (нарадзілася ў горадзе Крывы Рог у 1935), якая ў 1962 годзе пачала працаваць салісткай Беларускай філармоніі. Беларускі скульптар Віктар Фёдаравіч Байцун нарадзіўся ў Браварскім раёне Кіеўскай вобласці (у 1941 годзе). Заслужаны архітэктар БССР Міхаіл Іванавіч Бакланаў нарадзіўся ў Данецкай вобласці. Радзіма спевака і педагога Антона Пятровіча Баначыча (1880—1933) — Марыупаль. Антон Пятровіч з 1928 года працаваў у Мінску, выкладаў у Беларускім музычным тэхнікуме і Беларускай кансерваторыі. Настаўнік Л. Александроўскай, І. Балоціна, С. Друкера і іншых знакамітых постацей беларускага музычнага мастацтва. У 1951—1961 гадах Маладзечанскі абласны ансамбль песні і танца ўзначальваў Аляксандр Іванавіч Білібін (нарадзіўся ў 1911 у Сімферопалі). Адэса — радзіма славутай актрысы Зінаіды Браварскай. Народны артыст БССР спявак Леанід Фёдаравіч Бражнік нарадзіўся ў вёсцы Маскаленкі Белапольскага раёна Сумскай вобласці. Ужо гісторыя — і творчы лёс народнага артыста БССР Віктара Лук'янавіча Вуячыча (нарадзіўся ў 1934 годзе ў Харкаве).

Будзем спадзявацца, што гэтыя імёны, якія былі згаданы, знойдуць сваё месца, прыкладам, у "Дадатку" да пятага тома энцыклапедыі "Мистецтво України". А тое, што выданне такое павінна быць завершана, не выклікае ніякіх сумненняў. Хацелася б, каб і беларуска-ўкраінскія мастацкія сувязі былі ў ім дастойна адлюстраваны.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

Праз сціплы верш



У брэсцкім выдавецтве "Альтернатива" выйшаў зборнік паэзіі "Струна надзеі" (2009) вядомага беларускага літаратуразнаўцы, крытыка, прафесара, члена-карэспандэнта НАН Беларусі М. Мішчанчука. Гэта трэці яго паэтычны зборнік (першы — "Вернасць", 1979, другі — "Трывожуся за белы свет", 1984).

Кніга змяшчае творы, якія былі напісаны за апошнія 25 гадоў, а таксама пераклады вершаў слынных рускіх паэтаў Я. Баратынскага, І. Буніна, Ул. Хадасевіча ды іншых. Адкрывае зборнік верш "Пад маміным дрэвам прысяду", матывам якога прасякнута ўся кніга. Паэт амаль у кожным сваім творы імкнецца перадаць вялікую павагу і любоў да маці, якая ўсё жыццё была для аўтара самым блізкім і дарагім чалавекам, без якога ён, *"як бераг, ад ракі адарваны, як не асвечаны сонцам акамянелы ранак ... як птушка, з адсечанымі крыламі..."*. Быццам пра родную маці, піша паэт і пра сваю радзіму, даводзіць думку, што родная зямля дае сілы для жыцця і для таго, каб вытрымаць усе нягоды:

Я яшчэ не ўвесь ў магіле,
Бо са мной на рыштаванні
Беларускі край мой мілы
І рамонкаў белых танец.

Аўтар у сваіх творах вельмі далёкі ад ідэалізацыі жыцця, пра што сведчаць назвы многіх вершаў: "Элегія смерці", "Вайна", "Марнаванне", "За трывогаю — трывога" і інш. Ён трывожыцца, пакутуе, імкнецца перадаць свае перажыванні чытачу:

Сяджу на беразе трывогі,
Падкошаны лязом няшчасця...
Якія цяжкія дарогі —
Штодзень складаней,
пакручасцей!

Тым не менш, паэт не губляе надзеі на лепшае, верыць у тое, што чалавек здольны перажыць, вытрымаць усе ўдары лёсу. Нездарма, думаецца, кніга мае назву "Струна надзеі":

Ды не скрышаць вятры
Маёй цёплай надзеі,
Што калісьці ўсё зло
Мы над краем развеем!

Акрамя вершаў, у зборнік уключаны дзве паэмы: "Лясная школа", "Сачыненне пра дабро". Першая прысвечана Ядвізе Антонаўне Чарняўскай і апавядае пра часы Вялікай Айчыннай вайны, пра дзейнасць лясной школы, у якой вучыліся дзеці партызан. У аснове другой, па словах аўтара, — *"...рэальны факт, што адбыўся ў перыяд дэфіцыту, апісаны гадоў дваццаць назад прэсай"*, калі дзяўчаты-школьніцы жорстка збіваюць сваю аднакласніцу за тое, што яна, паабяцаўшы, не змагла дастаць і прынесці модныя красоўкі.

Паэт даводзіць, што ўсё пачынаецца з дзяцінства, і зло таксама. Дарослыя, імкнучыся да ўяўных радасцей, могуць забіць у сваіх дзецях пачуцці дабра і справядлівасці, выхаваць іх з абмежаванымі духоўнымі запатрабаваннямі.

Пераклады вершаў рускіх паэтаў, змешчаныя ў гэтым зборніку, з'яўляюцца выдатным узорам перакладчыцкага майстэрства М. Мішчанчука, бо дазваляюць чытачу яшчэ раз адчуць, прыгажосць і дасканаласць беларускай мовы, а таксама — наноў адкрыць для сябе рускую паэтычную класіку. Матыў, якім прасякнуты вершы М. Мішчанчука, працягваецца і ў падборцы перакладных вершаў, дзе адчуваецца заклапочанасць і перажыванне за сваю радзіму, філасофскія разважанні пра сэнс жыцця і ўсё тая ж надзея на лепшае, на больш вартае і дасканалае. Напрыканцы, думаецца, да месца будуць радкі з верша Я. Баратынскага ў перакладзе М. Мішчанчука:

Мой талент сціплы,
голас мой — не гладкі,
Ды я жыву
Успомніце не раз,
Як прарастаў
я памяццю для вас
Праз сціплы верш,
далёкія нашчадкі.

Алена ШЫШКО

Іван ЛАГВІНОВІЧ

Вершы для спагаднай жанчыны

1.
У грахах прыйшоў, у даўгах
да пасада свайго пачэснага...
Не прашу ў цябе пірага,
дай хоць скібачку хлеба чэрствага.

Без вачэй і без рук тваіх
згаладнеў і спрагнеў на ростанях.
Прытупіліся зрок і слых,
а вось боль у грудзях — абвостраны.

Не кажы, што прыйшоў дарма,
што вяртанне занадта позняе...
Больш нікога ў мяне няма:
ты — адзіная, бо апошняя.

2.
Адамкнуўся замок, адчыніліся дзверы
ў залатую свяцёлку жаночай душы!
А нядаўна яшчэ хіба мог я паверыць,
што да свята такога пашчасціць дажыць?

Жаўрукі палявыя, анёлаў хваліце!
Слаўце цуды зямныя, лясныя дразды!
У мяне сёння свой, асабісты Вялікдзень:
уваскрэсла каханне — я зноў малады.

3.
Хай нябесныя зоркі, зямныя агні
Пакладуць прамяні на алтар цішыні:
пасля тлумнай і шумнай людской мітусні
мусяць ночы маліцца за грэшныя дні.

Сцеражэ нас ахоўнік-анёл з вышыні.
Дарагая, спакоем душу ахіні,
на дабранач мне слова любові шапні
і, з усмешкай на вуснах, шчасліва засні.

4.
Толькі тады,
калі ледзь чутна
барвовакрылы птах дзянніцы
пастукае ў акно святліцы
і загадае нам прачнуцца, —
з палону рук маіх каханку
я адпушчу ў абдымкі ранку.
Толькі тады!

5.
У змроку вечара, у цемры ночы
ні змрочна мне, ні цёмна не бывае,
бо прамянямі валасоў жаночых
спагадны лёс мой побыт асвятляе.

Поле

1.
Пры добрым надвор'і
Ўзрасла і паспела пшаніца.
З вялікай ахвотаю
жала яе маладзіца.
Ужо на змярканні
вязала апошні снапочак,
павесіўшы ў небе
на зорку-цвічок свой сярпочак.

На зжатым загоне
паставіла роўным радочкам
пяць мэндлікаў гожых,
бы пяць залатых церамочкаў.
Сустрэў яе любы
край поля з букецікам мяты,
цалуючы нёс на руках
аж да самае хаты.

2.
З'ява светла-дзівосная
мроіцца ў полі,
набліжаецца, ясніць
прыхмараны дзень.
Гэта маці,
нібы паланянка з няволі,
да мяне ў белай хустцы
з нябыту ідзе.
Падыходзіць да колішніх
нашых загонаў —
запавольвае крок,
прыпыняе ходу...
І зямное жыццё —
дзень за днём, год за годам —
успаміны
праз гэтае поле вядуць.

Пакланіліся нізка
высокаму жыту.
У далонях —
да працы сялянскае сверб.
Ды згубіла яна
ў пустазеллі нябыту
пры паляках у Зыгмуся
куплены серп.

3.
Цяпер мне адвячоркам, як калісьці,
у поле з балалайкаю не выйсці,
каб на дажынках весяліць людзей...
Той самы край, а музыка не тая
ў магнітафона з рота вылятае,
"ад родных ніў" богведзь куды вядзе.
Да поспехаў тэхнічнага прагрэсу
вялікага не маю інтарэсу —
і адстаю на некалькі гадоў.
Я, бы той вуж, якога спрытны вожык
схапіў за хвост і цягне ў хатку-лоўжык,
балюча б'юся памяццю аб дол.

Канцона

На нейкі час аціхлі ў свеце войны,
загоіліся раны на зямлі,
і хрысціянскіх храмаў перазвоны
да будучага свята адплылі.

Напевам старадаўняга раманса
мяне на белы танец запрасі,
пад зорным небам дзіўнай ночы майскай
у вальсе закружы і... спакусі!

Змяніўся свет, і мы ўжо пастарэлі,
ды поўнач тыя зоркі зберагла,
што так натхнёна некалі гарэлі
над песеннай ваколіцай сяла.

Ад Малькавіч да Ганцавіч дарога
схавала каляіны пад асфальт,
а наша запаветная бяроза
не страціла былога хараства.

Напевам старадаўняга раманса
на танец маладосці запрасі,
пад зорным небам
дзіўнай ночы майскай
зноў зачаруй мяне і... спакусі!

* * *

У кастрычніцкі змрок застаялы нырнуў,
а ў святло красавіцкае вынырнуў.
Прывітальна на поўдзень рукою махнуў —
птушкам тым, што вярталіся з выраю.

За палётам сачыў, у чародках лічыў —
і на вочы журба нагарнулася,
бо паменшыліся іх кліны і ключы,
мо траціна дамоў не вярнулася...

— Ах, без вестак прапаўшыя птушкі мае..
Вы — як струны на ліры парваныя...
майму сэрцу збалеламу так не стае
песні кожнае непраспяванае!..

І пяро, што на плечы мне ўпала згары,
падалося пудоваю гіраю.
..Два браты мае родныя і дзве сястры
адляцелі... не вернуцца з выраю...

Рамансавы санет

Лятучая ладдзя інтымнай асалоды
далёка занясла!.. Ад нас за паўвярсты
да айсбергавых гор, да мора прахалоды
з экватара цячэ пад параю Гальфстрым.

І ёдзісты туман прылашчыў цвердзь і воды,
заблыталіся ў ім салёныя вятры.
Аголеных грудзей мускатна-вінны водар
свядомасць ап'яніў, пачуцці абвастрыў.

Як быццам трапіў я ў палон галюцынацый
і з рэчаіснасцю стасункі разарваў.
Такою цяжкаю здаецца галава,

што не магу прыўстаць, перажагнацца.
А сон ужо замкнуў павекі-аканіцы
суцешлівых вачэй сяброўкі-чараўніцы.

Аксана СПРЫНЧАН

Лета ў 9 вокнах

без філасофіі зімы

Паверх першы

Акно першае

Вінаградам заплецена
маё акно,
і таму не важна,
што не выходзіць на мора.
Праз лісце
праплываюць аблокі,
якім не трэба
я ў маім акне,
а тыя, якім патрэбная,
становяцца хмарамі,
каб напаіць лазу
і застацца
ў хвалях сініх гронак,
якія вып'ю,
гледзячы ў акно
з вінаградным святлом,
на якое, магчыма,
нехта і завітае,
каб згарэць альбо патушыць,
альбо, калі паспее,
напіцца
да за-
быцця...

Акно другое

Язмін
амаль кранаецца акна.
Як ён, і я,
але з другога боку.
І раптам
кветкі белая ладдзя
дайшла да шыбіны,
і я, нібыта каралева,
зрабіла ход.
Але ж не ў белым я...
І ўратавана белая ладдзя
празрыстым шклом
ад чорнай каралевы.

Акно трэцяе

Акно расчынена
не для таго, каб мыць,
і не таму,
што не стае паветра.
Хіба што пастаяць,
нібы ў карціне,
і пажадаць рэальнасці,
ажыць
і працягнуць руку,
каб рваць ажыны...
І сінія адбіткі пакідаць
на вершах,
і сінім ротам
новыя шаптаць,
і ў раме фіялетавай акна
сябе ў карціне лета
маляваць
адным-адзіным колерам —
ажынным...

Акно чацвёртае

А за акном
без явару каліна.
Таму й не шэпча —
гронкава крычыць.
А толькі дакранешся —
анямее
і апячэ
саспелаю тугой.
Глядзіць яна ў акно
заўжды з надзеяй,
ды явару
ня вылезці з акна...
А да мяне
каханы грэшна лезе,
я не крычу —
каліна спіць адна...

Акно пятае

Разбэшчаны спякотай бэз
цнатлівіць зноўку
навальніца...
Персідскі
мокры
белы
бэз
на пасе выткала б і я,

Фота Аксаны Лунінец

каб не вяла мая рука,
забыўшыся,
інтымны дзённік,
дзе белы бэз і белы свет
з такога ж белага акна.

Паверх другі

Акно шостае

Спаць
пры расчыненым акне,
калі спадае долу
спеласць
чырвоных грушаў.
Прачынацца...
у белы дзень
і бачыць яго сярэдзіну
чырвонай...
І кінуцца з акна
не долу —
да сходаў,
каб у чырвоным
у белы-белы збегчы дзень...
І не стрымацца —
кінуць грушу ў акно,
і зразумець,
як гэта файна —
спаць пры расчыненым акне.
І не адной...

Акно сёмае

А з гэтага акна,
сваё каб бачыць,
глядзіш уніз —
на кветнік.
Гейхера, аквілегія, асцільба,
альпійскі лён, іберыс і вярбена,
гадэцыя, клеома і лілейнік,
і тыя, што і не ўзгадаю назвы,
каб нават вецер сціх,
і дождж,
і музыка з суседавае хаты.
Усіх згадаць
магу мужчын хіба што.
Ды не,
наўрад ці іх,
а кветкі,
што дарылі.
Дарыла.

Акно восьмае

Вішнёвы рэп,
рэчытатыў крывавы
і костачкі —
каб вызначаць прынцэс...
Туды ж,
дзе не дастаць,
бо ты не птушка,
глядзець з акна
й дачушку рыфмай
гушкаць.

Акно дзевятае

Такія яблыкі,
што ўзгадваецца:
Ева
ела,
а я ў акне над сходамі
стаю,
ратую яблык ад самоты
з чарвяком на пару
і застаюся
з летам
і свабодай выбару —
па яблык долу
ці ўгару спакус...

Эстэт

Васіль ТКАЧОЎ

Апавяданне

Піваварчыку дваццаць год, а не скажаш: бародка, якую ён адрасціў "для саліднасці і важнасці", як сам прызнаецца, дужа ўжо рэдзенькая, доўгая і вузенькая ўнізе, прыкметна старыць маладога чалавека. Аднак ён гэтага, здаецца, ці не разумее, ці не заўважае, дома ж яму падказаць няма каму: Сцяпан жыве адзін. А дом у яго — гэта невялічкі пакойчык у інтэрнаце будаўнічага трэста, які выбіў яму кіраўнік студыі "Дызайн-арт", дзе і сёння лічыцца Піваварчык спецыялістам па інтэр'еры офісаў. Так-так, офісаў. Калі браць, то шырока. Дзе яшчэ ён можа паказаць сябе так, як не там, сярод крутых хлопцаў і не менш крутых дзяўчын. Адна з іх, прыгажунь, неяк сама напрасілася ў госці да Сцяпана, ён не здолеў адбіцца ад назолы, прывёў дзяўчо ў свой катушок, а тая і ў ладкі пляснула, здзівіўшыся:

— Дык тут жа, мама мая, жыць можна! Такая прыгажосць!..

Іншага Піваварчык і пачуць не жадаў: усё ж ён дызайнер, а не абы-хто, і для сябе пастарацца лічыў першай справай, каб не казалі потым, што шавец не мае ботаў. Не, так не скажаш: пакойчык ён і сапраўды выштукаваў — залюбуешся. Хаця і на другім курсе ўсяго вучыцца ў інстытуце, завочнік, а бач ты — не зломак, галава ў хлопца ёсць.

А дзяўчына працягвала:

— Можна, Сцяпан Паўлавіч, мне пажыць у цябе? А то ж ездзіць далёка, ведаеш жа, дзе жыву... Калі не ведаеш, магу сказаць...

— Я не супраць — жывіце. Для гасцей у мяне раскладушка прадугледжана. Вытрымлівае звыш ста кілаграмаў. Але ж муж што скажа?

— Ён не кінецца мяне.

— Як гэта?

— Проста. Сказаў, каб не прыходзіла. Вось я і не прыйду. Ну, чаму ты маўчыш, Сцяпан Паўлавіч? Разгубіўся, бачу?

Гаспадар утульнага пакойчыка не разгубіўся, ён паглядзеў, што ёсць у яго ў маленькім халадзільніку, потым прычыніў яго, спакойна сказаў:

— Два дні пратрымаемся. А там — аванс. Ну, атабарвайцеся, будзьце, як дома.

— Як дома — не хачу! — насупілася дзяўчына. — Дома мне кепска. Я прагну, я жадаю, каб мне было хораша тут, у цябе, а, Сцяпан Паўлавіч? Можна, не будзем выкаць? Мы ж не на працы? Давайце, а? А то мы выкаем і тыкаем неяк адразу — пераскокваем з аднаго на іншае. Між намі, як гэта не цяжка заўважыць, існуе нейкая адлегласць. А ў такім, хоць і надта ўтульным, але даволі ўсё ж цесным пакойчыку, ды яшчэ на "вы"? Нешта не тое... Згодны?

— Можна... будзем..., — прамумкаў Піваварчык, хоць сам не мог зразумець да канца, чаго хоча ад яго дзяўчына.

— Ура-а!

— Цішэй, у нас тут у суседзяў малыя дзеці. Магчыма, спяць...

— Я таксама мару пра дзіця, — дзяўчына млява пацягнулася, агаліла лытку — кароценькая спаднічка паднялася разам з рукамі. — Угу. Для таго і замуж выскачыла, а мой не хоча дзіця. Дурань таму што. Не глядзіць наперад, як вось ты... Дзяржава б нам грошай заплаціла больш, чым я атрымаю ў сваёй шарашцы за тыя тры гады, што была б у дэкрэце. Цяпер за першынца падкінуць добра грошыкаў, не кажучы ўжо пра другога. Але ж куды я разагналася, дурніца? Хоць бы аднаго... пакуль. Некалі ж трэба пачынаць. А ты, Сцяпан, пра дзіця не марыш?

— Неяк не думалася...

— А я толькі гэтым і жыву...

— Тады... тады не па адрасе.

— Чаму ж?

— Хочаш, каб прызнаўся?

— І гэтага таксама хачу...

— У мяне яшчэ не было дзяўчыны. Ніколі.

— Хлусіш! Ну, хлусіш жа!

— Зусім не. Не бы-ло!..

— А калі ж прадбачыцца ў цябе дзяўчына?

— У дваццаць два я толькі пачну пра яе, дзяўчыну, думаць.

— Так позна?

— У мяне ўсё разлічана, усё па палічках раскладзена: дзе, што, калі, як..

— Цікава-цікава, аднак!.. Першы раз сустракаю такога чалавека. Такога выкапня. Не верыш?

— Веру. Нас, такіх, мала. Але ёсць. Вось што... Я... мне трэба ў горад па справах. А ты распранайся, адпачні. Калі хочаш пакляваць чаго, знойдзеш у халадзільніку. Запомні: усё, што ў халадзільніку, можна браць. Толькі там. Нідзе болей. Ну, дык я пайду?

Дзяўчына памахала яму пальчыкамі, а потым какетліва паднесла тыя пальчыкі да сваіх вуснаў, цмокнула іх, а сама глядзела на Піваварчыка так, быццам ён зусім нікуды не збіраецца тэпаць, а пачне зараз жа распранацца, загіпнатызаваны яе прышчураным і заманлівым поглядам, шпурляць сваё адзенне падалей ад сябе, а потым працягне свае доўгія і кашчавыя рукі насустрач ёй, і тады яна, напяўшыся, бы струна, з небывалым імпэтам кінецца ў яго абдымкі, і ўсё на тым не скончыцца... На тым усё толькі пачнецца... Дзяўчына заплюшчыла вочы: ну, дзе ты там, любы! Бяры мяне! Хапай! Калі я прыйшла, то ведаю, навошта! Без мэты не хаджу! Бяры мяне! Рабі, што хочаш! Сцяпан, халера ты гэтакая!..

Сцяпан папытаў:

— Цябе, здаецца, Люсяй завуць?

— Люсіндай, — паправіла яна.

— Запомню. Я хутка буду.

— Чакаю, Сцёпа!..

Ён патупаў, не азірнуўшыся. Люсінда паслала яму паветраны пацалунак, якога Сцяпан, безумоўна ж, не бачыў. Пакуль ішоў да шэрага чатырохпавярховага будынка, дзе месціўся прафсаюз работнікаў культуры, яна займала яго думкі. Не, дакараў ён сябе, зусім не так трэба было дзейнічаць з першай хвіліны, з таго моманту, як увязалася яна за ім. Прэч, Люсінда! Бач, чаго захацела! У госці! Ну, калі ўжо табе так закарцела, то і паводзь у гасцях прыстойна, а не закідвай адразу гутарку пра дзяцей. Дык не ж! Адразу, як кажуць, бярэ быка за рогі. Не на таго напаролася, прыгажуня. У мяне дзеці будуць, але значна пазней!.. Я толькі пабяруся шлюбам праз дзесяць год — у трыццаць. Пасля інстытута — аспірантура, абарона кандыдацкай, а там, магчыма, і доктарскай. Жонка таксама павінна быць вартай мяне. Не Люсінда ж!.. Люсінда, Люсінда... А ў яе, аказваецца, і сапраўды муж ёсць? Сказаць шчыра, дык Піваварчык і не ведаў, гэта ён так, на ўсялякі выпадак, нагадаў ёй пра яго, калі папрасілася трохі пажыць. Дык ёсць у яе, урэшце, муж ці не? Тут трэба падумаць, тут так, з наскоку, нельга... А раптам і прыйшла да яго... як да мужа, можа яна спіць і бачыць Піваварчыка таткам свайго дзіцяці? Не п'е. Не курыць. А цяпер вось і бародку завёў. Хто што заводзіць, а ён — бародку. Хутчэй усяго так. Бо калі ж ёсць у цябе, Люсінда, муж, навошта тады пляцеш павуціну вакол яго, значыць, а? Для якой мэты? Пачакай у мяне, разбяромся!..

А вось і той будынак, да якога шыбаваў Піваварчык. Люсінда адразу выпырхнула з галавы, нібы спуджаная птушка з гнязда. У яго галаве дастаткова месца іншым думкам і планам. Перапоўнена галава. Тут вось якая аказія атрымалася. Апошнім часам Сцяпана пацягнула на вершы. Напісаў ажно тры, не сказаць, каб шмат радкоў было ў кожным тварэнні, аднак і не карацелькі. Сярэднія вершы — у плане, вядома ж, памеру, а што ж тычыць іх мастацкіх вартасцяў, тут не можа быць і размовы. Класіка. І не пярэчыць! Але ж, як кажуць, не мела баба клопату, дык купіла парася. Так і ў яго атрымалася з вершамі. Некуды ж трэба іх аддаць, каб надрукавалі. Піваварчык спаў і бачыў сябе ўганараваным паэтам, нават калі сёрбаў боршч і не было ў ім лаўровага лісця, ён усё роўна адчуваў яго пах. Ну, добра, аддасць ён іх у часопіс альбо газету, а дзе гарантыя, што іх не ўкрадуць? То-та ж. Няма гарантыі. Паколькі Піваварчык усё рабіў разважліва і памяркоўна, ён высветліў, што існуе арганізацыя, якая стаіць на абароне аўтарскіх правоў. Адшукаў на вуліцы Казлова. Там нават не глянулі на яго вершы, адпіхнулі, можна сказаць. "Вершы не рэгіструем!" Бачылі? Толькі, кажуць, песні і п'есы. А калі ён проста паэт, Піваварчык, дык што яму цяпер рабіць? Куды звяртацца? Хадзіў і да самага галоўнага абаронцы аўтарскіх правоў, дык той і размаўляць не захацеў: ідзіце, маўляў, малады чалавек, і не перашкаджайце працаваць. Яму, бачыце, працаваць трэба, а ён што, лынды б'е? Так, атрымліваецца? Ну, пачакайце!.. Хоць і памеўся паказаць Піваварчык, хто ён такі, аднак нічога не дамогся ў галіне захавання сваёй інтэлектуальнай уласнасці. Тут яшчэ і такая акалічнасць: сустрэў ён неяк паэта Леаніда Дранько-Майсюка — пазнаў дзякуючы экрану тэлевізара — і паскардзіўся таму на несправядлівасць і непрызнанне, як творцы. Масціты паэт не стаў яму падлагоджваць, а заявіў адкрытым тэкстам: вершы і сапраўды не рэгіструюць, бо калі пачнуць кожны напісаны верш рэгістраваць, трэба пасадзіць для гэтай справы тры сотні чалавек, калі не болей, і ўсім даць аклад. А дзе ж сродкі, шаноўны? Быццам і праўду гамоніць Дранько-Майсюк. І яшчэ параіў ён адносіць смела свае вершы ў газеты і часопісы. Сказаў, не ўкрадуць. А калі творы і сапраўды цікавыя, то неўзабаве яны стануць здабыткам аматараў паэзіі, а ён, гэта значыць Піваварчык, — апынецца адразу на Парнасе. Толькі не зусім пераканаў Піваварчыка Дранько-Майсюк. Усё ж, усё ж... А раптам? Хоць Піваварчык і сумняваўся ў шчырасці тых, хто друкуе вершы, аднак нічога не мог супрацьпаставіць ім. Ну, праляжаць тыя тры вершы ў ягоным пісьмовым стале, страцяць сваю актуальнасць, а яшчэ горш, знойдзецца які-небудзь лаўкач ды і выдасць акурат такі тэкст, які здарыўся і ў яго. Што тады? І ён набраўся смеласці і ўсё ж рашыў аддаць куды-небудзь свае творы. Выпадкова патрапіў у газеце на абвестку, з якой даведаўся, што прафсаюз работнікаў культуры рыхтуе паэтычную анталогію і запрашае, такім чынам, усіх паэтаў, якія маюць дачыненне да гэтай галіны, прыносіць свае творы. Што ён і зрабіў. Вершы прынялі, праўда, чытаць не сталі, але паверылі, мусіць жа, што калі чалавек з бародкай, то і так вядома, хто ён. Канечне ж, паэт. Папрасілі толькі напісаць пра сябе кароткую даведку і прынесці фотакартку. Фотакартку выбіраў доўга. Спыніўся на той, дзе ён у чорным касцюме і пры гальштуку. І, канечне ж, з бародкай. Так больш годна. А потым патэлефанавалі з прафсаюза і папрасілі зноў прынесці фотакартку, слёзна спаслаліся на тое, што недзе ранейшую згубілі. Піваварчык адразу адчуў няладнае. Падумаў: значыць, вершы не хочуць друкаваць, таму і блазнуюць з карткай. Як гэта так — усіх карткі маюцца ў наяўнасці, а яго ўзяла і прапала. І вы верыце ў гэта? Піваварчык нізашто. І вось ён ідзе забіраць вершы назад, калі такія разумныя дужа складальнікі альманаха. Няхай друкуюць цяпер розную лухту. Будуць ведаць, як губляць карткі.

У тым кабінеце, куды ён адносіў свае творы, яго чакаў мужчына з пляшывай галавой. Убачыўшы Піваварчыка, нялюба змерыў таго позіркам, заўважыў:

— Яшчэ б хвіліна, і мяне толькі б бачылі.

— Даруйце, але раней не мог: працоўны дзень заканчваецца ў мяне роўна ў семнаццаць нуль-нуль.

— Гэтаксама, як і ў мяне, дарэчы. Забірайце свае вершы і не дурыце мне больш галаву.

Піваварчык узяў тры спісаныя лісткі, хаваць у дыпламат іх не спяшаўся, падняў вочы на складальніка альманаха:

— А картку — што, так і не знайшлі? Маю?..

— Не, пакуль не. Відаць, хтосьці згроб канверт з імі, з фотакарткамі, і пакуль не агледзіцца, што да чаго, не верне. Калі ж ходзяць тут усялякія!..

Піваварчык насцярожыўся:

— Прабачце, дык картка прапала не толькі ў мяне?

— Каб жа! Усе, усе прапалі. І ніхто, дарэчы, вершы не забіраў, акрамя вас.

— А ведаеце, што? — Піваварчык паклаў назад усё тыя ж тры лісткі. — Тады і я не буду. Што гэта я сапраўды?.. Калі б нават картка і згубілася ў аднаго мяне, то можна ж было новую прынесці. Неяк не падумаў. Бывае. Прабачце яшчэ раз.

— А думаць, шаноўны, трэба, — сказаў пляшывы дзяцюк і ўсім выглядам паказаў, што пара зачыняць кабінет. — Я, дарэчы, яшчэ вашы творы і не чытаў. Усё часу не выберу. Але веру, веру, што рэчы добрыя. Па вас жа відаць. Ну, да сустрэчы! — і ён моцна паціснуў Піваварчыку руку.

Ужо калі развіталіся, Сцяпан пашкадаваў, што не пацікавіўся, як зваць-велічаць укладальніка альманаха. Не ў яго стылі, але нічога цяпер ужо не паробіш: прамахнуўся.

Толькі цяпер ён і ўспомніў, што ў ягоным інтэрнацкім пакойчыку чакае яго Люсінда. Настрой не сказаць каб быў добры ад прадчування сустрэчы з ёй, але трэба ісці дадому, нічога не паробіш. Сапраўды, і чаму менавіта да яго яна прычапілася? Што, болей хлопцаў няма? А з іншага боку, дык трэба было б і нос яму задраць — не каго-небудзь выбрала дзяўчына, а яго. Ганарыся, Піваварчык! Але гонару ён не адчуваў. Не ўваходзіла ў ягоныя планы сёння браць і бутэльку дарагога марачнага віна, а прыходзіцца. Купіў. Так, з віном парадак, а цукеркі ёсць дома.

Люсінда і сапраўды чакала яго, і калі ён націснуў кнопку званка, дзверы адразу ж адчыніліся.

— Можна? — чамусьці папытаў ён, перш чым пераступіць парог.

— А што ты маеш на ўвазе? — зноў мляўка пацягнулася яна, агаліла лытку.

— Зайсці... гэта... да сябе хоць... можна?

— Калі ласка! — Люсінда зрабіла шырокі жэст рукой, усміхнулася.

Неўзабаве ён паставіў на часопісны столік два фужэры, паклаў, не знімаючы вечка, шыкоўны карабок цукерак "Палессе", які да гэтага ляжаў на кніжнай шафцы, нетаропка адкаркаваў бутэльку, жэстам запрасіў Люсінду да стала.

— Да гэтага віна самы раз будуць цукеркі з лікёрам, — сказаў і толькі цяпер падняў вечка. — Лепш закускі і не прыдумаеш!..

Люсінда засмяялася:

— А я думаю, чаму гэта я такая п'яная! Гэта ж ад цукерак! З лікёрам, кажаш?.. Ха-ха-ха-ха-а-а!..

Піваварчык аслупянеў — у каробцы не было ніводнай цукеркі. З'ела? Проста так? Амаль усе цукеркі, якія ён браў толькі ў крайнім выпадку, у асноўным, як вось і сёння, да марачнага віна? Ён глядзеў на дзяўчыну, разявіўшы, сам таго не заўважаючы, рот, і не знаходзіў, што ёй сказаць. З'ела? Проста так? Як можна?!..

Люсінда, падалося, пра ўсё здагадалася, яна моўчкі ўзяла сумачку і накіравалася да дзвярэй.

— Ты куды, Люсінда?

— Я зараз... За цукеркамі...

— Дык ты што... значыць, яшчэ вернешся?

— Абавязкова!

І дзяўчына схавалася за дзвярыма. Калі яна вярнулася, Піваварчык спаў — у яго, згодна распарадку дня, гэта быў час для адпачынку. Люсінда не стала яго будзіць. Напоўніла фужэр да краёў і залпам выпіла. Запаліла. Ад дыму Піваварчык пачаў перхаць, аднак не прачнуўся. Прачнуўся ён толькі тады, калі ў пакойчыку застаўся адзін.

Цукеркі «Палессе» ляжалі на часопісным століку некранутыя. Да вялікай радасці Піваварчыка.

«МЫ»: колькі ў гэтым слове!

Поліфанічная партытура жыцця — навакольнага і падсвядомага — у выкананні мінскіх віртуозаў. Такое самае агульнае ўражанне ад выставак, якія ладкуе аб'яднанне сталічных мастакоў "Арцель" (Artel'), утворанае знаным жывапісцам і тэарэтыкам выяўленчай культуры Рыгорам Несцеравым. Улетку "Арцель" здзейсніла праект пад назваю "Мы!", падрыхтоўку і правядзенне якога падтрымалі ўпраўленне культуры Мінскага аблвыканкама, Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Музей сучаснага выяўленчага мастацтва. Экспазіцыя прысвячалася Сусветнаму дню навакольнага асяроддзя, што зусім сугучна з абвешчаным у нашай краіне Годам роднай зямлі.

Экалагічны ўступ

Штогод у свеце адзначаюцца гэтак званыя экадні. Сярод іх — **2 лютага**, Сусветны дзень водна-балотных угоддзяў: у гэты дзень у 1971 г. у іранскім горадзе Рамсары была падпісана міжнародная канвенцыя асноўная мэта якой — захаванне і рацыянальнае выкарыстанне водна-балотных ўгоддзяў як сродку дасягнення ўстойлівага развіцця ва ўсім свеце. **22 сакавіка** абвешчана Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый як Сусветны дзень водных ресурсаў, а **22 мая** — як Міжнародны дзень біялагічнай разнастайнасці. **5 чэрвеня** — Сусветны дзень навакольнага асяроддзя, устаноўлены Генеральнай Асамблеяй ААН з мэтай усведамлення грамадскасцю неабходнасці захоўваць і паляпшаць навакольнае асяроддзе. Як Сусветны дзень барацьбы з апустыньваннем і засухай адзначаецца **17 чэрвеня**; Міжнародны дзень аховы азонавага пласту прыпадае на **16 верасня**. Ёсць у календары Міжнародны дзень папярэджвання эксплуатацыі навакольнага асяроддзя падчас вайны і ўзброеных канфліктаў: **6 лістапада**. Абвясціўшы гэтую дату, Генеральная Асамблея ААН улічвала, што ўрон, нанесены навакольнаму асяроддзю падчас ваенных дзеянняў, вядзе да негатыўнага стану экасістэмы і прыродных рэсурсаў і часта выходзіць за межы нацыянальных тэрыторый ды перасягае тэрмін жыцця аднаго пакалення. Да таго ж, у Дэкларацыі тысячагоддзя, прынятай ААН, падкрэсліваецца неабходнасць рабіць захады па ахове нашага агульнага навакольнага асяроддзя. У ліку "экалагічных" дат ёсць нават Міжнароднае дзесяцігоддзе дзеянняў "Вада для жыцця", якім ААН абвясціла 2005 — 2015 гады.

Але, бадай, галоўным у календары экалагічных падзей з'яўляецца Сусветны дзень навакольнага асяроддзя. Ён мае найбольшы грамадскі розгалас, бо, па сутнасці, прычынены да ўсіх планетарных, нацыянальных, рэгіянальных і лакальных экалагічных праблем. А значыць, так або інакш датычыць кожнага з нас.

> **"Чалавецтва даўно перайшло тую рысу, пасля якой эгаістычныя паводзіны як асобных персон, так і калектываў, робяцца пагрозлівымі. Высечка лясоў, забруджванне паветра, вады і зямлі — справа нашых рук. Не без нашага ўдзелу адбываецца глабальнае пацяпленне. А штодзённае знікненне рэдкіх відаў флоры і фаўны, якія ствараліся прыродай многія мільёны гадоў?**
>
> **Усё гэта адбываецца на фоне галоўнай бяды — змізарнення, счарсцвення і загрублення нашай душы, страты перспектывы. Мы забыліся, што мы — дзеці чалавецтва і космасу, што ўсе мы браты і сёстры, і народжаныя для вялікай мэты", — мяркуе мастак Р. Несцераў.**

Маналог лідэра

"Мы!" — выстаўка жывапісу. Прысвячаецца Сусветнаму дню навакольнага асяроддзя. Асяроддзя вакол каго? Нас, мяне, цябе... А што гэта такое і навошта яно патрэбнае? Мо гэта нешта лішняе, што замінае нам жыць, мо прасцей абысціся без яго, навакольнага асяроддзя, займацца выключна сабой і сваімі справамі?.. Не атрымаецца! І не прасцей: мы без яго не можам пражыць ні секунды...

Дык усё-ткі, што ж такое — навакольнае асяроддзе? Вядома, гэта і паветра, і вада, і зямля, жывёльны і раслінны свет, космас, нарэшце! У тым ліку і мы самі з'яўляемся асяроддзем для іншых людзей і ствараем умовы жыцця або яго немажлівасці. Наша душа, складваючыся з душамі іншых людзей, стварае агульны духоўны клімат, які вызначае ўсё далейшае жыццё чалавецтва. Гэты клімат, што складваецца стыхійна, не менш важны за глабальнае пацяпленне ці пахаладанне.

Чалавецтва даўно перайшло тую рысу, пасля якой эгаістычныя паводзіны як асобных персон, так і калектываў, робяцца пагрозлівымі. Высечка лясоў, забруджванне паветра, вады і зямлі — справа нашых рук. Не без нашага ўдзелу адбываецца глабальнае пацяпленне. А штодзённае знікненне рэдкіх відаў флоры і фаўны, якія ствараліся прыродай многія мільёны гадоў?

Усё гэта адбываецца на фоне галоўнай бяды — змізарнення, счарсцвення і загрублення нашай душы, страты перспектывы. Мы забыліся, што мы — дзеці чалавецтва і космасу, што ўсе мы браты і сёстры, і народжаныя для вялікай мэты. Мы, урэшце, забыліся на Бога, які сімвалізуе вечнасць, бясконцасць і цэласнасць свету, яго прыгажосць і гармонію.

Справіцца з праблемамі сёння нам дапамогуць Вера, Любоў, Праўда і Прыгажосць...", — гэтыя ўсхваляваныя словы Рыгора Несцерава, размешчаныя на выставачнай улётцы пры ўваходзе ў залу, замянілі традыцыйную анатацыю і ўспрымаліся не толькі як адмысловыя ўводзіны ў атмасферу вернісажа, але і як своеасаблівы маніфест ўдзельнікаў суполкі "Арцель".

Ва ўладзе музыкі сфер

Зразумела, што не агітплакаты ці проста лінейныя тэматычныя карціны "за ахову" навакольнага асяроддзя склалі новую экспазіцыю. Мастакі "Арцелі" па-творчы разглядаюць і па-філасофску асэнсоўваюць чалавечы аспект навакольнага асяроддзя. Кожны з людзей, а тым больш — творца, мастак, павінен задумацца пра тое, што, у залежнасці ад стану сваёй душы, ён робіць свет вакол сябе або цудоўным, або непрыемным, або наогул непрыдатным для жыцця. І новыя, у бальшыні сваёй датаваныя 2009 годам, работы ўражваюць не толькі прафесійнай віртуознасцю, разнастайнасцю тэм, тэхнік, стыляў, высокай ігрой інтэлекту, свежасцю эмацыянальнага напаўнення, а і мастакоўскай неабыякавасцю, шчырасцю выказвання, што дае гледачу спажыву для суперажывання і роздуму.

На карціне Сяргея Рымашэўскага "Лесвіца ў неба" — тры дзіцячыя постаці, тонка трактаваныя мастаком як алегорыі: "Дом", "Дарога", "Душа"... Глядач, абазнаны ў сакрэтах пуантылістычнага жывапіснага мроіва Рыгора Несцерава, убачыць рэальныя абрысы і рысы характэрнага твару задуменнай старой — "Жыццё"; кранальную і загадкавую кацінную пыску — "Супланецянін"; чалавекападобнае аблічча даверлівага шымпанзе — "Мы"... Зусім іншае "Мы" глядзіць з палатна Сяргея Малішэўскага: дзесяткі, сотні чалавечых твараў, з якіх складаецца супольны (ці абагульнены) людскі партрэт... Рыгор Іваноў прымнажае сямейства сваіх наіўна-казачных вобразаў — і ў падарожжы "На залатой рыбцы па рацэ жыцця", і ў светлакрылым "Анёле з месяцам"... Выклік жаночай вытанчанасці і прыгажосці гучыць у маляўнічых кампазіцыях Алены Шлегель... Гіпнатызуе гледача жывапісная экспрэсія сюжэтаў Мацвея Басава... Прыцягвае таемнасць акварэляў Сяргея Пісарэнкі... Зачароўвае красамоўны колер Васіля Касцючэнкі...

"Арцель", якая існуе пяць гадоў, — гэта 11 творчых індывідуальнасцяў. Поспех іх першай супольнай выстаўкі, праведзенай у 2004 годзе, паспрыяў устойлівасці творчай групы. "Мы стаміліся ад раздробленасці і негатывізму, ад хаатычнасці, бязмэтавасці і абсурднасці нашага ўспрымання жыцця, ад эгаізму, бяздушнасці, сухога рацыяналізму, скептыцызму і самоты асуджанага на дэпрэсію чалавека, — сцвярджае Рыгор Несцераў. — Занадта доўга наш погляд засяроджваўся на ценевым баку жыцця, а ёсць жа святло: хаатычнасць (як свету з'яў, што вакол нас, так і свету мірыядаў зор) нам толькі здаецца, насамрэч усё падпарадкавана сусветнай гармоніі, "боскай музыцы сфер". Мы забыліся, што ёсць Бог, прыгажосць, любоў, што без іншых людзей мы нішто, што чалавек, Сусвет і Бог — адзіныя і ў гэтым адзінстве — вечныя.... Новы час, які надыходзіць, унікальны гэтак жа, як і ўсе іншыя часы. Але без ведання мінулага рух наперад немажлівы. Мы не парываем з мінулым, так як гэта рабіў мадэрнізм на пачатку XX стагоддзя. Але, прымаючы яго, мы робім наступны крок — да пазнання і стварэння новай рэальнасці, якая яшчэ ніколі не існавала...".

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: мастак Р. Несцераў (у цэнтры) на вернісажы; карціны С. Рымашэўскага; С. Малішэўскага і А. Шлегель.

Фота Віктара Кавалёва

Верасень запомніцца тым, што...

••• у Мінску пасля рэканструкцыі, якая працягвалася 4 гады, адкрыўся Новы драматычны тэатр. Адкрыўся нядаўняй прэм'ерай "Каралева прыгажосці" паводле п'есы М. МакДонаха ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра калектыву Дзяніса Нупрэйчыка (першыя паказы спектакля адбыліся ў Палацы культуры прафсаюзаў). Раней гэты будынак у Заводскім раёне сталіцы належаў кінатэатру "Радзіма" і знанаму драматычнаму тэатру "Дзе — Я?" (пазней перайменаваны ў Новы драматычны тэатр). Цяпер гэта — прыгожы тэатральны гмах. Ён павялічыўся ў аб'ёме, з'явіліся дадатковыя памяшканні, свой пашывачны цэх, балетны клас і да т. п. Абноўленыя і сцэна, і зала, у якой цяпер 167 глядацкіх крэслаў.

••• вызначыўся пераможца Нацыянальнага дзіцячага конкурсу "Песня для Еўрабачання-2009", які будзе прадстаўляць Беларусь на міжнародным дзіцячым тэлевізійным песенным конкурсе "Еўрабачанне-2009". Спаборніцтва пройдзе 21 лістапада ў Кіеве, куды ад нашай краіны паедзе 13-гадовы мінчук Юры Дземідовіч. У нас за яго кампазіцыю "Волшебный кролик" прагаласавала большасць тэлегледачоў, лепшай яе прызнала і прафесійнае журы. Дарэчы, з яго складу непасрэдна перад правядзеннем у тэлеэфіры фіналу "Песні для Еўрабачання-2009" была выведзена мастацкі кіраўнік Нацыянальнага цэнтра музычных мастацтваў імя Уладзіміра Мулявіна Святлана Стацэнка. Прычынай сталася яе інтэрв'ю, змешчанае напярэдадні ў "Комсомольской правде": у ім С. Стацэнка выказала сваё палемічнае меркаванне пра песню Ю. Дземідовіча, тым самым парушыўшы этычныя правілы гэтага міжнароднага конкурсу.

••• у мінулую суботу, калі мінчане сталіцы адзначалі Дзень горада, сапраўднае свята, нечаканае для жыхароў нашай сталіцы, прынамсі, яе Партызанскага раёна, разгарнулася на падворку Мемарыяльнага музея-майстэрні З. Азгура. Тут выступалі юныя музыканты, дзіцячыя фальклорныя калектывы, гучала беларускае вершаванае слова. Пад разложыстымі дрэвамі размясцілася выстаўка работ навучэнцаў дзіцячых мастацкіх школ сталіцы, а побач ладзіўся своеасаблівы пленэр: дзеці рабілі замалёўкі святочных падзей. Мы ўжо звярталі ўвагу чытачоў на тое, што апошнім часам, пасля рамонту будынка, жыццё гэтага музея і вакол яго актывізавалася. Зусім нядаўна тут прайшла выстаўка "Заір Азгур. Хроніка ваенных гадоў". На працягу двух месяцаў наведнікі гэтага незвычайнага асабняка-музея мелі магчымасць азнаёміцца з цікавай старонкай творчай біяграфіі славутага беларускага скульптара. Экспазіцыя прадставіла 60 работ — скульптурных партрэтаў, рэльефаў (гіпсавых, бронзавых, мармуровых), датаваных 1942 — 1982 гадамі, а таксама шэраг архіўных дакументаў і фотаздымкаў.

Лана ІВАНОВА

На здымках: новы фасад Новага тэатра; Ю. Дземідовіч; музей-майстэрня З. Азгура.

Работа па стварэнні Асацыяцыі беларускіх цымбалістаў пачалася ў 1993 г., калі БСМД пры фінансавай падтрымцы Міністэрства культуры краіны дэлегаваў вядучага айчыннага выканаўцу Яўгена Гладкова на Другі сусветны кангрэс цымбалістаў у чэшскі горад Брно. З гэтага часу беларускія цымбалісты пачалі актыўна ўдзельнічаць у міжнародных форумах.

На Трэцім кангрэсе, які адбыўся ў 1995 г. у Браціславе (Славакія) і дзе бліскуча выступіла наша дэлегацыя, было вырашана правесці наступны, Чацвёрты кангрэс, у Беларусі. У перыяд падрыхтоўкі гэтага форуму у маі 1997-га адбылася ўстаноўчая канферэнцыя Асацыяцыі беларускіх цымбалістаў (АБЦ), на якой прысутнічалі прадстаўнікі амаль усіх рэгіёнаў краіны.

БЕЛАРУСКІ САЮЗ МУЗЫЧНЫХ ДЗЕЯЧАЎ

Цымбалаў срэбныя гукі...

Стварэнне АБЦ на чале з народным артыстам Беларусі прафесарам Яўгенам Гладковым сталася важным мерапрыемствам у межах святкавання 90-годдзя заснавальніка беларускай цымбальный школы Іосіфа Жыновіча. У кастрычніку 1991 г. Магілёў прымаў прадстаўнікоў 13 краін з чатырох кантынентаў. Найбольш поўна наша цымбальнае мастацтва было паказана менавіта на гэтым форуме, у якім удзельнічалі выканаўцы розных пакаленняў: ад юных цымбалістаў да вядомых артыстаў, а таксама прадстаўнікі аўтэнтычнага выканальніцкага мастацтва. З поспехам выступала беларуская дэлегацыя і на кангрэсах у Кішынёве (1999), Львове (2001), у швейцарскім горадзе Апенцэле (2003). У кангрэсах, якія адбыліся ў Кітаі (2005) і Германіі (2007), нашы цымбалісты не ўдзельнічалі з-за фінансавых прычын.

Сярод членаў АБЦ, а іх больш як 400, — прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Беларусі. Асноўным мерапрыемствам, якое ладзіць асацыяцыя раз на 2—3 гады, з'яўляецца рэспубліканскі фестываль "Сярэбраны звон цымбалаў". Першы адбыўся ў 1998 г. у Мінску, а ўсе наступныя, пачынаючы з 2000 г., — у Маладзечне на базе тамтэйшага музычнага вучылішча імя М. Кл. Агінскага. Кожны фэст — сапраўднае свята нацыянальнага мастацтва. Адборачныя абласныя туры, якія ладзяць рэгіянальныя аддзяленні АБЦ разам з мясцовымі аддзеламі культуры і адукацыі, вызначаюцца масавасцю і высокім узроўнем падрыхтоўкі ўдзельнікаў. Праграмы самога фестывалю вельмі насычаныя: ладзяцца конкурсы салістаў і ансамбляў музычных вучылішчаў, каледжаў, дзіцячых школ мастацтваў і сярэдніх школ з музычным напрамкам; навукова-практычныя канферэнцыі, майстар-класы, канцэрты вядучых калектываў і цымбалістаў краіны. Пяты фестываль (2007), прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння І. Жыновіча і 10-годдзю нашай асацыяцыі, яшчэ раз паказаў, як ад фестывалю да фестывалю развіваецца і ўдасканальваецца майстэрства выкладчыкаў-цымбалістаў.

Паміж фестывалямі — вялікая творчая праца. Штогод у рэгіёнах праводзяцца цікавыя мерапрыемствы, вартыя асобнага расповеду. За час існавання АБЦ падрыхтавана мноства лаўрэатаў і дыпламантаў міжнародных конкурсаў, у якіх удзельнічаюць не толькі студэнты Беларускй дзяржаўнай акадэміі музыкі, але і навучэнцы сярэдніх спецыяльных устаноў і нават музычных школ. А гэта сведчыць пра плённасць працы асацыяцыі. У адным артыкуле і не пералічыць усе дасягненні цымбалістаў за 12 год існавання АБЦ. Вось падзеі толькі сезона 2008/2009 гг.

Прыгадайма конкурсы. У кастрычніку 2008 г. адбыліся V юнацкія Дэльфійскія гульні краін-удзельніц СНД, на якіх цымбалісты Беларусі пацвердзілі свой статус наймацнейшых. Сярод пераможцаў — вучні Я. Гладкова, В. Барушковай, А. Шульгоўскай, Г. Івановай — членаў АБЦ.

III міжнародны конкурс выканаўцаў на шматструнных безгрыфных інструментах імя В. Гарадоўскай (Масква, лістапад) сабраў удзельнікаў з 7 краін далёкага і блізкага замежжа. Пераможца — студэнтка БДАМ Кацярына Лаўраненка (клас дацэнта Р. Падойніцынай, два другія месцы — таксама ў студэнтаў яе класа); лаўрэатамі конкурсу сталі вучні членаў асацыяцыі А. Літвінчук, А. Полесавай, Л. Чысцілінай, Г. Барысюк. У намінацыі "Ансамбль" лаўрэатамі сталі дуэт цымбалістак пад кіраўніцтвам прафесара БДАМ Я. Гладкова, дуэт з Брэста пад кіраўніцтвам А. Літвінчук і ансамбль ММВ імя М. Глінкі "Залатая струна" пад кіраўніцтвам А. Полесавай.

Таксама ў лістападзе Гомель прымаў І абласны конкурс маладых выканаўцаў на народных інструментах "Залатая ліра Палесся", які сабраў каля 90 удзельнікаў. Ініцыятар падзеі — лаўрэат міжнародных конкурсаў інструментальнае трыо "Лірыца", арганізатар — упраўленне культуры аблвыканкама і Гомельская абласная філармонія.

Рэспубліканскі конкус імя І. Жыновіча, які ладзіцца Міністэрствам культуры Беларусі кожныя тры гады, сабраў, як заўсёды, шмат удзельнікаў з усіх рэгіёнаў краіны. Фінальныя праслухованні, якія ўзначальваў Я. Гладкоў, адбыліся ў сакавіку ў Магілёве (навучэнцы ДМШ) і ў красавіку ў Гродне (навучэнцы музычных вучылішчаў і каледжаў). Конкурс паказаў, што ўзровень выканальніцкага майстэрства вырас ва ўсіх рэгіёнах, але калі раней на такіх спаборніцтвах лідзіравалі навучэнцы з Мінска, дык апошнім часам пераможцамі становяцца навучэнцы з Гомеля і Магілёва. Упершыню за ўсю гісторыю гэтага конкурсу Гран-пры атрымала выпускніца Магілёўскага МВ Алена Варанцова. Для ўдзельнікаў і слухачоў конкурсу ладзіўся сольны канцэрт лаўрэата міжнародных конкурсаў Веранікі Прадзед, канцэртмайтар — Алена Цагалко.

Цяпер — пра канцэрты. Мінулай восенню канцэртны сезон цымбалістаў адкрыў у Вялікай зале БДФ лаўрэат міжнародных конкурсаў Міхась Лявончык. Гучалі джазавыя творы, у тым ліку самога выканаўцы. У канцэрце ўдзельнічалі піяніст Аляксандр Лявончык і перкусіяніст Мануэль Да Коль.

У лістападзе 2008-га ў Малой зале імя Р. Шырмы БДФ адбыўся канцэрт-экзамен асістэнта-стажора Галіны Лазовік (клас прафесара БДАМ Т. Сергяенкі). Пазней тамсама — канцэрт студэнтаў класа выкладчыцы БДУКіМ Алены Шульгоўскай (іграла і сама настаўніца). Праз месяц зноў тут гучалі цымбалы. Выпускніца БДАМ лаўрэат міжнародных конкурсаў Вераніка Прадзед (клас Я. Гладкова) ладзіла сольны канцэрт з твораў беларускіх кампазітараў.

Сёлета ў той жа зале адбыўся канцэрт "У свеце гукаў і фарбаў", пра які падрабязна распавядалася ў "ЛіМе" (12.06.09 г., "Цымбалы, ряль і аркестр). Аўтар праекта цымбалістка Т. Шумакова адзначана стыпендыяй Міністэрства культуры Беларусі. Увесну ў зале Беларускага саюза кампазітараў прайшоў канцэрт "Цымбалаў срэбныя гукі" з твораў беларускіх кампазітараў, які прысвячаўся 60-годдзю факультэта народных інструментаў БДАМ. Адбыліся музычныя прэм'еры, і, акрамя цымбалаў-прыма, у якасці сольнага інструмента прагучалі альтовыя цымбалы. Выканаўцы — студэнты і ансамбль "Васілінкі" класа Р. Падойніцынай.

А вось ансамбль цымбалістак БДАМ "Лілея" пад кіраўніцтвам прафесара Я. Гладкова браў удзел у святочным канцэрце з нагоды 60-годдзя кафедры народных інструментаў Акадэміі музыкі Латвіі ў Рызе, а таксама даў сольны канцэрт для этнічных беларусаў, якія жывуць у гэтай краіне.

Сярод вясновых канцэртаў у Белдзяржфілармоніі — праграма з цыкла "Віртуозы цымбалаў" Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча. Салістка — лаўрэат міжнародных конкурсаў Кацярына Анохіна, дырыжор — Аляксандр Высоцкі.

А яшчэ — праграма "Чароўныя мелодыі цымбалаў", прысвечаная 85-годдзю ММВ імя М. Глінкі (выступілі навучэнцы выкладчыка вучылішча Г. Полесавай і ансамбль "Залатая струна" пад яе кіраўніцтвам), канцэрт студэнтаў класа дацэнта Т. Ялецкай з удзелам і яе выпускнікоў.

Колькі слоў пра фестывалі. На XXI Міжнародным фестывалі сучаснай музыкі, які адбыўся сёлета ў гістарычным і культурным цэнтры Польшчы Кракаве, упершыню гучалі беларускія цымбалы. Дасведчаныя слухачы канцэртных залаў "Florianka" (зала акадэміі музыкі), "Sala Fontany" (зала Гістарычнага музея) і слухачы г. Юргава вельмі цёпла прымалі выступленні лаўрэатаў міжнародных конкурсаў Таццяны Краснабаевай, Кацярыны Лаўраненкі, выканаўцы на альтовых цымбалах Святланы Старавойтавай, піяністкі Ксаны Садоўскай. Сучасная беларуская цымбальная музыка стала прыемным адкрыццём для палякаў. Аўтар і кіраўнік творчага праекта — Р. Падойніцына.

На II фестывалі-конкурсе "Хранители наследия России", які праходзіў улетку ў сталіцы Падмаскоўя г. Краснагорску і сабраў больш як 50 калектываў з розных рэгіёнаў Расіі і Украіны, вельмі ўдала дэбютавалі беларускія цымбалісты. Гран-пры атрымаў узорны цымбальны аркестр "Першацвет" СШ № 13 г. Мінска, якім з дня стварэння (1986 г.) кіруе В. Тульвінскі, энтузіяст і падзвіжнік, член АБЦ. Ансамбль "Васілінкі" (кіраўнік — Р. Падойніцына) стаў лаўрэатам Першай ступені.

Рыма ПАДОЙНІЦЫНА,
намеснік старшыні Асацыяцыі беларускіх цымбалістаў, дацэнт БДАМ

Наша добрая фея

Лектар-музыказнаўца Беларускай дзяржаўнай філармоніі Іна Зубрыч адзначае асабісты юбілей і 55-годдзе сваёй творчай дзейнасці. Разам з Міністэрствам культуры Беларусі БСМД рыхтуе да гэтай нагоды юбілейную вечарыну, якая адбудзецца 3 кастрычніка ў Вялікай зале БДФ. А музыканты-выканаўцы адрасуюць імянінніцы шчырае віншаванне.

Шаноўная Іна Ігараўна!

Сёння хочацца сардэчна павіншаваць Вас з Вашым цудоўным Юбілеем і ад усёй душы пажадаць Вам моцнага здароўя на доўтія гады, шчасця, радасці, дабрабыту, вялікіх магчымасцей у ажыццяўленні ўсіх Вашых планаў і задумак. Пажадаць, каб Вашы словы пра музыку і музыка Вашых слоў — непаўторна паэтычных, узнёслых расповедаў пра дзівосны свет мастацтва, свет чароўных гукаў, свет, у якім пануюць гармонія, святло і дабрыня, — доўгі час гучалі ў лепшых канцэртных залах нашай краіны.

А яшчэ нам хочацца ў гэты дзень шчыра выказаць словы любові да Вас — да цудоўнай і вельмі прыгожай жанчыны, да вельмі добрага, чулага, шчырага сябра, гатовага прыйсці на дапамогу і падтрымаць у цяжкую хвіліну не толькі спагадным словам і мудрай парадай, але і справай. Выказаць словы вялікай павагі да Вас як да прафесіянала, цудоўнага музыканта з бездакорным густам, чалавека з энцыклапедычнымі ведамі, стваральніка дзесяткаў разнастайных лекцый-канцэртаў, канцэртаў-спектакляў, перадач для тэлебачання і радыё, аўтара шматлікіх публікацый пра музыку. А таксама выказаць захапленне Вамі як артысткай, якая зачароўвае публіку з першага свайго з'яўлення на сцэне: сваёй мяккай усмешкай, добразычлівым позіркам, загадкавасцю і таямнічасцю аблічча і, безумоўна, сваёй натхнёнай, эмацыянальна ўзнёслай мовай, што нясе слухачам уяўленне пра вартасць мастацтва, абуджае іх памкненне да больш глыбокага яго асэнсавання, настройвае на душэўную чуласць, адкрытасць, што дазваляе ўвайсці ў непаўторны, чароўны свет музычнага мастацтва.

Вялікі дзякуй Вам за Вашу высакародную працу, за Вашу любоў да музыкі, да слухачоў і да нас — выканаўцаў. Кожны музыкант разумее, што Вы сваімі чароўнымі словамі, як пялёсткамі руж, высцілаеце нашу дарогу да сэрцаў слухачоў, адчыняючы іх, як добрая фея, каб кожны з прысутных у канцэртнай зале адчуў тую непаўторную душэўную ўзнёсласць, якая нараджае мроі, дапамагае чалавеку захоўваць чысціню, веру, надзею і любоў — дапамагае заставацца Чалавекам!

З любоўю і павагай да Вас усе тыя, каму пашчасціла працаваць разам з Вамі, ведаць Вас, сябраваць з Вамі і чуць Вашы хвалюючыя, узнёслыя словы пра Музыку.

Нашы юбіляры

БРАГІНЕЦ Таццяна Пятроўна — дацэнт кафедры баяна-акардэона Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

ЮРЦЭВІЧ Фёдар Васільевіч — дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

МАРЦІРОСАЎ Раман Тацевосавіч — выкладчык Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.

Працягваем вандраваць з "ЛіМам" па нашай краіне. Сённяшні маршрут: Мінск — Вішнева — Багданава — Гальшаны — Баруны — Крэва — Мінск.

Цуды краявідаў, помнікаў, храмаў

Тут перакладалася Біблія

З Мінска па шашы скіроўваемся праз Валожын да вёскі Вішнева.

Пры ўзгадванні валожынскага Вішнева (аднайменная вёска ёсць і ў Смаргонскім раёне) модна пачынаць з расповеда пра Шымона Перэса, ізраільскага прэзідэнта. У 1994 годзе ён атрымаў Нобелеўскую прэмію Міру. А нарадзіўся Перэс у Вішневе. Падчас прэзідэнцтва ён яшчэ не наведваў сваю малую радзіму. А калі быў міністрам замежных спраў Ізраіля, у Вішнева прыязджаў.

Сваім развіццём мястэчка абавязана канцлеру ВКЛ Яўхіму Храптовічу. Менавіта пры Храптовічы ў Вішневе пачалі сяліцца яўрэі. Пры ім быў пабудаваны сталеліцейны завод (1780), рэшткі якога можна ўбачыць і сёння.

У Вішнеўскім касцёле Найсвяцейшай Панны Марыі (1424) служыў ксёндз Уладзіслаў Чарняўскі. За савецкім часам ён быў адным з нямногіх святароў, хто адпраўляў службу па-беларуску. З-за гэтага шмат цярпеў.

Спее сонца.
Шчырэе світанне.
Толькі ў Вішневе
творыцца цуд.
Тут святар
беларускі літанне
Прамаўляе адзін
за свой люд.

Так напісала ў адным з вершаў Данута Бічэль.

Па даручэнні Папы рымскага Паўла IV а. Чарняўскі пераклаў на беларускую мову Біблію, за што яго называюць паслядоўнікам Скарыны. Пахаваны святар побач з касцёлам. Даводзілася бачыць, як людзі схіляюць галовы над магілай Уладзіслава Чарняўскага. Не прамініце і вы падысці і памаліцца за спакой душы добрага чалавека.

У вішнеўскай школе вучылася паэтка Канстанцыя Буйло. Адсюль паходзіць жонка Янкі Купалы цётка Уладзя. У вёсцы жыў Пятро Бітэль. Зведаўшы "смак" сталінскіх рэпрэсій, чалавек знайшоў у сабе сілы працаваць. Яшчэ падчас зняволення ён перакладаў "Пана Тадэвуша" Адама Міцкевіча. У яго перакладзе выходзілі "Хата за вёскай" Крашэўскага, "Залаты асёл" Апулея. А пісаў жа яшчэ і вершы. Пахаваны Пятро Бітэль на мясцовых могілках.

У Вішневе можна паглядзець на сядзібны дом пачатку XX стагоддзя, шэраг гаспадарчых пабудоў. Ёсць тут і царква ў гонар Казьмы і Дзям'яна (1886).

Ад Багданава да Дзесятнікаў

З Вішнева едзем да чыгуначнай станцыі Багданава. Параю кіравацца да вёскі Дзесятнікі. Тут размяшчаюцца ваенныя могілкі часоў Першай сусветнай вайны. На могілках усталяваны помнік палеглым у выглядзе ратонды з арлом наверсе. Праз кіламетр ад Дзесятнікаў знаходзіцца станцыя Багданава. Што тут можна паглядзець? Найперш мясцовы музей. Частка экспазіцыі ў ім прысвечана мастаку Фердынанду Рушчыцу. Мастак нарадзіўся ў вёсцы Багданава, што ў двух кіламетрах на захад ад аднайменнай чыгуначнай станцыі (па дарозе на Гальшаны). У вёсцы захавалася магіла мастака. Ёсць касцёл. Ён пабудаваны ў 1990-х на месцы касцёла св. Міхала Архаанёла (1690), страчанага ў 1944 годзе. Менавіта яго адлюстраваў на сваіх палотнах мастак. Увогуле, у Беларусі захоўваецца толькі адна арыгінальная карціна Рушчыца. Найбольш іх знаходзіцца ў Польшчы, дзе і жывуць нашчадкі творцы.



Мястэчка з прывідамі

З вёскі Багданава дарога ляжыць на Гальшаны. Гэта мястэчка, дзе, па легендзе, ёсць некалькі прывідаў. Белая Панна "жыве" ў кляштары францысканцаў. Тут яна неаднаразова і з'яўлялася людзям. А легенда такая. Пры ўзвядзенні кляштара адна са сцен пастаянна рушылася. І тады вырашылі будаўнікі прынесці ахвяру. Ёю стала маладая жонка аднаго з будаўнікоў, што першай прынесла мужу абед. Жанчыну замуравалі жывой. Ужо ў наш час былі знойдзены яе рэшткі і перазахаваны. А як жаночыя рэшткі дасталі, то па сцяне пайшла вялікая расколіна. Шмат хто прыязджаў у кляштар, каб убачыць прывід. Сярод такіх ахвочых быў і мастак Алесь Пушкін. Пад уражаннем ад сустрэчы з Белай Паннай ён напісаў аднайменную карціну.

У кляштары да мінулага года размяшчаўся філіял Нацыянальнага мастацкага музея. Але будынак знаходзіцца ў аварыйным стане. Таму філіял зачынілі, а будынак перадалі касцёлу св. Яна Хрысціцеля. Можа ўдасца гэты помнік архітэктуры намаганнямі вернікаў адрэстаўраваць, як тое зрабілі з касцёлам колькі гадоў таму.

Гісторыя каменнага храма ў Гальшанах сягае ў XVII стагоддзе. Фундатарам касцёла і кляштара з'яўляецца Павел Сапега, які запрасіў у мястэчка францысканцаў. У храме Сапега і быў пахаваны разам з трыма жонкамі. Не, падканцлер Вялікага княства Літоўскага не быў шматжонцам. Проста ён двойчы станавіўся ўдаўцом. А трэцяя жонка перажыла мужа. Для ўсіх чатырох былі выраблены адмысловыя надмагільныя помнікі. Гэтыя помнікі захоўваюцца ў Мінску.

Гальшаны вядомы развалінамі замка, помнікам архітэктуры XVI—XX стагоддзяў. Замак ляжыць у руінах ужо не адно дзесяцігоддзе. І не верыцца, што некалі возьмуцца за яго адбудову. На руінах, як сцвярджаюць некаторыя відавочцы, з'яўляецца другі прывід — Чорны манах. Але яго назіралі куды радзей, чым Белую Панну.

Памылкова сцвярджаюць, што свой раман "Чорны замак Альшанскі" Уладзімір Караткевіч спісаў з вобраза Гальшанскага замка. У свой час ліст пісьменніку напісаў мясцовы краязнаўца Эдуард Корзун. Уладзімір Сямёнавіч адказаў, што вобраз замка ў рамане — гэта не Гальшаны. Хоць, безумоўна, прысутнічаюць і ягоны рысы. Ліст, дарэчы, захоўваецца ў школьным музеі.

Памылкова сцвярджаюць, што свой раман "Чорны замак Альшанскі" Уладзімір Караткевіч спісаў з вобраза Гальшанскага замка. У свой час ліст пісьменніку напісаў мясцовы краязнаўца Эдуард Корзун. Уладзімір Сямёнавіч адказаў, што вобраз замка ў рамане — гэта не Гальшаны. Хоць, безумоўна, прысутнічаюць і ягоны рысы. Ліст, дарэчы, захоўваецца ў школьным музеі.

У Гальшанах шлюб з Соф'яй Гальшанскай браў Ягайла. Ад іх і пайшоў род Ягелонаў. Жанчыне прысвечаны памятны знак на плошчы.

Ёсць у мястэчку царква св. Георгія (1901). Захавалася вуліца з яўрэйскай забудовай, яўрэйскія могілкі. На рэчцы Гальшанка стаіць млын. Сцвярджаюць, што і ў ім таксама жывуць здані. Маўляў, па начах, здараецца, з млына далятаюць гукі як пры перамоле зерня.

Ці здаралася вам быць у Барунах?

З Гальшанаў дарога ляжыць на Баруны.

"Ці здаралася катораму з маіх барунскіх калегаў быць цяпер у апусцелых Барунах? О! Напэўна, не аднаму. Але ці хто з роўным майму пачуццём пазіраў тут на сляды сваёй маладосці? Ці з гэткім жа шчырым смуткам упаў на калені перад тым самым абразам, перад якім калісьці кленчыў у час службы? Ці вымераў душою тую прастору і розніцу часу, і гэтую яшчэ большую розніцу паміж сваім юнацкім і змучаным прыгодамі жыцця сэрцам? Ці адчуў глыбока ўнутры сябе тое злітаванне над сабой, якім чалавек аблягчае жыццё перад Даўцам жыцця, і ў якім выклікае на сябе яго прыхільны позірк, як дзіця кліча далёкую клапатлівую маці?", — пісаў у апавяданні "Баруны" польскамоўны пісьменнік Ігнацый Ходзька. Ён разам з паэтам Антонам Эдвардам Адынцом вучыўся тут у базыльянскай школе. Школа размяшчалася ў мураваным двухпавярховым кляштарным корпусе, узведзеным у 1778—1793 гадах. Сам кляштар базыльянаў паўстаў у канцы XVII стагоддзя. З 1845 манастыр быў прыстасаваны пад духоўнае вучылішча. У пачатку 1920-х у ім размяшчалася беларуская настаўніцкая семінарыя, дырэктарам якой быў вядомы нацыянальны дзеяч Сымон Рак-Міхайлоўскі.

Пры з'яўленні ў вёсцы базыльянаў імі была зроблена спроба пабудаваць каменны храм. Але ён згарэў разам з усім паселішчам. Уніяцкая царква святых Пятра і Паўла з'явілася на працягу 1747—1753 гадоў. У XIX стагоддзі была пераасвечана як праваслаўная Пакрова Прасвятой Багародзіцы, а ў 1922 — як каталіцкі храм свсв. Пятра і Паўла. У касцёле знаходзіцца абраз Маці Божай Барунскай (суцяшальніцы засмучаных).

У вёсцы захаваліся таксама нямецкія могілкі часоў Першай сусветнай вайны.

Легенды Крэўскага замка

На завяршэнне скіроўваемся ў Крэва. Самы стары, з замкаў (руінаў) якія захаваліся, знаходзіцца менавіта тут. У яго сценах была падпісана Крэўская унія (1385). У мурах замка быў задушаны князь Кейстут. Ці не кожнаму школьніку вядома гісторыя пра зняволенне Вітаўта братам Ягайлам. Для таго, каб выбрацца з вязніцы ў вежы, Вітаўту прыйшлося пераапрануцца ў адзежу жончынай служкі. Больш за тры гады Крэва знаходзілася на лініі фронту падчас Першай сусветнай вайны. Замак апынуўся на тэрыторыі, захопленай немцамі. Нямецкія войскі выкарыстоўвалі напаўразбураны замак па прамым прызначэнні — як абарончую пабудову. У замку з'явіліся сховішчы і назіральныя пункты. З вежы зрабілі дот, які часткова захаваўся і да сёння.

На ўскрайку вёскі ляжыць камень-валун, на якім выбіты шасціканцовыя праваслаўныя крыжы і дата — 1871 год. Гэта сведчанне пра халеру, якая лютавала ў тым годзе. Вяскоўцы, каб уратавацца ад халеры, паставілі вакол вёскі чатыры камяні-абярэгі. Да нашага часу захаваўся толькі адзін такі камень. Лічылася, што халеру ці чуму прыносіла Моравая Панна. Яна ўяўлялася маладой жанчынай з чорнай хустай у руцэ. Перад эпідэміяй яна з'яўлялася над селішчамі. Там, дзе яна ўзмахвала хустай — не заставалася нічога жывога. Адагнаць Моравую Панну можна было толькі замовамі і абворваннем зямлі вакол паселішча. Для гэтага выбіралі трох маладых дзяўчат, якіх голымі запрагалі ў плуг. За маладымі ішлі старыя жанчыны, якія білі ў вёдры, патэльні. Мужчына не мог прыняць удзел у такім шэсці.

Крэўскі касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі пабудаваны ў 1990-х на месцы страчанага храма. У той, страчанай, святыні ў 1944 годзе сваю першую Імшу адправіў ксёндз Чарняўскі. Адметная сваім ландшафтным кантэкстам царква св. Аляксандра Неўскага (1854). Паўразбураная побач з замкам стаіць сінагога. Ёсць у вёсцы і яўрэйскія могілкі.

З Крэва па Віленскай шашы праз Валожын вяртаемся ў Мінск.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

На здымках: помнік на могілках у Дзесятніках; яўрэйская забудова Гальшанаў; касцёл свсв. Пятра і Паўла ў Барунах; руіны Крэўскага замка.

Фота аўтара

Беларуская ваенная проза ў другой палове мінулага стагоддзя стала прыкметнай з'явай у сусветнай літаратуры. Яна змагла сказаць усяму свету на мове мастацкіх вобразаў пра беларусаў як жыццетрывалую нацыю, якая прайшла праз катаклізмы эпохі, захаваўшы свой духоўны, гуманістычны патэнцыял. Што такое ўвогуле чалавек, якімі ён валодае магчымасцямі ў супрацьстаянні глабальным пагрозам жыццю на зямлі — такія філасофскія і маральныя пытанні задавала беларуская проза, звяртаючыся да асэнсавання нядаўняга гістарычнага вопыту.

Ваенны досвед Аляксея Пысіна

А ці магчыма вылучыць аналагічную плынь у паэзіі, для якой выяўленне духоўнай сутнасці чалавека, яго ўнутранага свету з'яўляецца галоўнай мэтавай устаноўкай? Мы высока цэнім творы паэтаў франтавога пакалення. Імі падчас самой вайны і ў пазнейшы час былі створаны многія шэдэўры, у якіх тэма вайны знайшла ўвасабленне праз пачуццёвае суперажыванне, узвышана-трагедыйнае лірычнае выражэнне. Але ці ёсць, сапраўды, падставы ў дадзеным выпадку гаварыць пра асобную жанрава-тэматычную цэласнасць, якая б прадставала ў выглядзе выразна абазначанага напрамку літаратурнага развіцця?

Паэзія і проза адрозніваюцца многімі мастацка-выяўленчымі якасцямі і ўласцівасцямі як асобныя віды сучаснай літаратуры, хоць у наш час і назіраецца прыкметнае іх збліжэнне і актыўнае ўзаемадзеянне. У адносінах да выяўлення ваенных падзей, якія з кожным днём аддаляюцца ад нас па часе, паэзія і проза арыентаваны па-рознаму, адпаведна іх жанравай прыродзе. Паэзія, асабліва такая яе разнавіднасць як лірыка, скіравана ў асноўным на тое, што перажываецца аўтарам менавіта зараз, у дадзены момант яго жыцця. Менавіта гэты, заўсёды "цяперашні", час з'яўляецца самым актуальным для паэта, звязвае яго душэўны стан з усёй абсяжнасцю свету. Для прозы ў большасці выпадкаў патрэбна пэўная часавая дыстанцыя, хоць бы з прычыны таго, што стварэнне празаічнага твора займае звычайна больш працяглы час. Патрабуецца папярэдняя аналітычная падрыхтоўка, выстройванне матэрыялу ў некаторае сістэмнае адзінства, хоць пабуджальны імпульс, душэўны штуршок, як і ў паэтычнай творчасці, можа вынікаць з непасрэдна адчутага, таго, з чым аўтар судакрануўся ў сваім жыцці як з рэальна перажытым фактам.

Праўда, і для паэзіі таксама з'яўляецца важнай часавая рэтраспекцыя пры асэнсаванні такой каласальнай па сваіх наступствах з'явы як Вялікая Айчынная вайна. Таму і пісаліся, і пішуцца сёння паэтамі розных пакаленняў, у тым ліку і тымі, хто сам не зведаў гэткага горкага вопыту, творы, у якіх тэма *чалавек і вайна* паўстае ў розных ракурсах асвятлення. Іншая справа, што падключаныя да агульнага кантэксту творчасці пэўнага аўтара, гэтыя творы становяцца почасту нібыта менш прыкметнымі, утвараючы з творамі іншага тэматычнага дыяпазону непарыўную ідэйна-мастацкую цэласнасць.

Ваенная паэзія як выдатная мастацкая з'ява, безумоўна, існуе ў нашай літаратуры, яна даўно сцвердзіла сябе як эстэтычнае выражэнне унікальнага экзістэнцыйнага вопыту асобы ў экстрэмальных умовах ваеннага часу. Каб больш выразна ўявіць любую з'яву, якая прадстае ў безлічы асобных і ў той жа час узаемазвязаных фактаў, патрэбна вызначыць яе галоўныя, стрыжнявыя моманты. Уяўленні пра *ваенную паэзію*, думаецца, набудуць больш канкрэтызаваныя і пэўныя абрысы, калі мы будзем звязваць яе перш за ўсё з імёнамі, для яе вызначальнымі, знакавымі.

Адной з такіх цэнтральных, самых значных постацей у беларускай ваеннай паэзіі, несумненна, з'яўляецца Аляксей Пысін. У першую чаргу гэта, вядома, абумоўлена мастацкай значнасцю яго твораў, у якіх знайшоў выяўленне ваенны вопыт, досвед салдата, які прайшоў нялёгкімі франтавымі дарогамі, спазнаў радасць перамогі і горыч ад страты таварышаў. Вайна была ўбачана і спазнана ім у самым непасрэдным набліжэнні, з перадавой. Гэтай гранічнай набліжанасцю, кругаглядам салдата, аднаго з бясконцага мноства тых, чыёй крывёй і потам быў адолены люты вораг, у многім вытлумачваецца характар пысінскай паэзіі, своеасаблівасць раскрыцця ваеннай тэмы.

Даследчыкамі творчасці Пысіна часта абмяркоўваецца пытанне аб адносна познім звароце паэта да тэмы вайны. Як мне думаецца, рэтраспектыўнае асваенне паэтам ваеннага вопыту не ў малой меры звязана якраз з той сітуацыяй, у якой ён знаходзіўся падчас вайны, і адпаведным ракурсам бачання. У салдацкім акопе, на полі бою адчутая і перажытая вайна не магла адразу "ўкласціся" ў размераныя вершаваныя рытмы, занадта "гарачым", напружаным і дзейсным было пачуццё асабістай далучанасці да таго, што адбывалася там, на пярэднім краі.

Даследчыкамі творчасці Пысіна часта абмяркоўваецца пытанне аб адносна познім звароце паэта да тэмы вайны. Як мне думаецца, рэтраспектыўнае асваенне паэтам ваеннага вопыту не ў малой меры звязана якраз з той сітуацыяй, у якой ён знаходзіўся падчас вайны, і адпаведным ракурсам бачання. У салдацкім акопе, на полі бою адчутая і перажытая вайна не магла адразу "ўкласціся" ў размераныя вершаваныя рытмы, занадта "гарачым", напружаным і дзейсным было пачуццё асабістай далучанасці да таго, што адбывалася там, на пярэднім краі. Пысін быў на вайне не журналістам, для якога слова служыла б адзіным сродкам змагання. Хоць з журналістыкай у мірны час было звязана ўсё яго жыццё. Магчыма, самаадданае паглыбленне Пысіна-журналіста ў паўсядзённае жыццё пасляваеннага часу, яго пільная ўвага да ўсіх падрабязнасцей суладнага існавання чалавека і прыроды таксама пэўным чынам аддалялі на нейкі час неўвасобленыя пакуль што ваенныя ўражанні і вобразы.

"Адгрымела вайна, адсвістала, / Адпаўзла па дарогах крывых...". Аднак вяртанне да спазнанага і перажытага ў ваенны час было, па сутнасці, непазбежным. Пэўная дыстанцыяванасць толькі пашырала абсягі духоўнага зроку, у святле якога зноў паўставалі аблічы таварышаў па зброі, баі і часовыя зацішшы, знясільваючыя маршы і атакі. З гадамі не слабела, а ўсё больш узмацнялася повязь паэта з тымі, хто застаўся назаўжды за апошнім рубяжом. Баявое таварыства, "пабрацімства мёртвых і жывых" — гэтыя духоўна-маральныя каштоўнасці, вынесеныя Пысінам з вайны, сталі сутнасным асяродкам яго паэзіі. Сказаць, дагаварыць штосьці і за іх — тых, хто ўпаў на "даўнім кургані", штурмуючы "дняпроўскую граду", — у гэтым бачыў паэт свой чалавечы і мастацкі абавязак, свой грамадзянскі доўг. Пра свае пачуцці як выяўленне духоўнага адзінства франтавога пакалення вельмі шчымліва і вобразна сказана паэтам у вершы пра маладога камбата, які не паспеў пакінуць пасля сябе нашчадкаў: "... Ты, журба, як адчутая страта, / Вы, трывогі, адкуль, ад каго? / — А мы — дзеці, мы дзеці камбата, / Мы — адзіныя дзеці яго".

Неадмежаванасць ад таго агульнага, лёсавызначальнага, што датычыць у роўнай ступені ўсіх, характарызуе светаадчуванне аўтара, выяўляецца з надзвычайнай паэтычнай выразнасцю і эмацыянальнай сілай у яго ваенных вершах. Гэтая непадзельнасць лёсу і памкненняў знайшла, мабыць, самае гранічна завостранае ўвасабленне ў "Баладзе пра начлег", якая заканчваецца такімі радкамі:

Стралковая рота
сопку ўзяла.
...Пад намі зямля,
над намі зямля.

Гэтае "мы", як выказ супольнасці лёсу і агульнай адказнасці, успрымаецца тут вельмі асабіста, праз узвышэнне асабовага лірычнага перажывання да асэнсавання цэласнасці быцця. Чалавек-воін у Пысіна, адстойваючы жыццё, з'яднаны — да апошняга — з прыродай, яе адвечнасцю. Праз прыроднае і бачацца паэту многія яго героі, што сваім жыццём захілілі свет ад бяды. Як, да прыкладу, той Іван, які паўстаў наўзбоч палявой дарогі кветкай іван-чаю. Або вось гэта выява, дзе рэальнае спляло ся з мройным:

Святло, як дым.
Лес выбіўся з балота.
На жоўтыя
пясчаныя брады.
Не лес —
мая знямелая пяхота,
Не лес —
мае высокія браты.

Паказальным у вершах паэта з'яўляецца і гэты прыцяжальны займеннік, за якім таксама вострае адчуванне далучанасці да вайсковага братэрства. "Мае далёкія франты. / Мае палкі. Мае дывізіі"..."; "Я ў сваю дывізію пайшоў...". Такое ўзвышанае прамаўленне аніколькі не падаецца знарочыстым, бо апраўдана ўласным лёсам паэта і высокай трагедыйнасцю агульнага гучання яго паэзіі.

Аляксей Пысін узняўся ў сваіх ваенных творах да ўзроўню трагедыйнага мастацтва, узвышанага і праўдзівага ў сваёй аснове. І змог выявіць пры гэтым самую глыбінную, народную па сваёй сутнасці ўласцівасць духу — непахісную веру ў пазітыўныя, светлыя пачаткі быцця. Гэтая знітаванасць трагедыйнага і аптымістычнага заўсёды ўражвае пры перачытванні яго твораў, здзіўляе і зачароўвае. За гэтым — праўда народнага характару і народнага светаўспрымання. Выказаўшы яе, Аляксей Пысін і стаў адным з лідэраў беларускай ваеннай паэзіі, выразнікам бясцэннага жыццёвага досведу.

Яўген ГАРАДНІЦКІ

На здымках: А. Пысін і В. Быкаў; А. Пысін з дочкамі.

Іван Франко — па-беларуску

Газета "Літературна Україна" прысвяціла дзве вялікія паласы ўкраінска- беларускім літаратурным дачыненням. Сярод публікацый — і водгук Дмытра Паўлычкі на выдадзеную "Мастацкай літаратурай" кнігу Івана Франко "Народзе мой...: Творы". Несумненна, з гэтым водгукам цікава будзе пазнаёміцца і нашым чытачам.

Невялікая памерам, але дасканалая падборам найвыдатнейшых твораў Івана Франко кніжка "Народзе мой...: Творы" ў перакладзе Вячаслава Рагойшы, вядомага беларускага прафесара і пісьменніка, што выйшла ў Мінску ў 2006 годзе, не толькі заслугоўвае агульнаўкраінскай удзячнасці, але і падказвае, як трэба пракладаць дарогу касмічнай велічыні Франковаму імені да звычайнага, непадрыхтаванага чытача. Тры паэтычныя творы ("Пралог" да паэмы "Майсей", "Калі б ведаў чары...", "Таварышам з турмы"), тры апавяданні ("Сойчына крыло", "Хама з сэрцам і Хама без сэрца", "Як русін тоўкся па тым свеце"), драма "Украдзенае шчасце", філасофска-палітычны дыялог "Пры сконе веку" — такі лаканічны змест у загалоўках, але якая шматграннасць, якая бессмяротнасць Франковая! Мы, украінскія франказнаўцы і выдаўцы, знаходзімся пад уражаннем 50-томнага выдання твораў І. Франко, марым выдаць усю яго мастацкую і навуковую спадчыну — і гэта вельмі добра. Але беларускае выданне яго твораў — прыклад для нас, як паказаць акіян у кроплях, як паказаць у сузор'і бязмежнасць светабудовы.

Што да якасці перакладу, то давайце глянем, як гучыць па-беларуску "Пралог" да "Майсея". Возьмем радкі найцяжэйшыя для перакладу:

Невже тобі
на таблицях залізних
Записано в сусідів
бути гноєм,
Тяглом у поїздах
їх бистроїзних?

Цяжкія для перакладу радкі, але Вячаслаў Рагойша пераадольвае складанасцямі перастварэння арыгінала:

Няўжо тваёй
гісторыі скрыжалі
Цяглом быць для суседзяў
і пагноем —
Такую долю
нам наканавалі?

Захаваны найгалоўныя сэнсавыя апоры твора, даслоўна перададзены прыкметы паднявоЛенага народу, якія — цягло і пагной для суседзяў. Не думаю, што страта "бистроїзних поїздів" у гэтым тэксце з'яўляецца недахопам перакладу, бо самому аўтару неалагізм "бистроїзний" быў патрэбны для рыфмы, хоць, зразумела, унікальнай рыфмы.

А пераклады апавяданняў, драмы "Украдзенае шчасце" ды дыялога "На сконе веку" робяць такое ўражанне, быццам бы гэтыя рэчы былі і напісаны на беларускай мове. Чытаеш і забываеш, што гэта пераклад. Свежасць Франковага мыслення, мастацкага пісьма адчуваеш нанова, перажываеш зноўку ўсё прачытанае, нібы ўпершыню дакранаешся да нейкай дарагой, спаконвечнай мовы тваёй душы.

Мне здаецца, што апавяданні І. Франко беларускі перакладчык не проста любіць, а ўлюбёны ў іх. Ён перадае найменшыя дэталі і нюансы арыгінала з такім майстэрствам, што мне хацелася перачытваць двойчы і тройчы тыя пераклады, каб зачароўвацца Франковым ладам пісьма, адчутым у чужамоўнай інтэрпрэтацыі.

Вячаслаў Рагойша напісаў пасляслоўе да зборніка сваіх перакладаў "Народзе мой...: Творы" пад назваю "З Франковае крыніцы". Ён разгледзеў спадчыну І. Франко, прысвечаную тэорыі і практыцы перакладу мастацкіх твораў. Дакладна прааналізаваў артыкул І. Франко "Каменяры. Украінскі тэкст і польскі пераклад..." і прыйшоў да высновы, што аўтар "накрэсліў агульныя контуры параўнальнай паэтыкі, якая пачынае складвацца ў навуковую сістэму толькі ў наш час, становячыся надзейным фундаментам крытыкі перакладу". Пасляслоўе Вячаслава Рагойшы да разглядаемай кніжкі паказвае, што ён у сваёй працы карыстаўся парадамі самога І. Франко, прытрымліваўся іх, скажам так, з вялікім поспехам.

Зразумела, кніжка твораў І. Франко, якія належаць да найглыбшых і найсучасных, патрабавала прадмовы, каб адкрыць чытачу постаць аўтара, ахарактарызаваць яго гістарычную місію ў працэсе развіцця ўкраінскай літаратуры, надання ёй еўрапейскага гучання і пераможнай нацыянальна-вызваленчай духоўнасці. Менавіта такую прадмову напісала Таццяна Кабржыцкая, украінка, грамадзянка Беларусі, кандыдат філалагічных навук, жонка Вячаслава Рагойшы. Несумненна, яе прадмова "Мне змагацца — значыць жыць" — прыклад таго, як трэба пісаць коратка і змястоўна. Не абмінуць нічога істотнага з жыццяпісу і творчасці І. Франко і ўсё падаць ў стройным выкладзе, дзе эмацыйны настрой згарманізаваны з грунтоўнымі ведамі. Добра і тое, што дачка выдатнага львоўскага спевака Вячаслава Кабржыцкага знайшла месца ў гэтым лаканічным тэксце для таго, каб згадаць свайго бацьку, які на львоўскай опернай сцэне выконваў партыю Міколы ў оперы Юрыя Мейтуса "Украдзенае шчасце".

Таццяна Кабржыцкая ў прадмове да, па сутнасці, першага грунтоўнага выдання твораў І. Франко на беларускай мове прыводзіць найбольш значныя факты з папярэдніх выданняў. Мы даведваемся, што творы І. Франко выходзілі асобнымі, але невялічкімі кніжкамі ў Беларусі ў 1927-м, 1954-м, 1956-м, 1958-м гадах... Былі выдадзены апавяданні, п'еса "Будка № 27", творы для дзяцей "Калі звяры яшчэ ўмелі гаварыць". Дазнаемся таксама, што творы І. Франко ў новых перакладах Вячаслава Рагойшы ды ў новых пераўвасабленнях групы перакладчыкаў павінны з'явіцца ў прэстыжнай беларускамоўнай кніжнай серыі "Скарбы сусветнай літаратуры".

Дмытро ПАЎЛЫЧКА

Пераклад з украінскай.

Кранаюць словы земляка

Званок з Масквы заспеў мяне ў горадзе: "Не пазнаеш, хто турбуе?" Адказаў шчыра: не. "Адзін з герояў тваёй кнігі "Пахвалі пражыты дзень." 1986 год, паслячарнобыльскі райцэнтр Буда-Кашалёва..." Канечне, цяпер я пазнаў, хто гэта — Валерый Калінічэнка, былы рэдактар "раёнкі". Ён коратка расказаў мне пра свае справы і пахваліўся, што таксама займаецца літаратурнай працай, маюцца пэўныя набыткі.

Я нярэдка цяпер прыгадваю Валерыя Іванавіча, тыя дні, калі грымнуў Чарнобыль. У мяне якраз тады нарадзілася задумка напісаць кнігу публіцыстыкі пра гэтую бяду, пра людзей, на долю якіх выпалі нялёгкія выпрабаванні, таму і выязджаў шмат у якія населеныя пункты нашай Гомельскай вобласці. Звялі тады мяне шляхі-дарогі і з рэдактарам раённай газеты В.Калінічэнкам.

Пераехаўшы ў Маскву, Валерый Калінічэнка працаваў у розных выданнях, у тым ліку ў выдавецтве «Дороги» Міністэрства транспарту Расіі. З мандатам гэтага паважанага ведамства аб'ехаў практычна ўсю краіну ад Калінінграда да Сахаліна. Неаднаразова бываў за мяжой. Акрамя выдавецтва «Дороги», у розныя перыяды маскоўскага жыцця яму давялося працаваць у выдавецтвах «Мегаполис-Континент», «Экономика и жизнь», «Реальная экономика». Сёння ён галоўны рэдактар часопіса «Русский инженер» — цэнтральнага друкаванага выдання Маскоўскай Канфедэрацыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў.

Помню, Валерый Іванавіч стаў перад выбарам, нібы перад якой сцяной: дактары раяць выязджаць з Буда-Кашалёва, сур'ёзна хварэе жонка, і радыяцыя можа яшчэ больш пагоршыць яе здароўе. Але куды паедзеш, хто цябе дзе чакае? Доўга вагаўся. Тут — дом, старэнькая маці, прыстойная пасада. А што — там? Там — адзінае! — выратаванне жонкі. Урэшце выбраў Падмаскоўе, г.Шатуру, дзе неўзабаве стаў таксама рэдактарам раённай газеты. Жонку, на вялікі жаль, уратаваць не ўдалося...

З прадмовы да кнігі вершаў, якую, дарэчы, напісаў таксама мой даўні знаёмы Анатоль Крычаўцоў, член Саюза журналістаў Расіі, заслужаны работнік культуры Расійскай Федэрацыі, які нарадзіўся і вырас у Гомельскім раёне, можна даведацца, з якой цеплынёй Валерый Калінічэнка прыгадвае сваю малую радзіму, з гонарам адзначае, што Буда-Кашалёўшчына дала пуцёўку ў вялікае жыццё многім знакамітым людзям. Сярод іх — вучоныя, інжынеры, хлебаробы, ваеначальнікі, мастакі, пісьменнікі, паэты, партызанскія камандзіры, артысты, педагогі, урачы. "Вось на такой спрыяльнай глебе, у атмасферы высокай духоўнасці нарадзіўся і выхоўваўся Валерый Калінічэнка — аўтар паэтычнага зборніка, які вы трымаеце ў руках," — чытаю далей у прадмове.

Пасля ён на гэтай зямлі доўгі час жыў і працаваў. Нарадзіўся ж будучы журналіст і пісьменнік у 1949 годзе ў вёсцы Уборкі. Да школы выхоўваўся ў сям'і дзядулі. У Кашалёўскай сямігодцы скончыў першы клас. Потым была Ратміравіцкая школа. Гэта ўжо Акцябрскі раён, куды яго маці Марыю Цімафееўну (яна была па адукацыі лесаводам) накіравалі працаваць у мясцовае лясніцтва. Пасля сям'я пераехала ў гарадскі пасёлак. Акцябрская сярэдняя школа, дзе Валерый Іванавіч вучыўся ў старэйшых класах, адыграла важную ролю ў фарміраванні жыццёвых прынцыпаў, стаўлення да нашых агульных набыткаў і каштоўнасцей. У далейшым яго «універсітэтамі» сталі Мінскі аўтамеханічны тэхнікум, Беларускі дзяржаўны універсітэт, дзе вучыўся на факультэце журналістыкі. На гэты час прыпадаюць і першыя публікацыі ў перыядычных выданнях. Журналісцкі шлях яго як прафесіянала пачынаўся ў 1971 годзе ў рэдакцыі Буда-Кашалёўскай раённай газеты «Авангард». Амаль дваццаць гадоў жыцця аддадзена выданню. Дзесяць апошніх з іх ён быў рэдактарам газеты. І ўвесь час не пераставаў пісаць вершы. Першымі крытыкамі большасці твораў сталі чытачы «Авангарда».

Працуючы рэдактарам раённай газеты «Ленінская Шатура», В.Калінічэнка заснаваў выдавецтва. Яно падрыхтавала і выпусціла ў свет некалькі дзесяткаў кніг як падмаскоўных, так і сталічных паэтаў і празаікаў, у тым ліку членаў Саюза пісьменнікаў Расіі. Выдавецтва ў той няпросты час плённа супрацоўнічала з краязнаўцамі, гісторыкамі, аматарамі прыроды, іншымі творчымі асобамі падмаскоўнай глыбінкі, якія атрымалі магчымасць данесці свае думкі, уражанні, хваляванні, спадзяванні да шырокага кола чытачоў. У гэты перыяд наш зямляк завяршае і выдае раман «Асуджаныя на шчасце», аповесць «Тайнае галасаванне», працаваць над якімі ён пачынаў яшчэ ў Беларусі. Неўзабаве яму было прысвоена званне «Заслужаны работнік культуры Расійскай Федэрацыі», што з'явілася прызнаннем прафесійнага майстэрства не толькі як рэдактара і журналіста, але і як выдаўца і літаратара. У хуткім часе яго прымаюць у Саюз пісьменнікаў Расіі.

Пераехаўшы ў Маскву, Валерый Калінічэнка працаваў у розных выданнях, у тым ліку ў выдавецтве «Дороги» Міністэрства транспарту Расіі. З мандатам гэтага паважанага ведамства аб'ехаў практычна ўсю краіну ад Калінінграда да Сахаліна. Неаднаразова бываў за мяжой. Акрамя выдавецтва «Дороги», у розныя перыяды маскоўскага жыцця яму давялося працаваць у выдавецтвах «Мегаполис-Континент», «Экономика и жизнь», «Реальная экономика». Сёння ён галоўны рэдактар часопіса «Русский инженер» — цэнтральнага друкаванага выдання Маскоўскай Канфедэрацыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў.

Біяграфія паэта — канечне ж, гэта яго вершы. Чытаючы "Зорны дазор", у мяне, як чытача, з'явілася прыемная магчымасць пабываць разам з паэтам на Сахаліне, у Ванінскім порце, на Сапун-гары, на Малахавым кургане, захапляцца восенню ў Чувашыі... І ўсё ж пераважная большасць вершаў у зборніку прысвечана Беларусі. Адчуваецца, як сумуе па родных мясцінах паэт. Але што паробіш, так склаўся лёс. Валерый Калінічэнка — адзін з тых трох з паловай мільёнаў беларусаў, што жывуць сёння за межамі Бацькаўшчыны.

Васіль ТКАЧОЎ

Грамадскае аб'яднанне "Саюз пісьменнікаў Беларусі" выказвае шчырае спачуванне паэту Вараб'ёву Паўлу Віктаравічу з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці МАЦІ.

Калектыў РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказвае глыбокае спачуванне паэту Паўлу Вараб'ёву з прычыны вялікай страты — смерці МАЦІ.

Калектыў РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказвае шчырыя спачуванні свайму супрацоўніку Мінзеру Мікалаю Несцеравічу з прычыны вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.

Сябры СПБ, калегі, супрацоўнікі РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказваюць глыбокае спачуванне родным і блізкім Генадзя МЯЦЕЛІЦЫ з выпадку заўчаснай смерці таленавітага паэта.

РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказвае глыбокае спачуванне намесніку начальніка фінансава-эканамічнага ўпраўлення Міністэрства інфармацыі краіны Кузьміч Наталлі Рыгораўне з прычыны вялікага гора — смерці МАЦІ.

Нататкі краязнаўцы

Незадоўга да сваёй смерці былы афіцэр Уральскага казацкага войска Н. Ф. Савічаў напісаў успаміны пад назвай "Кароткае знаёмства з Тарасам Рыгоравічам Шаўчэнкам", якія былі надрукаваныя ў Новачаркаскай газеце "Казачий вестник" у 1884 годзе. Расказваючы пра сваю сустрэчу з апальным паэтам і мастаком улетку 1852 года ў Новапятроўскім умацаванні, Нікіта Фёдаравіч згадаў адзін вельмі цікавы эпізод.

Беларускі сябар Шаўчэнкі

Даведаўшыся, што малады афіцэр Савічаў захапляецца жывапісам, Тарас Шаўчэнка парэкамендаваў яму з'ездзіць у так званы Разуманаўскі сад (названы па прозвішчы аднаго заможнага купца — Разуманава), які размяшчаўся недалёка ад умацавання, каб зрабіць замалёўкі. Паглядзеўшы накіды маладога мастака, Шаўчэнка зрабіў некалькі заўваг і паабяцаў паказаць свой малюнак.

Гэты малюнак *"выяўляў унутранае ўбранне кіргізскай (казахскай — **В. А.**) кібіткі,— апісвае Нікіта Фёдаравіч. — Пад купалам кібіткі ўмацавана рускае акно, якое прапускае сонечны промень, адбіты мікраскапічнымі пылінкамі... Пад акном, за столікам сядзіць захінуты ў паўтаны, як аксесуар, сам Шаўчэнка з рэйсфедэрам у руцэ (а не з пэндзлем) і пільна ўзіраецца на "натуру". Натура гэтая стаяла пасярэдзіне кібіткі — мужчына, паўаголены, у скураных кіргізскіх (казахскіх — **В. А.**) шараварах — спінай да гледача. Мастаку, якому прыгадаліся ў стэпе акадэмічныя заняткі, спатрэбіўся торс... Малюнак зроблены сепіяй, на каляровай паперы, а блікі пройдзеныя кітайскімі бляламі... Гэты малюнак атрымаў бы ў Акадэміі найвышэйшы бал, а знаўца-аматар даў бы за яго шчодрыя грошы.*

Натуршчыкам служыў паручнік Турно, член мангышлакскай навуковай экспедыцыі".



Апісаная Н. Савічавым сепія цяпер фігуруе пад назвай "Шаўчэнка сярод таварышаў" і датуецца 1851 годам. Мабыць, менавіта гэты малюнак Шаўчэнка і яго сябры называлі ў сваім ліставанні "Трыо". Але Нікіта Фёдаравіч назваў толькі два імя: самога Шаўчэнкі, аўтара малюнка, і паручніка Турно, які выступаў "мадэллю". А вось трэцяга, што сядзіць злева на падлозе каля самавара ў панаме, з піялай у левай руцэ і з курыльнай трубкай — у правай, не назваў. З чым гэта звязана — невядома. Але менавіта гэты трэці персанаж карціны і павінен нас больш за ўсё цікавіць, таму што ён наш суайчыннік, паляк беларускага паходжання Браніслаў Францавіч Залескі — пісьменнік і мастак, гісторык і рэвалюцыйны дзеяч.

Ён нарадзіўся ў дваранскай сям'і ў вёсцы Рачкавічы Слуцкага павета Мінскай губерні. Васемнаццацігадовым студэнтам Дэрпцкага (Юр'еўскага, г. Тарту — **В. А.**) універсітэта Браніслаў Залескі быў арыштаваны ў 1838 годзе за ўдзел у тайным моладзевым таварыстве і высланы ў Чарнігаўскую губерню. Пазней ён паспяхова скончыў Харкаўскі універсітэт і прыехаў у Вільню. Тут ён адразу ж далучыўся да рэвалюцыйнай барацьбы, актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы Познанскага паўстання, за што зноў быў арыштаваны ў 1846 годзе і пасля працяглага турэмнага зняволення, у студзені 1848 года, аддадзены ў салдаты Арэнбургскага корпуса, куды прыбыў у канцы сакавіка гэтага ж года. Менавіта ў Арэнбургу ён і пазнаёміўся ў лістападзе 1846 года з Тарасам Шаўчэнкам, які толькі што вярнуўся з Аральскай экспедыцыі на чале з А. Бутаковым. Адбылося гэта так.

Дзякуючы сваім здольнасцям да малявання, Браніслаў Залескі быў камандзіраваны да А. Бутакова, дзе ён павінен быў дапамагаць Шаўчэнку рабіць апрацоўку гідрографічных відаў берагоў Аральскага мора. З гэтага часу і пачалася іх сумесная праца , а разам з тым і сяброўства.

Нават пасля таго, як у выніку даноса прапаршчыка Ісаева Шаўчэнка быў зняволены ў турме, а пазней высланы салдатам у невялікую крэпасць на беразе Каспійскага мора, сяброўства не скончылася. *"Там (у крэпасці — **В. А.**) прыгадвае Браніслаў Залескі, — правёў я з ім амаль цэлае лета, у 1851 г. На Мангышлак быў накіраваны горны афіцэр Анціпаў для пошуку залежаў каменнага вугалю; да яго атрада былі прыкамандзіраваны Турно, пляменнік генерала Дзямбінскага, і я: у Новапятроўскім (умацаванні — **В. А.**) упрасілі мы яго ўзяць яшчэ і Шаўчэнку".*

Верагодна, у адзін з вольных дзён Шаўчэнка і зрабіў накід будучай карціны, якую пазней паспяхова скончыў. Менавіта яе, ужо гатовую, мастак і паказваў уральскаму казаку Нікіце Савічаву. Нельга ў сувязі з гэтым не прыгадаць і яшчэ адзін факт. *"Падчас гэтага падарожжа, — піша Залескі, — Шаўчэнка выканаў для мяне чорнай крэйдай свой партрэцік... Партрэцік уражваў падабенствам: замест люстэрка мастак карыстаўся слоікам з вадой, таму што іншага люстэрка ў нас у стэпе не было. Не было таксама ні брытвы, ні цырульніка, і таму мы адпусцілі бароды, хаця абодва былі салдатамі".* На карціне "Трыо" Т. Шаўчэнка і Б. Залескі былі намаляваныя менавіта барадатымі.

Свае ўспаміны Б. Залескі заканчвае так: *"У адной палатцы, то бок у так званай кіргізскай (казахскай — **В. А.**) кібітцы, пражылі мы ўсё лета. Шаўчэнка маляваў і адчуваў сябе свабодным. З гэтага часу завязалася ў мяне з ім ліставанне".* Да нас дайшло 16 лістоў Шаўчэнкі да Залескага, датаваных 1853—1857 гг., і 10 лістоў Залескага за 1853—1859 гг.

Браніслаў Залескі вярнуўся з высылкі на радзіму, у Беларусь, летам 1856 года, а Тарас Шаўчэнка атрымаў вызваленне летам 1857 года. Сустрэча сяброў пасля васьмігадовага расстання адбылася восенню 1859 года ў Пецярбургу, куды Б. Залескі прыехаў у сувязі з падрыхтоўкай сялянскай рэформы як член Мінскага губернскага камітэта. Т. Шаўчэнка прыехаў у паўночную сталіцу імперыі з Украіны ў верасні. *"У гэты час, — прыгадвае Залескі, — мы бачыліся часта".*

Вясной 1860 года Браніслаў Залескі выехаў за мяжу і больш на радзіму не вярнуўся. У 1863 годзе ён дзейсна дапамагаў паўстанню, праз яго перасылаліся грошы, сабраныя для набыцця зброі за мяжой. Жыў ён спачатку ў Дрэздэне, у Рыме, а з 1864 года — у Парыжы. Браніслаў Залескі быў сакратаром Гісторыка-літаратурнага таварыства і рэдактарам яго "Штогодніка". Ён выпусціў у свет ілюстраванае выданне "Жыццё кіргізскіх (казахскіх — **В. А.**) стэпаў" (1865), "Польскія выгнаннікі ў Арэнбургу" (1866), а таксама ўспаміны пра сучаснікаў, у тым ліку, і пра Т. Шаўчэнку.

Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ

На здымках: Тарас Шаўчэнка; праца кабвара "Шаўчэнка сярод таварышаў", 1851 год.

Руплівец беларускага адраджэння

Браніслаў Эпімах-Шыпіла нарадзіўся ў вёсцы Будзькаўшчына Лепельскага павета (цяпер Полацкі раён) 4 верасня 1859 года ў сям'і дробнага шляхціца. Неўзабаве сям'я пераехала ў маёнтак Двор-Залессе паблізу Ветрына.

Браніслаў Эпімах-Шыпіла нарадзіўся ў вёсцы Будзькаўшчына Лепельскага павета (цяпер Полацкі раён) 4 верасня 1859 года ў сям'і дробнага шляхціца. Неўзабаве сям'я пераехала ў маёнтак Двор-Залессе паблізу Ветрына. У 1871 годзе Браніслаў паступіў у Аляксандраўскую гімназію горада Рыгі. Скончыў яе з залатым медалём і стаў студэнтам гісторыка-філалагічнага факультэта (аддзяленне класічных моў) Пецярбургскага універсітэта. Пасля бліскучага заканчэння універсітэта Эпімах-Шыпіла абараніў ступень кандыдата гісторыі і філалогіі. Ён быў паліглотам, ведаў больш як дваццаць моў, у тым ліку грэчаскую, лацінскую і санскрыт. Браніслаў Ігнатавіч займаўся выкладчыцкай дзейнасцю. Чытаў курс грэчаскай мовы ў духоўнай акадэміі, а пазней стаў настаўнікам у мужчынскай гімназіі. Выкладаў лацінскую мову на агульнаадукацыйных курсах Чарняева.

Больш як 34 гады Б. Эпімах-Шыпіла адпрацаваў у бібліятэцы Пецярбургскага універсітэта, быў удзельнікам першага міжнароднага з'езда бібліятэкараў у Бруселі, ездзіў у службовыя навуковыя камандзіроўкі ў замежныя краіны. Займаўся навуковай бібліяграфічнай і рэдакцыйнай дзейнасцю. За гэту працу быў узнагароджаны ордэнам Святой Ганны II ступені і ордэнам Святога Уладзіміра IV ступені.

Яшчэ адзін накірунак дзейнасці Б. Эпімах-Шыпілы — збіранне і вывучэнне матэрыялаў па гісторыі, этнаграфіі, фальклоры Беларусі. Браніслаў Ігнатавіч быў ініцыятарам стварэння ў 1906 годзе (менавіта тады беларуская мова атрымала афіцыйны дазвол на існаванне) і фактычным кіраўніком беларускай выдавецкай суполкі "Загляне сонца і ў наша ваконца". Першымі кніжкамі выдавецтва сталі "Беларускі лемантар, або першая навука чытання" і "Першае чытанне для дзетак-беларусаў" Цёткі. Суполка працавала да 1914 года і выпусціла ў свет 39 кніг даволі вялікімі тыражамі. У іх ліку была серыя "Беларускія песняры". Выходзіў таксама альманах "Маладая Беларусь".

Браніслаў Ігнатавіч быў неафіцыйным кіраўніком студэнцкага Беларускага навуковага літаратурнага гурта, створанага ў Пецярбургскім універсітэце. Кватэра Эпімах-Шыпілы стала своеасаблівым беларускім клубам, дзе па суботах збіраліся прадстаўнікі навуковай інтэлігенцыі, студэнцкая моладзь. Тут бывалі мастак Я. Драздовіч, музыкант і фалькларыст А. Грыневіч, кампазітар С. Казура, пісьменнік З. Жылуновіч (Цішка Гартны). Нярэдка наведвалася П. Мядзёлка — першая выканаўца ролі Паўлінкі ў аднайменнай п'есе Я. Купалы. Часам і рэпетыцыі п'есы прахадзілі на кватэры Эпімах-Шыпілы, а выканаўцам адной з ролей быў яго брат Уладзіслаў.

Трэба зазначыць, што ўся беларуская калонія адчувала дапамогу і падтрымку Браніслава Ігнатавіча.

Асабліва значную ролю адыграў ён у жыцці і творчасці Янкі Купалы. Менавіта Эпімах-Шыпіла спрыяў выданню "Жалейкі" — першага паэтычнага зборніка будучага беларускага класіка. Ён жа памылкова перайменаваў Янука Купалу ў Янку. Паэту імя прыйшлося даспадобы, і ў дальнейшым ён падпісваўся толькі так.

У снежні 1909 года, прагнучы адукацыі, Янка Купала едзе ў Пецярбург вучыцца. І па прапанове Браніслава Ігнатавіча больш як тры гады жыве ў яго кватэры. З самага пачатку паміж маладым паэтам і прафесарам склаліся сяброўскія адносіны, узаемаразуменне і ўзаемападтрымка. Аб гэтым сведчыць купалаўскі верш-прысвячэнне "Прафесару Б. Эпімах-Шыпілу" з новым 1910 годам".

Менавіта ў гэтым годзе Эпімах-Шыпіла перажыў асабістую трагедыю. У сваім фальварку Залессе вучоны пабудаваў дамок, дзе марыў адкрыць беларускі музей, для якога ім было сабрана нямала экспанатаў па краязнаўстве і гісторыі Беларусі. Калі прыйшла вестка, што сядзіба на Полаччыне згарэла, Браніслаў Ігнатавіч быў няўцешны. Агонь не проста знішчыў дом, у якім Эпімах-Шыпіла збіраўся дажываць свой век. Згарэла бібліятэка, калекцыя рарытэтаў. Аднак больш за матэрыяльныя страты прафесара засмучала сімволіка падзеі — не стала першага будынка беларускага музея. З дапамогай паэтычнага слова суцешыць Браніслава Ігнатавіча ўдалося Янку Купалу. Прафесар потым напіша: "... Толькі Янка Купала вершам сваім, у якім ён выліў сваё спачуванне мне і стараўся суцешыць у маім горы, дасягнуў таго, што я супакоіўся і прыйшоў да сябе. Верш гэты... быццам жыватворны бальзам вылечыў пачынаўшую балець смутную душу".

Цесная сувязь паміж паэтам і вучоным захавалася і ў далейшым. У "Летапісе жыцця і творчасці" Янкі Купалы запісана: «1917. Лета. Гасцяваў у фальварку Б. І. Эпімах-Шыпілы, прыязджаючы з Полацка».

Сяброўства захавалася і калі Эпімах-Шыпіла ў 1924 годзе па запрашэнні прадстаўніка ўрада Язэпа Дылы пераехаў у Мінск. Тут ён быў абраны правадзейным членам Інбелкульта, дзе заняў пасаду рэдактара камісіі па складанні слоўніка жывой рускай мовы, а пазней стаў старшынёй гэтай камісіі. Пад рэдакцыяй Б. Эпімах-Шыпілы і М. Байкова выйшлі "Віцебскі краёвы слоўнік" М. Каспяровіча і "Краёвы слоўнік Чэрвеншчыны" М. Шатэрніка. У Мінску вучоны шмат працаваў.

Ён пісаў артыкулы, збіраў матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, фальклоры; выступіў з рэцэнзіяй на этнаграфічны зборнік А. Сержпутоўскага "Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета".

Акрамя таго, Б. Эпімах-Шыпіла працягваў працу над унікальнай рукапіснай "Беларускай хрэстаматыяй". Творы, перапісаныя Эпімах-Шыпілам, займаюць 50 лістоў агульнага сшытка. Кожная старонка па-мастацку афармлена самім Браніславам Ігнатавічам. Тэксты запісаны ў асноўным беларускай лацінкай каліграфічнымпочыркам. На двух аркушах наклеены выкананыя друкарскім спосабам вершылістоўкі Цёткі "Мора" і "Хрэст на свабоду". Пасля кожнага твора змешчаны кароткія звесткі пра яго першакрыніцу і аўтара. "Хрэстаматыя" данесла да нас каштоўную паэтычную спадчыну Ф. Тапчэўскага, вершы якога ў свой час не маглі трапіць у друк і распаўсюджваліся ў рукапісах. Дзякуючы Браніславу Ігнатавічу да нас дайшлі такія ананімныя помнікі беларускай літаратуры, як "Расказ Даўгога Герасіма", "Вясна", "Вячэрняя песня", усім вядомая паэма "Тарас на Парнасе", а таксама творы Цёткі, А. Паўловіча, Я. Лучыны, У. Сыракомлі, А. Плуга і інш.

Але плённая дзейнасць Эпімах-Шыпілы, на жаль, была перапынена. Пачаліся рэпрэсіі, і вучоны быў вымушаны пасля двух месяцаў турмы тэрмінова пакінуць Мінск.

У Ленінград яго ў кастрычніку 1930 года праводзілі Янка Купала (заступніцтва якога не дапамагло) з Уладзіславай Францаўнай. Там вучоны ў нястачы і адзіноце праз тры з паловай гады памёр.

У Вегрынскай СШ створаны музей Браніслава Ігнатавіча Эпімах-Шыпілы, які адкрыўся 12 мая 1998 года. Сёння тут налічваецца 500 экспанатаў асноўнага фонду і больш як 1300 — запаснога. Наладжана сувязь са сваякамі Б. Эпімах-Шыпілы. Актыўную пошукавую работу праводзіць гурток "Юны этнограф". Марыя Лявонцьеўна Кірпічонак і Вольга Кірылаўна Глебка — старажылы вёскі Будзькаўшчына, дзе нарадзіўся Браніслаў Ігнатавіч, далі школьнікам вельмі цікавыя звесткі пра яго бацьку і апісалі выгляд маёнтка, дзе жыла сям'я будучага вучонага, фалькларыста, мовазнаўцы. Удалося ўстанавіць, што Эпімах-Шыпілы, якія былі каталікамі па веравызнанні, адносіліся да парафіі касцёла Заскаркі.

У вёсках Бабынічы і Залессе Б. Эпімах-Шыпілу ўстаноўлены памятныя знакі. У Залессе, дзе прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады вядомага дзеяча беларускай культуры, таксама знайшоўся багаты матэрыял для музея. Напрыклад, распавядае кіраўнік гуртка Аліна Краснова, тут удалося атрымаць звесткі аб тым, як выглядаў фальварак Двор-Залессе Полацкае, чым займаліся бацькі Браніслава Ігнатавіча, якую гаспадарку вялі, як адносіліся да сялян. Добрыя былі паны, сведчылі відавочцы. Як ехалі ў касцёл, пан з усімі вітаўся, а дзеці чакалі, калі ён выйдзе, і кожнаму ў руку цукерак дасць. Захаваліся ўспаміны пра маці Б. Эпімах-Шыпілы і яго сястру Валерыю Ігнатаўну Гагалінскую. Многія рэчы, якія ў свой час належалі сям'і, залесцы перадалі ў музей.

Музей актыўна наведваецца. Раман Іванавіч Арол, цяперашні кіраўнік музея, расказаў, што яго плануецца ўключыць ў экскурсійны маршрут "Да Астроўскага". Матэрыялы адзінаццаці яго экспазіцый выклікаюць цікавасць у дзяцей і дарослых. Інакш, напэўна, і быць не павінна. Бо расказвае музей пра чалавека, жыццё якога можа служыць прыкладам адданасці роднай зямлі.

Валянціна СОПІКАВА

Яго ведалі ўсе настаўнікі

Шмат маляўнічых мясцін на Капыльшчыне, але такіх, як у наваколіцах Пясочнага, болей няма. І прыгажосць ім у першую чаргу надае Нёман. Ды Пясочнае знакаміта не толькі сваімі адметнымі краявідамі, але і вядомымі людзьмі. Тут жылі — Адам Русак, Сцяпан Умрэйка, Анатоль Астрэйка... Але спынімся на слыннай асобе Сцяпана Умрэйкі. Ён — заслужаны настаўнік БССР, кандыдат педагагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР, вядомы савецкі вучоны-педагог і арганізатар народнай адукацыі ў Беларусі. Сцяпан Андрэевіч нарадзіўся ў Пясочным 19 снежня 1908 года. Бацька Андрэй Карпавіч працаваў эканомам у пана Наркевіча-Ёдкі і за добрую працу быў узнагароджаны невялічкім кавалкам зямлі. Дабрыня і мудрасць сялян дапамаглі выхаваць у сыне самыя лепшыя чалавечыя якасці. Сцяпан вельмі хацеў стаць адукаваным чалавекам і праз усё жыццё ішоў насустрач сваёй мары. Вучыўся ён лёгка, хутка засвойваў матэрыял. Вучыў пісьменнасці нават сваіх аднагодкаў. Вялікія здольнасці і нястомная праца да ведаў вызначылі яго жыццёвы шлях. Пасля заканчэння школы Сцяпан паступае на настаўніцкія курсы, а потым працуе настаўнікам у вёсцы Пясочнае.

Песачанская школа — гэта частка яго душы. Вялікае шчасце — сустрэць на сваім шляху такога настаўніка, які робіць усё дзеля таго, каб выхаваць добрых людзей, патрыётаў, справядлівых і шчырых. Шмат сіл, ведаў і часу Сцяпан Андрэевіч аддаваў школе, выхаванню і навучанню дзяцей. Яго вельмі паважалі вучні і ішлі да яго па параду, як да бацькі. Дзякуючы намаганням С. Умрэйкі і яго аднадумцам вёска Пясочнае стала адным з першых культурных цэнтраў на мяжы Капыльскага і Уздзенскага раёнаў. Тут пабудавалі новае памяшканне школы-сямігодкі, адчынілі клуб, хату-чытальню. Песачанская школа доўгія гады была ў ліку лепшых школ раёна.

Год заканчэння Мінскага педагагічнага інстытута быў азмрочаны страшэнным словам — вайна. Сцяпан Андрэевіч пайшоў на фронт. Атрымаўшы раненне пад Ленінградам, у цяжкім стане быў перапраўлены ў Маскву. Пасля папраўкі зноў вяртаецца ў строй. З вызваленчым войскам увайшоў ён у сваю родную вёску Пясочнае. Сцяпана Умрэйку адзываюць з арміі для работы па аднаўленні народнай гаспадаркі і ўстаноў адукацыі Беларусі, бо дзяржаве вельмі былі патрэбныя кваліфікаваныя кадры. Ён быў назначаны першым намеснікам Наркама адукацыі нашай краіны і разгарнуў актыўную дзейнасць па будаўніцтве і арганізацыі школ, забеспячэнні іх вучэбнымі дапаможнікамі і метадычнымі распрацоўкамі, па выхаванні і навучанні маладых педагогаў.

Сцяпан Андрэевіч узначальваў навукова-даследчы інстытут педагогікі Міністэрства адукацыі БССР, быў прызначаны намеснікам міністра адукацыі рэспублікі. На гэтай пасадзе ён працаваў амаль семнаццаць год, аддаючы свае веды, педагагічны і арганізатарскі вопыт справе аднаўлення сістэмы адукацыі ў пасляваенныя гады. Гэты перыяд быў для С. Умрэйкі знамянальны і ў творчых адносінах. Ён сабраў і абагульніў вялікі фактычны матэрыял па праблемах школьнай адукацыі Беларусі. Дзякуючы яго ўнёску ў сістэму адукацыі, Песачанскай сярэдняй школе было прысвоена імя С. А. Умрэйкі.

"Яго ведалі і цанілі ўсе настаўнікі Беларусі. У кожнай школе, інстытуце, педвучэльні, узноўленымі пасля вайны, была часціна яго нерваў, яго дзейнасці". (З успамінаў былога настаўніка Песачанскай школы, а затым — дырэктара Гродзенскага педінстытута Мікалая Уласаўца.)

Песачанская школа адметна тым, што тут створаны музей літаратурнага і гістарычнага краязнаўства, які ўзначальвае бібліятэкар Надзея Мікула. А экскурсаводамі выступаюць свае ж вучні.

Сярод шматлікіх экспанатаў — фотаздымкі па гісторыі Пясочнага, план мястэчка паводле інвентара 1744 года, стэнды з матэрыяламі пра знакамітых землякоў і па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Да слова, сярод іншых рэчаў, у музеі захоўваецца копія дыплома Сцяпана Умрэйкі аб заканчэнні педагагічнага інстытута. Ёсць і этнаграфічны куточак...

Больш як трыццаць гадоў мінула з таго часу, як не стала Сцяпана Андрэевіча, але Песачанская школа не забывае свайго былога выхаванца, настаўніка, знакамітага вучонага Беларусі. У школьным музеі ёсць прысвечаны яму стэнд. Вывучэннем спадчыны славутага педагога займаюцца бібліятэкар і загадчык школьнага музея Н. Мікула, кіраўнік гуртка Л. Карповіч, бібліятэкар СДК Н. Баравікова, настаўнікі і вучні. З глыбокім шанаваннем і павагай успамінаюць Сцяпана Умрэйку жыхары вёскі Пясочнае. Удзячная памяць пра яго заўсёды будзе жыць і перадавацца з пакалення ў пакаленне. А калі жыве памяць, то жыве і родная зямля.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымку: да правядзення экскурсіі ў школьным музеі рыхтуюцца старшакласнікі.

Фота аўтара

Цікава ведаць

Самы першы і вялікі перапалох, усвядомлены мной, перажыла я ў навальніцу на трэцім годзе жыцця. Мы з цёткаю Кацяю былі ўдваіх дома, калі пачуліся грымоты. У нашым агародзе на высокім беразе Дняпра пасля вайны засталося шмат жалезнага ламачча, таму маланкі часам цалялі менавіта туды. Цётка захвалявалася і пайшла са мной да суседзяў пераседзець трывожную часіну. Яе неспакой перадаўся мне.

Перуноў дзень

Навальніца заўсёды была і застаецца для чалавека страшнай і небяспечнай з'явай прыроды. Таму не дзіўна, што нашы далёкія продкі стварылі грознае бажаство Перуна, якому маліліся аб выратаванні. Свята яго прыпадае на 2 жніўня. Лічыцца, што з гэтага дня пачынаецца восень. Пасля ўвядзення хрысціянства Перуна паступова замянілі персанажы хрысціянскай міфалогіі, пераважна Ілья.

Згодна са старажытным міфам, Пярун змагаецца са Змеем — увасабленнем зла, цемры і холаду. Лічылася, што гэты магутны бог апекаваўся княжацкай дружынай, дапамагаў ёй здабываць перамогу. Яшчэ ў X—XII стагоддзях ягоны вобраз у славян-язычнікаў атаясамляўся з вогненнай сякерай, якая ляціць па небе. Да зброі Перуна належалі таксама камяні. Валун каля вёскі Расходна Сенненскага раёна і цяпер называюць Пярун-каменем. Адно з гарадзішчаў паблізу Нясвіжа мае назву "Перунова гара", у ваколіцах вёскі Верхаўляны Бераставіцкага раёна ёсць Перунова поле, дзе па паданнях абавязкова чалавека заб'е маланка, калі ён там апынецца ў час навальніцы.

20 лютага нашы продкі святкавалі яшчэ адно свята у гонар Перуна — Грамніцы. Інакш гэтае свята называлася яшчэ Стрэчаннем, калі зіма сустракаецца з вясною. Згодна з народным календаром, у гэты дзень таксама можна было чакаць грымотаў, навальніцы. Прыказкі сведчаць: "На Грамніцы прайшла палавіна зіміцы"; "На Грамніцы певень нап'ецца вадзіцы". У гэты дзень назіралі за надвор'ем.

Казалі, якое надвор'е на Грамніцы, такая будзе вясна. Як бачым, Перун сімвалічна распачынаў цёплую пару года і завяршаў яе.

Даволі рана адлюстраванні Перуна з'явіліся ў старажытным мастацтве, пазней — у рэлігійнай, а потым — у вайсковадзяржаўнай сімволіцы. У старажытных хетаў былі выявы бога вершніка Пірвы, які апекаваўся царскаю дружынаю. На славянскім сасудзе VII—IX стагоддзяў, знодзеным на тэрыторыі Польшчы, быў малюнак конніка з трыма маланкамі над ім. Герб Вялікага княства Літоўскага "Пагоня" таксама мае выгляд конніка з узнятым над галавой мячом. Летапісцы XVI—XVII стагоддзяў пакінулі некалькі версій паходжання герба "Пагоня". У "Хроніцы літоўскай і жамойцкай" паведамляецца, што князь Нарымонт меў герб з выяваю ўзброенага вершніка на белым кані ў чырвоным полі. Густынскі летапіс звязвае ўзнікненне "Пагоні" з вялікім князем Віценем: "В лето 6786 (1278)... Витен нача княжити над Литвою, из-мысли себе герб и всему княству Литовскому печать: рыцер збройны на коне з мечем, еже ныне наречут Погоня".

Іншыя летапісы паведамляюць, што герб "Пагоня" быў прыняты па ініцыятыве Рыманта-Васіля, сына, па адных звестках Трайдзеня, па іншых — Прайдзена (апошні названы бацькам Віценя). Усе летапісы з некаторымі адхіленнямі храналогіі датуюць узнікненне "Пагоні" 1270—1290-я гады. З гэтага часу герб замацаваўся ў якасці рэпрэзентатыўнага сімвала за асобамі, якія ажыццяўлялі вярхоўную ўладу ў ВКЛ. Выява конніка на пячатках таксама была даволі пашырана на землях Усходняй Еўропы.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года юрыдычна зацвердзіў выкарыстанне герба "Пагоня" за этнаграфічнымі беларускімі землямі. Меў ён наступны выгляд: у чырвоным полі скакаў узброены рыцар на белым кані. Правай рукой ён трымаў аголены меч, узняты над галавой, на левым плячы — шчыт з залатым падвойным крыжам. Конь пакрыты трохканцоваю гунькаю. Афарбоўка збруі і шчыта рыцара на старажытных малюнках блакітная. Класічны варыянт герба "Пагоня" размяшчалі на сцягах і харугвах. Яго выява была выбіта на павятовых, ваяводскіх і канцылярскіх пячатках ВКЛ, знаходзілася разам з іншымі гербамі ў зале пасяджэнняў сойма Рэчы Паспалітай.

Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ўрад Кацярыны II надаў герб "Пагоня" шэрагу беларускіх гарадоў, Беларускаму гусарскаму палку (1775), Полацкаму мушкецёрскаму палку, Гродзенскаму лейб-гвардыі гусарскаму палку ды іншым. У час паўстанняў 1794, 1830—1831, 1863—1864 гадоў герб выкарыстоўвалі інсургенты. Знайшла "Пагоня" адлюстраванне і ў гербах губернскіх гарадоў Гародні, Вільні, Віцебска. У 1845 годзе пачалося наданне паветам гербаў, якія, з аднаго боку, падкрэслівалі прыналежнасць да адпаведнай губерні (у верхняй частцы поля размяшчаўся губернскі герб), а з другога — адлюстроўвалі пэўныя асаблівасці паветаў з дапамогаю выявы ў ніжняй частцы поля.

Зінаіда ДУДЗЮК

Радавод князёў Мсціслаўскіх

Мсціслаў багаты на археалагічныя і архітэктурныя помнікі. У яго ваколіцах захаваліся рэшткі двух манастыроў, заснаванне якіх звязваюць з імем Сямёна-Лугвена — Ануфрыеўскі і Пустынскі, апошні ўжо дзейнічае і некалькі гадоў актыўна адбудоўваецца і аднаўляецца.

Шмат хто ведае сёння пра выяву Ісуса Хрыста, што колькі год таму дзіўным чынам тут праявілася за ноч на сцяне пакоя. З гэтага пачалося новае жыццё Пустынскага манастыра. І сёння паломнікам з Беларусі, Расіі і Украіны абавязкова паказваюць праяўлены лік Збавіцеля. А яшчэ на тэрыторыі манастыра бруіць святая крынічка, побач — дзеючая царква Ражаства Багародзіцы. Пра заснаванне манастыра існуюць асобныя паданні. Але спачатку крыху з мінуўшчыны.

У гістарычным лёсе Мсціслаўля пераплятаюцца прадстаўнікі дзвюх славутых дынастый, Рурыкавічаў і Гедэмінавічаў. Да першай належаў заснавальнік Мсціслаўля, смаленскі князь Расціслаў Мсціслававіч. Ён заснаваў горад у 1133 годзе і назваў яго ў гонар свайго бацькі, кіеўскага князя Мсціслава Вялікага. Расціслаў Мсціслававіч прылічаны Праваслаўнай царквой да ліку святых, і з'яўляецца нябесным апекуном горада. Дзе б ён ні княжыў: у Мсціслаўлі, Смаленску, Кіеве або Ноўгарадзе — усюды будаваў цэрквы. Пад канец жыцця, стаміўшыся ад дзяржаўных спраў, намерваўся прыняць пострыг і заказаў сабе келлю ў Кіева-



Пячорскім манастыры. І вось 14 сакавіка 1167 года накіраваўся туды ў суправаджэнні сваёй сястры, але па дарозе захварэў і памёр. Згодна з завяшчаннем, Расціслава пахавалі на Кіеўскай зямлі, цяпер яго парэшткі пакояцца ў Феадароўскім манастыры. Гістарычныя крыніцы паведамляюць, што Расціслаў быў не толькі добрым дзяржаўным дзеячам, але і дбайным бацькам, выгадаваў пяць сыноў і адну дачку. Пры жыцці паспеў пра ўсіх паклапаціцца і надзяліць землямі. Пасля смерці Расціслава горад перайшоў да старэйшага сына Рамана. Раман умацоўвае горад і яшчэ болей разбудоўвае. Пасля смерці Рамана горад дастаецца ў спадчыну яго сыну Мсціславу. Мсціслаў уключае горад у склад Смаленскага княства, у якім ён знаходзіўся да XIV стагоддзя — час утварэння Вялікага княства Літоўскага.

Гісторыя Мсціслаўля шчыльна звязана з вялікім літоўскім князем Альгердам. Менавіта Альгерд у 1352 годзе дорыць Мсціслаў свайму сыну. Атрымаўшы ў падарунак горад, нашчадак прымае праваслаўе і бярэ праваслаўнае імя, увайшоўшы ў гісторыю пад імем Сямён Лугвен. Каб паказаць падданым і суседнім князям, што ён чалавек веруючы, будуе вакол Мсціслаўля цэрквы і манастыры. Пустынскі манастыр закладваецца ў 11-і кіламетрах ад Мсціслаўля, а Ануфрыеўскі — з супрацьлеглага боку па дарозе на Крычаў (1407 г.). Сямён Лугвен і лічыцца родапачынальнікам князёў Мсціслаўскіх.

Першыя звесткі пра манастыр адносяцца да пачатку XVI стагоддзя. Сямён Лугвен ажаніўся з дачкою Маскоўскага князя Дзмітрыя Данскога. Яны пражылі толькі пяць гадоў. Марыя цяжка захварэла і памерла. Але ад шлюбу застаўся сын Юрый. І калі ў 1410 годзе адбылася Грундвальская бітва, то на полі бітвы былі і Мсціслаўскія князі, сам Сямён Лугвен і яго сын Юрый. Тры палкі пад іх кіраўніцтвам — Мсціслаўскі, Аршанскі і Смаленскі — прынялі на сябе асноўны ўдар. Рыцары тэўтонскага ордэна былі цалкам разбіты.

Юрый таксама надае шмат увагі развіццю горада. Вядома, што ён быў запрошаны княжыць у Ноўгарад і пакінуў Мсціслаў, але праз нейкі час вяртаецца на радзіму і княжыць тут да смерці. Пасля — Мсціслаў пераходзіць да яго сына Івана. Пры Іване якраз і пачынаецца забудова Пустынскага манастыра. У Івана нараджаюцца толькі дзве дачкі. І ён змушаны звяртацца да літоўскіх князёў з просьбай захаваць уладу да тых часоў, пакуль дочкі не выйдуць замуж. Яго дачка Анастасія знаёміцца са Слуцкім князем Сямёнам Алелькавічам. Паданне расказвае, што Алелькавіч прыязджаў у мсціслаўскія лясы на паляванне і сустрэўся ў горадзе з Анастасіяй. Прыехаў у Слуцк і заявіў бацьку, што хоча жаніцца. "З кім?" — спытаўся бацька — "З дачкой Мсціслаўскага князя Анастасіяй", — адказаў сын. Бацька паспрабаваў адгаварыць сына, маўляў, знодзем табе і лепшую, і багацейшую. Але сын настаяў на сваім: прыехаў у Мсціслаў і звёз маладую ў Слуцк. І вось Анастасія становіцца пасля смерці Сямёна Алелькавіча славутай Анастасіяй Слуцкай, праваслаўнай святой, якая пасля смерці мужа працягнула яго справу і разам з маленькім сынам абараняла горад Слуцк.

Антон КУДЛАТЫ

Фота Віктара Кавалёва

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:

Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар, намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнеце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3136
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 16.09.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 5008

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 09035